# Бібліятэчная прастора.

## Віцебскі рэгіён



Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь

ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»
Аддзел бібліятэказнаўства

# БІБЛІЯТЭЧНАЯ ПРАСТОРА. ВІЦЕБСКІ РЭГІЁН

*Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь*

Віцебск
2023

УДК 027
ББК 78.34(4Беи-4Вит)
Б 67

Складальнікі: *Н. А. Мелькіна, Н. А Пугачова*
Рэдактар *Н. А. Пугачова*
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

**Бібліятэчная прастора. Віцебскі рэгіён** : інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. Н. А. Мелькіна, Н. А. Пугачова]. – Віцебск, 2020. – 99 с.

У штогадовым выданні прадстаўлены агляды дзейнасці Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна і публічных бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры ў Віцебскай вобласці за 2022 год.

Выданне прызначана для бібліятэчных работнікаў, спецыялістаў у галіне інфармацыйных тэхналогій, кіраўнікоў органаў кіравання культурай, а таксама для тых, хто цікавіцца развіццём бібліятэчнай справы ў вобласці.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2023

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ ПРАСТОРА. ВІЦЕБСКІ РЭГІЁН**

*Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь*

Складальнікі:
**Мелькіна** Надзея Аляксандраўна,
**Пугачова** Наталля Аляксандраўна
Адказны за выпуск Т. М. Адамян
Камп’ютарная вёрстка і мастацкае афармленне А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»
210601 г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а
E-mail: vlib@vlib.by

| | | |
|---|---|---|
| **август** | | |
| *Колесникова Светлана Геннадьевна*, руководитель народного клуба «Сучаснік» Верхнедвинской ЦРБ ГУК «Верхнедвинская ЦБС» | 60 лет со дня рождения | 21 августа 1963 |
| *Иванова Наталья Владимировна*, руководитель народного клуба цветоводов и садоводов-любителей «Флора» ГУК «Лиозненская ЦБС» | 60 лет | 28 августа 1963 |
| *Малак Ирина Станиславовна*, заведующий отделом библиотечного маркетинга Ушачской районной библиотеки имени Е.Лось ГУК «Ушачская ЦБС» | 50 лет | 13 августа 1972 |
| **сентябрь** | | |
| Прудникская сельская библиотека ГУК «Городокский культурно-просветительский центр и сеть публичных библиотек» | 100 лет со дня основания | 1923 |
| Библиотека-филиал №5 имени Л.Толстого ГУ «ЦБС г. Витебска» | 70 лет со дня основания | 24 сентября 1953 |
| *Голубева Наталья Алексеевна*, заместитель директора ГУК «ЦБС г. Новополоцка» | 50 лет | 12 сентября 1973 |
| **октябрь** | | |
| Женский клуб «Сяброўка», при Лынтупской горпоселковой библиотеке ГУК «Поставская ЦБС» | 15 лет со дня основания | октябрь 2008 |
| **декабрь** | | |
| *Киселёва Людмила Александровна*, заведующий отделом обслуживания и информации центральной библиотеки имени В.Маяковского ГУК «ЦБС г. Новополоцка» | 60 лет | 4 декабря 1963 |
| *Мороз Татьяна Ивановна*, заведующий отделом библиотечного маркетинга центральной районной библиотеки ГУК «Бешенковичская ЦБС» | 55 лет | 10 декабря 1968 |



# ЗМЕСТ


ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА Ў 2022 ГОДЗЕ 4
*Камендантава В.М. – намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна*

АГЛЯД ДЗЕЙНАСЦІ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ ЗА 2022 ГОД 14

САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ. ФОТАФАКТ 49

ДАДАТКІ 57
Табліца № 1. Сетка публічных бібліятэк Віцебскай вобласці 57
Табліца № 2. Рэарганізацыйныя працэсы публічных бібліятэк Віцебскай вобласці ў 2022 годзе 59
Табліца № 3. Інтэграваныя бібліятэкі (аб'яднаныя публічныя і школьныя) у 2022 годзе 63
Табліца № 4. Спіс бібліятэк змяшанага тыпу ў Віцебскай вобласці 64
Табліца № 5. Карыстальнікі 67
Табліца № 6. Наведванні 68
Табліца № 7. Дакументавыдача 71
Табліца № 8. Стан бібліятэчных фондаў 73
Табліца № 9. Сельскія бібліятэкі 75
Табліца № 10. Аб'ём бюджэтнага фінансавання ў 2022 годзе 77
Табліца № 11. Камп'ютарызацыя і аўтаматызацыя 79
Табліца № 12. Платныя паслугі 82
Табліца № 13. Бібліятэчныя кадры 84
Табліца № 14. Бібліятэкі ў СМІ 86
Табліца № 15. Арганізацыя работы бібліёбусаў 87
Табліца № 16. Абслугоўванне карыстальнікаў з парушэннямі зроку 89
Табліца № 17. Клубы па інтарэсах і аматарскія аб'яднанні 91
Табліца № 18. Матэрыяльна-тэхнічная база 93
Табліца № 19. Знамянальныя даты публічных бібліятэк Віцебскай вобласці ў 2023 годзе 94

# ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У.І.ЛЕНІНА Ў 2022 ГОДЗЕ

***Камендантава В.М.***, *намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І.Леніна*

У Год гістарычнай памяці асноўнымі задачамі Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І.Леніна сталі развіццё бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства, цікавасці да вывучэння гісторыі і культуры Віцебшчыны, максімальна поўнае забеспячэнне запытаў карыстальнікаў, далучэнне іх да найлепшых узораў беларускай кніжнай спадчыны, творчасці дзеячаў беларускай і замежнай літаратуры, культуры, мастацтва – юбіляраў 2022 года.

Аддзелы абслугоўвання бібліятэкі былі адкрытыя для карыстальнікаў 296 дзён, імі быў абслужаны 32 871 непасрэдны карыстальнік пры плане 33 400 (98,4% да плана), з якіх больш за 100 чалавек з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. З агульнай колькасці непасрэдных чытачоў дзеці ва ўзросце да 15 гадоў склалі 6 469. Праз сістэму МБА абслугоўвалася 235 абанентаў (154 індывідуальных і 81 калектыўны).

Карыстальнікам за справаздачны год было выдана 667 512 экз. бібліятэчных дакументаў (95,4% да запланаванага). З агульнай колькасці выданых дакументаў 158 579 экз. складае мастацкая літаратура (23,8%), 68 539 экз. – выданні на беларускай мове (10,3%).

Агульная колькасць наведванняў склала 2 321 901 (123,8% да плана). У справаздачным годзе колькасць віртуальных наведванняў на афіцыйны сайт бібліятэкі склала 2 175 029 наведванняў, непасрэдных – 146 872, з іх наведванняў масавых мерапрыемстваў – 8 127 (133 % адносна 2021 года).

На пачатку года адбыліся змены ў складзе структурных падраздзяленняў па абслугоўванні карыстальнікаў: у склад агульнай чытальнай залы ўвайшоў аддзел эканамічнай, тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры, былі створаны юнацкі аддзел і аддзел рэдкай кнігі. Асноўным напрамкам дзейнасці апошняга з іх стала фарміраванне асноўнага і навукова-дапаможнага фондаў. На канец справаздачнага перыяду асноўны фонд падраздзялення склаў 2 480 адзінак захоўвання.

У 2022 годзе ў бібліятэцы працаваў 91 бібліятэчны работнік. З 52 супрацоўнікаў аддзелаў абслугоўвання 40 бібліятэчных кіраўнікоў і спецыялістаў было занята непасрэдна абслугоўваннем чытачоў.

На камплектаванне бібліятэчнага фонду зрасходавана 241,3 тыс. руб. бюджэтных сродкаў. У тым ліку: на набыццё бібліятэчных дакументаў (кніг, брашур, нот, выяўленчых і аўдыявізуальных дакументаў) – 111,6 тыс. руб., на перыядычныя выданні – 116,2 тыс. руб., на набыццё электронных інфармацыйных рэсурсаў і праў доступу да іх – 13,5 тыс. руб. Усяго ў фонд



| | | |
|---|---|---|
| **январь** | | |
| Полесская сельская библиотека ГУК «Поставская ЦБС» | 75 лет со дня основания | январь 1948 |
| *Яблонская Алина Эдмундовна*, заведующая отделом обслуживания и информации центральной районной библиотеки ГУК «Шарковщинская ЦБС» | 65 лет | 4 января 1958 |
| **февраль** | | |
| Вереньковская сельская библиотека ГУК «Поставская ЦБС» | 65 лет со дня основания | февраль 1958 |
| *Грибалёва Надежда Анатольевна*, заведующий отделом комплектования, обработки и организации единого книжного фонда ГУК «Полоцкая РЦБС» | 60 лет | 21 февраля 1963 |
| Библиотека-филиал № 15 имени Я. Мавра ГУ «ЦБС г. Витебска» | 40 лет со дня основания | 20 февраля 1983 |
| **март** | | |
| Поставская городская библиотека ГУК «Поставская ЦБС» | 30 лет со дня основания | март 1993 |
| **май** | | |
| Пальминская сельская библиотека ГУК «Городокский культурно-просветительский центр и сеть публичных библиотек» | 65 лет со дня основания | 1958 |
| *Вавилова Галина Михайловна*, заместитель директора по административно-хозяйственной работе ГУК «Оршанская ЦБС» | 55 лет | 3 мая 1968 |
| **июнь** | | |
| *Якушенкова Ирина Петровна*, заместитель директора ГУК «Лиозненская ЦБС» | 60 лет | 4 июня 1963 |
| *Красикова Маргарита Альбертовна*, заведующий отделом комплектования, обработки и организации единого книжного фонда ГУК «Лиозненская ЦБС» | 60 лет | 5 июня 1963 |
| **июль** | | |
| *Масейко Ирина Николаевна*, заведующий отделом обслуживания и информации центральной районной библиотеки ГУК «Дубровенская ЦБС» | 55 лет | 11 июля 1968 |

| | | |
|---|---|---|
| Зеленковская библиотека-филиал № 33 ГУК «Толочинская ЦБС» | 60 лет | 1963 |
| Бабиничская сельская библиотека ГУК «Витебская РЦБС» | 55 лет | 1968 |
| Замосточская сельская библиотека ГУК «Витебская РЦБС» | 55 лет | 1968 |
| Пестуничская сельская библиотека-клуб ГУК «Витебская РЦБС» | 55 лет | 1968 |
| Шапуровская сельская библиотека ГУК «Витебская РЦБС» | 55 лет | 1968 |
| Филиал «Редьковская сельская библиотека-клуб» ГУК «Дубровенская ЦБС» | 55 лет | 1968 |
| Черейщинская сельская библиотека-музей деревни-филиал № 3 ГУК «Лепельская ЦБС» | 55 лет | 1968 |
| Дворносельская сельская библиотека-клуб ГУК «Лепельская ЦБС» | 55 лет | 1968 |
| Серковицкая сельская библиотека-филиал № 34 ГУК «Толочинская ЦБС» | 55 лет | 1968 |
| Волосовичская сельская библиотека-клуб -филиал № 9 ГУК «Лепельская ЦБС» | 50 лет | 1973 |
| Полсвижская сельская библиотека-филиал № 27 ГУК «Лепельская ЦБС» | 50 лет | 1973 |
| Библиотека-филиал № 2 имени К.Симонова ГУК «ЦБС г. Новополоцка» | 50 лет | 1973 |
| Детская библиотека-филиал №4 имени А.Пушкина ГУК «ЦБС г. Новополоцка» | 45 лет | 1978 |
| Народное любительское объединение «Сучаснік», действует при Верхнедвинской ЦРБ ГУК «Верхнедвинская ЦБС» | 30 лет | 1993 |
| Кащинская сельская библиотека-филиал № 23 ГУК «Чашникская РЦБС» | 70 лет | июнь 1953 |
| Новолукомльская городская библиотека-филиал № 3 ГУК «Чашникская РЦБС» | 55 лет | сентябрь 1968 |



бібліятэкі паступіла 9 696 экз. дакументаў. У тым ліку набыта за бюджэтныя сродкі – 9 020 экз. дакументаў, за пазабюджэтныя – 115 экз. Пазабюджэтныя выдаткі на набыццё літаратуры склалі 2,7 тыс. руб. Паказчык ад агульнага бюджэту на камплектаванне – 12,4%. Працэнт абнаўлення фонду за 2022 год склаў 1,4%.

У мэтах ажыццяўлення арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў па алічбоўцы дакументаў і далейшага фарміравання электронных калекцый пры аддзеле захоўвання асноўнага фонду быў створаны сектар алічбоўкі дакументаў. За перыяд з чэрвеня па снежань прайшлі алічбаванне газета «Віцебскі рабочы» з 1946 па 1979 гады выдання і дакументы з калекцыі «Краязнаўчыя выданні XIX – сярэдзіны XX ст». У выніку праведзенай работы было алічбавана 38 дакументаў агульнай колькасцю 39 469 старонак.

Для максімальна поўнага задавальнення інфармацыйных запытаў карыстальнікаў бібліятэкі былі набыты правы доступу да ліцэнзійных электронна-бібліятэчных сістэм «Znanium.com», «Университетская библиотека онлайн», базы даных «Интегрум», электроннай бібліятэкі «ЛитРес», работа з якімі забяспечвалася праз Віртуальную чытальную залу Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Была працягнута генерацыя ўласных інфармацыйных рэсурсаў: за справаздачны год электронны каталог бібліятэкі папоўніўся на 40 815 запісаў, працягвалася вядзенне сямі камбінаваных баз даных пераважна краязнаўчай тэматыкі, было падрыхтавана 19 найменняў бібліятэчных выданняў на папяровых носьбітах.

2022 год даў старт рэалізацыі новага віртуальнага ваенна-патрыятычнага праекта «Витебщина в войне 1812 года». Яго складаючай часткай з’яўляецца квэстбук «Віцебск вачамі Напалеона» – кішэнны даведнік з унікальнай інфармацыяй аб знаходжанні французскага імператара ў Віцебску ў 1812 годзе. Віртуальны праект быў пададзены на рэспубліканскі конкурс на лепшы культурны праект патрыятычнай тэматыкі.

На працягу 2022 года супрацоўнікі бібліятэкі забяспечвалі аператыўнае даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў у зале каталогаў і аддзелах абслугоўвання бібліятэкі. Па запытах непасрэдных карыстальнікаў было выканана 6812 даведак. У мэтах павышэння інфармацыйнай культуры карыстальнікаў у 2022 годзе былі праведзены 62 экскурсіі па бібліятэцы.

Для пошуку нацыянальных заканадаўчых дакументаў, а таксама заканадаўчых актаў Расійскай Федэрацыі ў аддзеле «Публічны цэнтр прававой інфармацыі» шырока выкарыстоўвалася электронная інфармацыйна-пошукавая сістэма (ІПС) «Эталон» версіі 6.9. За 2022 год да яе звярнуўся 1801 карыстальнік бібліятэкі.

У мэтах фарміравання аб’ектыўных адносін грамадства да гістарычнага мінулага, захавання і ўмацавання адзінства беларускага народа Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2022 год быў аб’яўлены Годам гістарычнай памяці. У сувязі з гэтым, найбольш значныя

сацыякультурныя мерапрыемствы мелі гісторыка-патрыятычную і краязнаўчую накіраванасць, а галоўнымі тэмамі года сталі народнае адзінства і генацыд беларускага народа падчас Вялікай Айчыннай вайны.

Сярод астатніх вялікі рэзананс меў круглы стол «Адзінства народа – адзінства краіны», што адбыўся ў бібліятэцы 20 красавіка. Далейшае развіццё тэма атрымала падчас вечарыны «В единстве – сила белорусского народа», што прайшла ў бібліятэцы 8 верасня. На мерапрыемствы былі запрошаны кіраўнікі і спецыялісты галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама, навуковыя супрацоўнікі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, старшыні грамадскіх арганізацый і палітычных партый, члены іх арганізацый, навучэнцы і студэнцкая моладзь, прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі.

Шэраг бібліятэчных мерапрыемстваў быў прысвечаны тэме Вялікай Айчыннай вайны, слаўнай і трагічнай гістарычнай мінуўшчыне краіны і Віцебскага рэгіёна. Сярод іх асаблівай увагі заслугоўвае прэзентацыя кнігі «Генацыд беларускага народа», створанай пад рэдакцыяй генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь Андрэя Шведа, што адбылася 30 мая. У сувязі з тэмай генацыду трэба ўзгадаць яшчэ адну прэзентацыю, што прайшла ў бібліятэцы ў маі: запрошаным на мерапрыемства была прадстаўлена кніга віцебскага аўтара, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Андрэя Герашчанкі «Бельчонок» пра лёсы беларускіх дзяцей падчас Вялікай Айчыннай вайны.

20 кастрычніка мінулага года быў адзначаны адразу дзвюма патрыятычнымі мерапрыемствамі: для моладзевай аўдыторыі ў рамках праекта «Суразмоўца» ў бібліятэцы прайшоў урок мужнасці «Без тэрміну даўнасці», а для аматараў краязнаўства – прэзентацыя кнігі Аркадзя Падліпскага «Вера Хоружая в оккупированном Витебске».

На працягу справаздачнага года мэтанакіравана праводзілася работа па далучэнні карыстальнікаў да вывучэння нацыянальнай мовы і літаратуры. Святкаванне Міжнароднага дня роднай мовы стала ў бібліятэцы добрай традыцыяй. 21 лютага бібліятэкары запрасілі наведвальнікаў на літаратурна-музычную вечарыну, у рамках якой была праведзена агульная дыктоўка.

Цэнтральнымі юбілейнымі датамі літаратурнага календара мінулага года стала 140-годдзе народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа. 3 лістапада, непасрэдна ў дзень нараджэння апошняга з іх, адбылася літаратурна-музычная вечарына «І сёння з намі Колас і Купала». У гэты дзень у бібліятэцы ўзгадалі ўнёсак славутых творцаў у беларускую літаратуру, у развіццё беларускай мовы, культуры, іх творчае і асабістае сяброўства. Сімвалічным можна лічыць і тое, што ў гэты дзень у бібліятэцы прайшоў яшчэ адзін юбілейны вечар «Этой дорогой идти и идти...» – на гэты раз да 60-годдзя нашага сучасніка, паэта Мікалая Намеснікава, лаўрэата «Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі» Віцебскага аблвыканкама.

Відавочна, што асаблівая ўвага ў мінулым годзе надавалася папулярызацыі творчасці віцебскіх аўтараў. 7 чэрвеня ў бібліятэцы



| | | |
|---|---|---|
| Стайская сельская библиотека-филиал № 30 ГУК «Лепельская ЦБС» | 75 лет | 1948 |
| Детская библиотека имени В.С. Короткевича ГУК «Оршанская ЦБС» | 75 лет | 1948 |
| Детская библотека имени Л.Н. Толстого – филиал № 1 ГУК «Полоцкая РЦБС» | 75 лет | 1948 |
| Козловщинская сельская библиотека ГУК «Полоцкая РЦБС» | 75 лет | 1948 |
| Детская библиотека ГУК «ЦБС Браславского района» | 70 лет | 1953 |
| Детская библиотека – филиал № 1 ГУК «Лепельская ЦБС» | 70 лет | 1953 |
| Бобровская сельская библиотека-музей Язепа Мороза – филиал № 5 ГУК «Лепельская ЦБС» | 70 лет | 1953 |
| Парижская сельская библиотека ГУК «Поставская ЦБС» | 70 лет | 1953 |
| Звенячская сельская библиотека-филиал № 30 ГУК «Толочинская ЦБС» | 70 лет | 1953 |
| Бортниковская сельская библиотека, филиал №19 ГУК «Глубокская ЦБС» | 65 лет | 1958 |
| Сильницкая библиотека-музей этнографии ГУК «Полоцкая РЦБС» | 60 лет | 1963 |
| Вымнянская сельская библиотека ГУК «Витебская РЦБС» | 60 лет | 1963 |
| Кировская сельская библиотека ГУК «Витебская РЦБС» | 60 лет | 1963 |
| Скрыдлевская сельская библиотека-клуб ГУК «Витебская РЦБС» | 60 лет | 1963 |
| Сильницкая библиотека-музей этнографии ГУК «Полоцкая РЦБС» | 60 лет | 1963 |
| Андроновская сельская библиотека ГУК «Поставская ЦБС» | 60 лет | 1963 |
| Оболецкая сельская библиотека-филиал № 36 ГУК «Толочинская ЦБС» | 60 лет | 1963 |

*Дадатак № 19*

**ЗНАМЯНАЛЬНЫЯ ДАТЫ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 2023 ГОДЗЕ**

| Наименование организации/юбиляра | Знаменательная дата | Дата события (юбилея) |
|---|---|---|
| Бабыничская библиотека-клуб ГУК «Полоцкая РЦБС» | 100 лет | 1923 |
| Берёзковская сельская библиотека-клуб ГУК «Докшицкая ЦБС» | 95 лет | 1928 |
| Черейская сельская библиотека-филиал № 23 ГУК «Чашникская РЦБС» | 90 лет | 1933 |
| Филиал «Орловичская сельская библиотека-клуб» ГУК «Дубровенская ЦБС» | 85 лет | 1938 |
| Крипульская сельская библиотека ГУК «Докшицкая ЦБС» | 75 лет | 1948 |
| Башневская сельская библиотека ГУК «Шумилинская ЦБС» | 75 лет | 1948 |
| Ловжанская сельская библиотека ГУК «Шумилинская ЦБС» | 75 лет | 1948 |
| Детская библотека имени Л.Н. Толстого – филиал № 1 ГУК «Полоцкая РЦБС» | 75 лет | 1948 |
| Богинская библиотека ГУК «ЦБС Браславского района» | 75 лет | 1948 |
| Коробовская сельская библиотека-клуб, филиал № 33 ГУК «Глубокская ЦБС» | 75 лет | 1948 |
| Ломашевская сельская библиотека, филиал № 59 ГУК «Глубокская ЦБС» | 75 лет | 1948 |
| Филиал «Зарубская сельская библиотека» ГУК «Дубровенская ЦБС» | 75 лет | 1948 |
| Филиал «Ляднянская сельская библиотека» ГУК «Дубровенская ЦБС» | 75 лет | 1948 |
| Матыринская сельская библиотека-филиал № 24 ГУК «Лепельская ЦБС» | 75 лет | 1948 |



адбылася літаратурна-музычная вечарына-ўспамін «Для шчасця шчодрая душа», прысвечаная 85-годдзю з дня нараджэння паэта, празаіка, ганаровага члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Барыса Беляжэнкі.

Традыцыйна менавіта верасень найбольш багаты на сустрэчы майстроў пяра з прыхільнікамі іх таленту і новыя літаратурныя знаёмствы, што не дзіўна, бо ў гэтым месяцы бібліятэка разам з шырокай грамадскасцю адзначае Дзень ведаў, Дзень беларускага пісьменства і Дзень бібліятэк Беларусі. 6 верасня да 505-годдзя беларускага кнігадрукавання ў бібліятэцы прайшла літаратурна-музычная вечарына «Слову друкаванаму прысвячаецца». 14 верасня, напярэдадні прафесійнага свята бібліятэкараў, у творчай атмасферы адбылася прэзентацыя літаратурнага зборніка «Лучнасць сэрцаў і дум», які выйшаў у серыі «Беларусь літаратурная». Свае вершы прачыталі паэты Алена Крыклівец, Галіна Загурская, Аляксандр Раткевіч. Вершы Мікалая Наменнікава, Вольгі Русілкі, Надзеі Салодкай прагучалі ў выкананні бібліятэкараў.

Па традыцыі літаратурны год у бібліятэцы быў завершаны ўручэннем «Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі» Віцебскага аблвыканкама: у мінулым годзе падзея адбылася 26 снежня. У намінацыі «Проза» лаўрэатам прэміі стаў Канстанцін Нілаў за кнігу «Копысская новелла», а ў намінацыі «Літаратура для дзяцей» – старшыня Віцебскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі», паэтэса Тамара Краснова-Гусачэнка за кнігу вершаў «Край родной, любимый».

На працягу года ў бібліятэцы праводзіліся мерапрыемствы, накіраваныя на папулярызацыю літаратуры па мастацтве, у дапамогу прафесійнай дзейнасці работнікаў сферы культуры, мастацкай адукацыі, знаёмства з рознымі відамі мастацтва і творчасцю віцебскіх аўтараў.

У рамках праекта «Адлюстраванне» былі арганізаваны і прадстаўлены шырокай аўдыторыі 12 мастацкіх выстаў прафесійных мастакоў, дарослых аматараў мастацтва, юных творцаў. На працягу года супрацоўнікі бібліятэкі правялі 68 майстар-класаў па папяровай пластыцы, цестапластыцы, пласцілінаграфіі, вырабе мяккіх цацак, арыгамі і аплікацыі.

З верасня 2020 года пры аддзеле маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці працуе школа малявання для дарослых «MASTAK». У мінулым годзе было праведзена 143 заняткі школы, супрацоўнікамі аддзела падрыхтаваны прэзентацыйны ролік аб яе рабоце.

Трэнд правядзення разнастайных лекцыйных заняткаў на базе агульнадаступных бібліятэк для ўсіх жадаючых па-ранейшаму не здае сваіх пазіцый. У 2022 годзе быў працягнуты цыкл лекцый кампазітара, педагога, члена Беларускага саюза кампазітараў Аляксандра Іванова «Музыка для ўсіх», што распачаўся яшчэ ў лютым 2019 года. На працягу мінулага года ў рамках цыкла было прадстаўлена восем публічных лекцый.

4 студзеня 2021 года дырэктарам бібліятэкі Т.М.Адамян была зацверджана мэтавая комплексная праграма «Живое слово мудрости духовной», разлічаная на рэалізацыю на працягу 2021–2023 гадоў. Асноўныя мерапрыемствы, накіраваныя на духоўную асвету і выхаванне на праваслаўных традыцыях, у мінулым годзе былі праведзены ў рамках

рэалізацыі вышэй названай праграмы. Распачаліся яны 12 студзеня з ўрачыстага адкрыцця духоўна-асветніцкага цэнтра, які прызначаны садзейнічаць папулярызацыі праваслаўнай літаратуры, быць эфектыўнай пляцоўкай для рэалізацыі культурна-адукацыйных і духоўна-асветніцкіх праектаў.

Шырокая грамадскасць краіны адзначыла ў мінулым годзе юбілейную дату – 1030-годдзе Праваслаўя на беларускіх землях. З гэтай нагоды Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпусціла ў абарачэнне новы тэматычны паштовы блок. 22 верасня ў гарадах 15 епархій адначасова прайшлі ўрачыстыя гашэнні гэтага паштовага блока на спецыяльным канверце. У Віцебску цырымонія адбылася ў абласной бібліятэцы. У мерапрыемстве прынялі ўдзел начальнік упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама П.М.Падгурскі, дырэктар Віцебскага філіяла Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белпошта» С.Э.Максак і першы прарэктар Віцебскай духоўнай семінарыі протаіерэй Канстанцін Ізафатаў.

На працягу справаздачнага года аддзел «Публічны цэнтр прававой інфармацыі» не толькі забяспечваў свабодны доступ усіх катэгорый грамадзян да прававой інфармацыі, гарантаваў паўнату і аператыўнасць прадастаўлення актуальнай прававой інфармацыі, але і вёў актыўную сацыякультурную дзейнасць, накіраваную на павышэнне прававой граматнасці насельніцтва. Галоўнай тэмай масавай работы аддзела на пачатку 2022 года стала правядзенне Рэспубліканскага рэферэндуму па пытанні ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь: 5 студзеня ў бібліятэцы прайшла дыялогавая пляцоўка актыву арганізацыйных структур грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый горада Віцебска, 13 студзеня – круглы стол, а 2 лютага – сустрэча-дыялог па вызначанай тэме.

У 2020 годзе супрацоўнікамі ПЦПІ была распрацавана, а ў студзені 2021 года зацверджана мэтавая комплексная праграма прававой асветы дзяцей і моладзі ў Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І.Леніна, разлічаная на 2021–2023 гады. У адпаведнасці з ёй аддзелам быў падрыхтаваны і праведзены шэраг інфармацыйна-асветніцкіх і сацыякультурных мерапрыемстваў, сярод якіх – гадзіна прававых ведаў «Ведаць – каб не спатыкнуцца», прысвечаная Міжнароднаму дню барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам, круглы стол «Медыяцыя – мастацтва вырашаць канфлікты», гадзіна інфармавання «Кібербяспека». На працягу года ажыццяўляўся праект «Дзіцячы прававы клуб "Правознайка"» – аб'яднанне малодшых школьнікаў ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Віцебска». Клуб быў створаны па ініцыятыве супрацоўнікаў аддзела «Публічны цэнтр прававой інфармацыі» і функцыянаваў на базе бібліятэкі. На працягу года адбылося сем яго пасяджэнняў.

Не засталася па-за ўвагай бібліятэкараў і дзейнасць па папулярызацыі здаровага ладу жыцця, а таксама спорту і фізічнай актыўнасці як найважнейшых яго складаючых. У мінулым годзе бібліятэка працягнула супрацоўніцтва з ДУ «Віцебскі абласны цэнтр гігіены,



*Дадатак № 18*
*Табліца 18*

**МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЯ БАЗА**

| ЦБС | Сетка | | Будынкі | | Аг. плошча, м² | | Б-кі, якія маюць персанальныя камп'ютары | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | сельск. | усяго | сельск. | усяго | сельск. | усяго | сельск. |
| Бешанковіцкая | 13 | 10 | 12 | 10 | 2537 | 1303 | 13 | 10 |
| Браслаўская | 13 | 10 | 13 | 10 | 1321 | 720 | 13 | 10 |
| Верхнядзвінская | 17 | 14 | 16 | 14 | 1898 | 1302 | 17 | 14 |
| Віцебская | 22 | 19 | 22 | 19 | 2316 | 1635 | 22 | 19 |
| Глыбоцкая | 24 | 20 | 24 | 21 | 3423 | 1832 | 24 | 20 |
| Гарадоцкая | 14 | 12 | 14 | 12 | 2030 | 1503 | 14 | 12 |
| Докшыцкая | 19 | 16 | 18 | 16 | 2794 | 1752 | 13 | 10 |
| Дубровенская | 17 | 15 | 17 | 15 | 2508 | 1831 | 17 | 15 |
| Лепельская | 16 | 14 | 15 | 14 | 1916 | 1283 | 16 | 14 |
| Лёзненская | 15 | 13 | 15 | 13 | 2278 | 1260 | 15 | 13 |
| Мёрская | 18 | 15 | 18 | 15 | 1865 | 1160 | 14 | 11 |
| Аршанская | 34 | 21 | 34 | 21 | 6274 | 2328 | 34 | 21 |
| Полацкая | 35 | 24 | 35 | 24 | 7028 | 2349 | 35 | 24 |
| Пастаўская | 19 | 14 | 19 | 14 | 1790 | 852 | 19 | 14 |
| Расонская | 9 | 8 | 9 | 8 | 1014 | 853 | 9 | 8 |
| Сенненская | 15 | 12 | 15 | 12 | 1410 | 857 | 15 | 12 |
| Талачынская | 15 | 12 | 15 | 12 | 1907 | 1145 | 15 | 12 |
| Ушацкая | 9 | 8 | 10 | 8 | 1136 | 579 | 9 | 8 |
| Чашніцкая | 16 | 12 | 16 | 12 | 3164 | 1953 | 16 | 12 |
| Шаркаўшчынская | 14 | 12 | 14 | 12 | 1272 | 720 | 14 | 12 |
| Шумілінская | 14 | 10 | 13 | 10 | 1750 | 745 | 14 | 10 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **368** | **291** | **364** | **292** | **51631** | **27962** | **358** | **281** |
| г.Віцебск | 16 | 0 | 15 | 0 | 6964 | 0 | 16 | 0 |
| г.Наваполацк | 7 | 0 | 7 | 0 | 5547 | 0 | 7 | 0 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **23** | **0** | **22** | **0** | **12511** | **0** | **23** | **0** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **391** | **291** | **386** | **292** | **64142** | **27962** | **381** | **281** |
| Абласная б-ка | 1 | 0 | 1 | 0 | 4213 | 0 | 1 | 0 |
| **УСЯГО** | **392** | **291** | **387** | **292** | **68355** | **27962** | **382** | **281** |

*Праця́г табліцы 17*

| ЦБС | З агульнай колькасці па напрамках | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Краязнаўчыя | Літаратурна-мастацкія | Эстэтычныя | Духоўнага накірунку | Экалагічныя | Здаровы лад | Вытворча-тэхнічныя | Дасугавыя | Шматпрофільныя | Інш |
| Бешанковіцкая | 3 | 3 | 0 | 0 | 1 | 2 | 0 | 7 | 2 | 4 |
| Браслаўская | 1 | 3 | 1 | 0 | 0 | 0 | 0 | 3 | 4 | 2 |
| Верхнядзвінская | 1 | 0 | 0 | 0 | 3 | 2 | 0 | 6 | 1 | 3 |
| Віцебская | 1 | 8 | 1 | 0 | 2 | 0 | 0 | 2 | 1 | 12 |
| Глыбоцкая | 1 | 3 | 2 | 2 | 1 | 0 | 0 | 8 | 0 | 3 |
| Гарадоцкая | 0 | 2 | 1 | 1 | 5 | 0 | 0 | 10 | 0 | 6 |
| Докшыцкая | 3 | 5 | 0 | 0 | 4 | 0 | 0 | 13 | 0 | 2 |
| Дубровенская | 1 | 4 | 0 | 0 | 2 | 0 | 0 | 10 | 0 | 0 |
| Лепельская | 0 | 1 | 0 | 0 | 2 | 2 | 0 | 10 | 1 | 1 |
| Лёзненская | 1 | 4 | 1 | 0 | 3 | 0 | 0 | 9 | 0 | 0 |
| Мёрская | 0 | 1 | 1 | 0 | 3 | 0 | 0 | 10 | 0 | 2 |
| Аршанская | 2 | 15 | 3 | 0 | 4 | 1 | 0 | 3 | 0 | 6 |
| Полацкая | 2 | 1 | 2 | 0 | 4 | 1 | 0 | 12 | 1 | 2 |
| Пастаўская | 2 | 1 | 0 | 0 | 3 | 0 | 0 | 0 | 7 | 0 |
| Расонская | 3 | 1 | 0 | 0 | 1 | 0 | 0 | 2 | 0 | 0 |
| Сенненская | 0 | 3 | 1 | 0 | 2 | 0 | 1 | 7 | 4 | 0 |
| Талачынская | 0 | 2 | 0 | 0 | 4 | 2 | 1 | 4 | 0 | 0 |
| Ушацкая | 2 | 1 | 1 | 0 | 2 | 0 | 0 | 7 | 0 | 3 |
| Чашніцкая | 0 | 1 | 0 | 2 | 1 | 0 | 0 | 1 | 6 | 2 |
| Шаркаўшчынская | 0 | 4 | 1 | 0 | 2 | 0 | 0 | 1 | 4 | 1 |
| Шумілінская | 1 | 5 | 0 | 0 | 2 | 0 | 0 | 0 | 2 | 4 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **24** | **68** | **15** | **5** | **51** | **10** | **2** | **125** | **33** | **53** |
| г.Віцебск | 1 | 4 | 1 | 0 | 1 | 1 | 0 | 4 | 1 | 1 |
| г.Наваполацк | 0 | 1 | 1 | 0 | 1 | 0 | 0 | 1 | 0 | 0 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **1** | **5** | **2** | **0** | **2** | **1** | **0** | **5** | **1** | **1** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **25** | **73** | **17** | **5** | **53** | **11** | **2** | **130** | **34** | **54** |
| Абласная б-ка | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| **УСЯГО** | **25** | **73** | **17** | **5** | **53** | **11** | **2** | **130** | **34** | **54** |
| 2021 год | 28 | 62 | 14 | 9 | 53 | 9 | 4 | 138 | 53 | 46 |



эпідэміялогіі і грамадскага здароўя» і запрасіла ўсіх, хто жадае набыць разнапланавыя навыкі і ўменні для павышэння якасці жыцця, узяць удзел у псіхалагічным праекце для жанчын «Я за сябе ў адказе», што стартаваў у лютым 2022 года. З кастрычніка супрацоўніцтва з цэнтрам працягнулася ў фармаце новага псіхалагічнага праекта для асоб сталага ўзросту «Ключы да здароўя і даўгалецця». У справаздачным годзе ў рамках праекта было праведзена 8 сустрэч-трэнінгаў.

Найбуйнейшыя сацыякультурныя мерапрыемствы для дзяцей і падлеткаў былі прымеркаваны да святочных падзей і знакавых дат календара: Міжнароднага дня роднай мовы, Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі, Дня бібліятэк Беларусі. Працягвалася рэалізацыя краязнаўчага праекта «Я в этом городе живу, я этот город знаю», праекта па папулярызацыі беларускай мовы і літаратуры «Паклон беларускаму Слову!», інклюзіўнага праекта для дзяцей з асаблівасцямі псіха-фізічнага развіцця «Адкрыты свет», творчага праекта «Гісторыя кнігі сваімі рукамі», адукацыйнага – «Літаратурныя ўрокі для школьнікаў: новы фармат», забаўляльнага – «Фільмы, якія лепш прачытаць», экалагічнага – «Экарацыянальнасць», адукацыйных праектаў па вывучэнні замежных моў «Гульнявое чытанне» і «Летняя гадзіна ў бібліятэцы», а таксама сацыяльнага праекта «Па розныя бакі, але побач з татам» для дзяцей, бацькі якіх знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі.

Цэнтральным падраздзяленнем па ажыццяўленні інклюзіўнай дзейнасці ў бібліятэцы застаецца аддзел перыядычных выданняў. Яго супрацоўнікамі пры рэалізацыі бібліятэчнага пректа «Разам!» быў праведзены шэраг сацыякультурных мерапрыемстваў, накіраваных на арганізацыю вольнага часу людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. Узгадаем буйнейшыя з іх: 4 мая сумесна з ДУ «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Чыгуначнага раёна г. Віцебска» быў арганізаваны і праведзены святочны канцэрт «Экскурсія ў мінулае», прысвечаны Дню Перамогі, 30 верасня адбыўся святочны канцэрт «З клопатам аб залатым узросце», прымеркаваны да Міжнароднага дня пажылых людзей, а бенефіс інваліда па зроку Ларысы Тумінскай «Каб зноў душа заспявала» прайшоў у кастрычніку.

Асаблівую ролю ў папулярызацыі чытання ў маленькіх чытачоў з парушэннямі зроку маюць мяккія тактыльныя кнігі, выраблены з баваўняных тканін, воўны, тасьмы. Такія кнігі ў спалучэнні з работай настаўнікаў-дэфектолагаў дазволяць дзецям з парушэннямі зроку далучыцца да навуковага пазнання, развіваць мысленне, пашыраць свой мастацкі і сацыяльны досвед, з самага ранняга ўзросту выхоўваюць у дзяцей культуру чытання. У рамках праграмы «Міласэрнасць» у бібліятэцы быў рэалізаваны праект па стварэнні тактыльных кніг для дзяцей з парушэннямі зроку «Дакраніся». Супрацоўнікі бібліятэкі вырабілі полісэнсорную кнігу «Счет от 1 до 10» для яслей-сада № 96 г. Віцебска, дзе ёсць спецыяльная група для дзяцей з парушэннем зроку. 15 верасня кніга была ўрачыста падаравана маленькім чытачам.

Традыцыйна напрыканцы восені адбылося галоўнае навуковае мерапрыемства года – навукова-практычная канферэнцыя «Віцебскі край». Восьмая па ліку, яна была прысвечана Году гістарычнай памяці і прайшла ў Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І.Леніна 24 лістапада. Больш за 60 беларускіх вучоных-гісторыкаў і краязнаўцаў падзяліліся напрацоўкамі і вынікамі новых даследаванняў у розных напрамках гістарычнай навукі ў вочным фармаце. Акрамя бібліятэкі арганізатарамі канферэнцыі выступілі Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Віцебскі абласны краязнаўчы музей. Па выніках канферэнцыі будзе выдадзены аднайменны зборнік матэрыялаў. Прынамсі, прэзентацыя зборніка папярэдняй, сёмай па ліку канферэнцыі «Віцебскі край», традыцыйна прайшла напярэдадні Дня бібліятэк Беларусі – 14 верасня.

Штогадовы сход кіраўнікоў цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм Віцебшчыны прайшоў 30–31 сакавіка ў фармаце міжабласнога семінара і быў прымеркаваны да Года гістарычнай памяці. «Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк як аснова гістарычнага і патрыятычнага выхавання» – менавіта так была вызначана яго тэма. У рабоце семінара прынялі ўдзел намеснік начальніка ўпраўлення – начальнік аддзела работы арганізацый сферы культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Г.Ф.Баркевіч, памочнік намесніка старшыні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта С.М.Фадзеенкаў, дырэктар Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага А.Я.Стрыжэвіч, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, настаўнік гісторыі Віцебскага кадэцкага вучылішча М.В.Півавар.

На семінары абмяркоўваліся пытанні развіцця краязнаўчай дзейнасці бібліятэк на аснове выкарыстання сучасных інфармацыйных тэхналогій. Вопытам стварэння краязнаўчых баз даных, электронных рэсурсаў рэгіянальнай тэматыкі падзяліліся вучоны сакратар Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У.І.Леніна Ю.А.Касцюк, галоўны бібліятэкар аддзела краязнаўства Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі імя У.І. Леніна Н.В.Серыкава і загадчык аддзела краязнаўства Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф.Карскага А.В.Кучынская. Краязнаўчай і пошукава-даследчай дзейнасці былі прысвечаны даклады кіраўнікоў і спецыялістаў з Дубровенскай, Глыбоцкай, Лёзненскай і Віцебскай раённых цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм. Удзельнікам семінара быў прэзентаваны новы мультымедыйны праект Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І.Леніна «Вызваленне Віцебшчыны. 1943–1944».

17 лютага здзейснілася сустрэча кіраўнікоў абласных і гарадскіх арганізацый сферы культуры г. Віцебска, супрацоўнікаў абласной бібліятэкі па пытаннях выканання антыкарупцыйнага заканадаўства. Пяць мерапрыемстваў па разнастайных пытаннях бібліятэчнай практыкі для кіраўнікоў і спецыялістаў публічных бібліятэк вобласці прайшлі ў аддаленым фармаце на платформе ZOOM.

Трэба нагадаць, што ў мінулым годзе ў мэтах удасканалення бібліятэчнай справы пры Міністэрстве культуры быў створаны Рэспубліканскі бібліятэчны савет, у склад якога ўвайшлі кіраўнікі буйнейшых бібліятэк краіны і прадстаўнікі міністэрства. Першае,



*Дадатак № 17*
*Табліца 17*

**КЛУБЫ ПА ІНТАРЭСАХ І АМАТАРСКІЯ АБ’ЯДНАННІ**

| ЦБС | Усяго | | | | | | (Асобна) **Спецыяльныя** (для пажылых/інвалідаў) | (Асобна) **Лялечныя тэатры** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | з іх | | | | | |
| | **Кольк. клубаў** | **Кольк. удзельн.** | ***для дзяцей*** | ***кольк. удзельн.*** | ***для дарослых*** | *кольк. удзельн.* | | |
| Бешанковіцкая | 22 | 242 | 12 | 124 | 10 | 118 | 2/1 | 2 |
| Браслаўская | 14 | 219 | 5 | 95 | 9 | 124 | 3/0 | 0 |
| Верхнядзвінская | 16 | 170 | 10 | 86 | 6 | 84 | 4/0 | 0 |
| Віцебская | 27 | 380 | 10 | 131 | 17 | 249 | 2/0 | 0 |
| Глыбоцкая | 20 | 311 | 14 | 224 | 6 | 87 | 3/0 | 0 |
| Гарадоцкая | 25 | 274 | 14 | 149 | 11 | 125 | 1/0 | 2 |
| Докшыцкая | 27 | 256 | 13 | 134 | 14 | 122 | 5/0 | 0 |
| Дубровенская | 17 | 181 | 10 | 115 | 7 | 66 | 0/0 | 1 |
| Лепельская | 17 | 193 | 9 | 93 | 8 | 100 | 1/1 | 1 |
| Лёзненская | 18 | 241 | 10 | 140 | 8 | 101 | 2/0 | 0 |
| Мёрская | 17 | 172 | 7 | 62 | 10 | 110 | 4/0 | 0 |
| Аршанская | 34 | 448 | 18 | 179 | 16 | 269 | 3/0 | 3 |
| Полацкая | 25 | 318 | 11 | 137 | 14 | 181 | 4/0 | 2 |
| Пастаўская | 13 | 183 | 4 | 72 | 9 | 111 | 0/0 | 0 |
| Расонская | 7 | 72 | 4 | 39 | 3 | 33 | 0/0 | 0 |
| Сенненская | 18 | 193 | 5 | 34 | 13 | 159 | 0/0 | 1 |
| Талачынская | 13 | 119 | 10 | 78 | 3 | 41 | 3/0 | 1 |
| Ушацкая | 16 | 210 | 8 | 135 | 8 | 77 | 0/0 | 0 |
| Чашніцкая | 13 | 274 | 9 | 139 | 4 | 135 | 2/0 | 0 |
| Шаркаўшчынская | 13 | 142 | 6 | 55 | 7 | 87 | 5/0 | 0 |
| Шумілінская | 14 | 145 | 12 | 106 | 2 | 39 | 0/0 | 0 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **386** | **4743** | **201** | **2327** | **185** | **2418** | **44/2** | **13** |
| г.Віцебск | 14 | 203 | 3 | 59 | 11 | 144 | 5/3 | 0 |
| г.Наваполацк | 4 | 85 | 1 | 26 | 3 | 59 | 0/1 | 0 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **18** | **288** | **4** | **85** | **14** | **203** | **5/4** | **0** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **404** | **5031** | **205** | **2412** | **199** | **2621** | **49/6** | **13** |
| Абласная б-ка | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0/0 | 0 |
| **УСЯГО** | **404** | **5031** | **205** | **2412** | **199** | **2621** | **49/6** | **13** |
| 2021 год | 416 | 5185 | 207 | 2502 | 209 | 2683 | 52/6 | 17 |

*Працяг табліцы 16*

| ЦБС | Паступіла агучанай літаратуры | | Колькасць выданых дакументаў | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | У т.л. | |
| | кольк. экз. | на суму (руб.) | УСЯГО | агуч. літ. | шр. Брайля |
| Бешанковіцкая | 6 | 169,72 | 192 | 0 | 0 |
| Браслаўская | 19 | 382,68 | 348 | 247 | 0 |
| Верхнядзвінская | 22 | 726,00 | 204 | 1 | 0 |
| Віцебская | 0 | 0,00 | 292 | 13 | 0 |
| Гарадоцкая | 20 | 542,80 | 258 | 0 | 0 |
| Глыбоцкая | 30 | 486,60 | 49 | 4 | 0 |
| Докшыцкая | 68 | 642,12 | 224 | 61 | 0 |
| Дубровенская | 0 | 0,00 | 252 | 0 | 0 |
| Лепельская | 6 | 105,73 | 230 | 5 | 0 |
| Лёзненская | 12 | 245,63 | 188 | 3 | 0 |
| Мёрская | 2 | 37,96 | 66 | 6 | 0 |
| Аршанская | 91 | 2204,92 | 7199 | 2458 | 0 |
| Полацкая | 78 | 1691,12 | 481 | 481 | 0 |
| Пастаўская | 7 | 105,00 | 0 | 0 | 0 |
| Расонская | 10 | 56,52 | 0 | 0 | 0 |
| Сенненская | 9 | 79,92 | 63 | 10 | 0 |
| Талачынская | 22 | 456,42 | 300 | 23 | 0 |
| Ушацкая | 17 | 714,22 | 8 | 0 | 0 |
| Чашніцкая | 20 | 153,69 | 176 | 3 | 0 |
| Шаркаўшчынская | 10 | 244,32 | 465 | 0 | 0 |
| Шумілінская | 0 | 0,00 | 68 | 37 | 0 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **449** | **9045,37** | ***11063*** | ***3352*** | ***0*** |
| г.Віцебск | 181 | 6096,41 | 2924 | 2729 | 0 |
| г.Наваполацк | 71 | 719,35 | 85 | 85 | 0 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **252** | **6815,76** | ***3009*** | ***2814*** | ***0*** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **701** | **15861,13** | **14072** | **6166** | **0** |
| Абласная | 160 | 2598,68 | 244 | 100 | 327 |
| **УСЯГО** | **861** | **18459,81** | **14316** | **6266** | **327** |
| 2021 год | 822 | 14512,41 | 15837 | 6316 | 235 |



арганізацыйнае, пасяджэнне савета адбылося на базе Віцебскай абласной бібліятэкі 14 ліпеня. На прафесійнай сустрэчы былі падняты пытанні пашырэння складу савета, размеркавання абавязкаў яго членаў, перыядычнасці сходаў, яго задач на бліжэйшую перспектыву.

31 мая ў г. Віцебску стартаваў чатырохдзённы абласны Форум маладых работнікаў сферы культуры «Сучасная культура: новыя выклікі – новыя вяршыні», а ў Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І.Леніна адбыўся яго першы этап. У ліку арганізатараў Форуму – упраўленне культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, Віцебская абласная арганізацыя Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму, Віцебскі абласны камітэт ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». У рамках мерапрыемства прайшоў конкурс маладзёжных праектаў у галіне культуры, мастацтва і крэатыўных індустрый «Новы погляд...».

Спецыялісты і кіраўнікі бібліятэкі ў якасці членаў журы і аргкамітэта правялі рэгіянальныя туры рэспубліканскіх конкурсаў «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» і «Бібліятэка – цэнтр духоўнай асветы і выхавання». Акрамя рэспубліканскіх, мінулы год вызначыўся правядзеннем абласнога прафесійнага спаборніцтва – конкурсу кніжных кампазіцый «Праз кнігу ўбачыць краіну: BELARUS», які быў арганізаваны бібліятэкай сумесна з Віцебскай абласной арганізацыяй Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму ў рамках Года гістарычнай памяці. Для ўдзелу ў конкурсе супрацоўнікамі ўсіх бібліятэчных сістэм вобласці было прадстаўлена 100 работ. Цэнтральным элементам фотакампазіцый-буклукаў стала кніга, звязаная з Беларуссю, сюжэты твораў прысвячаліся традыцыйнай народнай культуры і гісторыі роднага краю. Згодна з рашэннем журы Гран-пры было прысуджана аўтару фотакампазіцыі «Сцяжынкамі роднага краю» (Я.Колас, «Сымон-музыка») – бібліятэкару І катэгорыі Звяняцкай сельскай бібліятэкі-філіяла № 30 ДУК «Талачынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Раісе Лукашэвіч. 14 верасня ў рамках святкавання Дня бібліятэк Беларусі адбылася цырымонія ўзнагароджання пераможцаў.

Павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў бібліятэкі па-ранейшаму знаходзіцца пад пільнай увагай кіраўніцтва. Упершыню прадстаўнік бібліятэкі на працягу двух тыдняў праходзіў навучанне па праграме павышэння кваліфікацыі ў рамках праекта «Адукацыйная калабарацыя бібліятэк Садружнасці – 2022», арганізаванага Расійскай дзяржаўнай бібліятэкай і Федэральным агенцтвам па справах Садружнасці Незалежных Дзяржаў, суайчыннікаў, пражываючых за мяжой, і па міжнародным гуманітарным супрацоўніцтве (Рассупрацоўніцтва). У навучальную праграму ўвайшлі: заняткі ў дыстанцыйным фармаце, вочны ўдзел у рабоце XXVI штогадовай канферэнцыі Расійскай бібліятэчнай асацыяцыі Усерасійскага бібліятэчнага кангрэса ў Ніжнім Ноўгарадзе, кароткачасовыя паездкі ў бібліятэкі Масквы з мэтай знаёмства з лепшымі практыкамі расійскіх калег. На працягу года двое спецыялістаў прайшлі навучанне на адукацыйных курсах «Інклюзія. Бібліятэка. Літаратура»

(г. Мінск, ГА «Беларуская бібліятэчная асацыяцыя») і «Беларусь – краіна гістарычнай памяці» (г. Мінск, МУ «МІПСА»).

Міжнароднае прафесійнае супрацоўніцтва дазваляе бібліятэцы ўлічваць у сваёй рабоце тэндэнцыі сусветнага развіцця, ацэньваць сваю дзейнасць, дасягненні і праблемы ў больш шырокім кантэксце, арыентавацца на міжнародныя стандарты бібліятэчнай дзейнасці. Найбольш актыўнае супрацоўніцтва звязвае Віцебскую абласную бібліятэку пераважна з бібліятэкамі Расійскай Федэрацыі.

У мінулым годзе было працягнута супрацоўніцтва з ДБУК «Пскоўская абласная ўніверсальная навуковая бібліятэка імя В.Я.Курбатава»: 2 чэрвеня дэлегацыя бібліятэкараў Віцебскай вобласці наведала бібліятэку з візітам, у ходзе якога адбыўся круглы стол, прысвечаны патрыятычнаму выхаванню моладзі. Галоўным вынікам сустрэчы стала падпісанне Пагаднення аб узаемным супрацоўніцтве паміж бібліятэкамі-партнёрамі. На працягу года сумеснымі намаганнямі былі праведзены: патрыятычная анлайн-акцыя «Голас памяці», юбілейны анлайн-фестываль «#ЯнкаКупала140», анлайн-фестываль творчых работ, малюнкаў і фатаграфій «Агульная памяць. Расія і Беларусь у вайне 1812 года», конкурс відэаролікаў «Чытаем разам: Гейне 225».

Выкананню планавага паказчыка па аказанню платных паслуг насельніцтву садзейнічала таксама арганізацыя тэматычных масавых мерапрыемстваў супрацоўнікамі бібліятэк: танцавальных вечарын для дзяцей і дарослых, дзіцячых ранішнікаў, конкурсна-забаўляльных праграм, тэатралізаваных пастановак, выязных канцэртных праграм калектываў бібліятэк-клубаў, выстаў. Сярод платных паслуг Аршанскай ЦБС папулярнасцю карысталіся мерапрыемствы, праведзеныя ў рамках камерцыйных праектаў «Лето, дружба, сто улыбок!», «Нескучный вечер в библиотеке», «Новогодняя сказка», правядзенне тэматычных танцавальных вечароў. Карыстальнікі бібліятэк ЦБС г. Наваполацка наведвалі камерцыйныя выставы «Удивительный мир пауков» і «Котовыставка», квэсты і дні нараджэння, праведзеныя супрацоўнікамі бібліятэкі.

## Кадры

Кадры – гэта адзін з важнейшых рэсурсаў бібліятэк. На 01.01.2023 г. у сістэме публічных бібліятэк Віцебскай вобласці было занята 1 086 бібліятэчных супрацоўнікаў, што на 3,5% менш, чым на канец мінулага года. Колькасць работнікаў з профільнай адукацыяй сярод іх – 655 чалавек (60,3%). Агульная штатная колькасць работнікаў бібліятэк складае 1 594,73 адзінкі (-51,47 да мінулага года).

На працягу 2022 года навучаліся ва ўстановах адукацыі на дзённай і завочнай формах навучання 25 супрацоўнікаў бібліятэк, з іх у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў – 4, Магілёўскім дзяржаўным каледжы мастацтваў – 8, іншых установах – 6. Праходзілі перападрыхтоўку ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» 7 чалавек. На рэспубліканскіх курсах павышэння кваліфікацыі павысілі прафесійны ўзровень 15 супрацоўнікаў. Віцебскі абласны цэнтр павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў устаноў культуры наведалі 80 чалавек.

Па размеркаванні ў бібліятэкі Віцебскага рэгіёна прыбылі 7 маладых спецыялістаў. З мэтай аказання дапамогі маладым спецыялістам

у іх прафесійным станаўленні і працэсе адаптацыі на першым працоўным месцы над такімі супрацоўнікамі арганізавана настаўніцтва.

На канец разгледжанага перыяду ў бібліятэках вобласці налічвалася 47,75 вакантных штатных адзінак.

## Узнагароды. Прэміі

Прафесійныя дасягненні супрацоўнікаў бібліятэк Віцебскай вобласці ў 2022 годзе былі адзначаны ўзнагародамі рознага ўзроўню.

Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь за вялікі ўклад у рэалізацыю сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь і шматгадовую плённую працу ў сферы культуры ўзнагароджана дырэктар Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І.Леніна **Таццяна Мікалаеўна Адамян**.

Граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь узнагароджана загадчык аддзела бібліятэказнаўства Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна **Наталля Аляксандраўна Пугачова**.

Ганаровай граматай Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта ўзнагароджана **Мяцеліца Алена Ігараўна**, дырэктар Сенненскай ЦБС.

Ганаровай граматай ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама ўзнагароджаны **Хомчанка Ірына Леанідаўна**, загадчык аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці; **Зарэмбіна Вольга Пятроўна**, бібліятэкар 2-й катэгорыі аддзела фарміравання бібліятэчнага фонду цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя М. Горкага ЦБС г. Віцебска; **Найдзяновіч Іна Уладзіміраўна**, загадчык Крулеўшчынскай сельскай бібліятэкі філіялам № 29 Докшыцкай ЦБС; **Красноўская Таццяна Мікалаеўна**, загадчык аддзела маркетынгу цэнтральнай раённай бібліятэкі Сенненскай ЦБС; **Дударава Надзея Аляксандраўна**, загадчык аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці цэнтральнай раённай бібліятэкі Дубровенскай ЦБС; **Караваева Марыя Віктараўна**, дырэктар ЦБС г. Наваполацка, **Шыпуля Вольга Рыгораўна**, загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі Бешанковіцкай ЦБС.

Падзякай упраўлення культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта ўзнагароджана **Палітава Жанна Анатолеўна**, загадчык дзіцячай бібліятэкі імя Н.К. Крупскай – філіяла № 8 Аршанскай ЦБС.

Граматай Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорта і турызму ўзнагароджана **Мяцеліца Алена Ігараўна**, дырэктар Сенненскай ЦБС, **Самсонава Аксана Аляксандраўна**, бібліятэкар 2-ой катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі Талачынскай ЦБС.

Нагрудны знак узнагароды Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь «За адзнаку ў ваенна-мемарыяльнай рабоце» атрымала **Дударава Надзея Аляксандраўна**, загадчык аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці Дубровенскай ЦБС.



*Дадатак № 11*
*Табліца 11*

**КАМП’ЮТАРЫЗАЦЫЯ І АЎТАМАТЫЗАЦЫЯ БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ**

| ЦБС | Сетка 2022 | Камп’ютарыз. б-к 01.01.2023 | | % камп’ютарызацыі |
|---|---|---|---|---|
| | | усяго | з іх у 2022 | |
| Бешанковіцкая | 13 | 13 | 0 | 100,0 |
| Браслаўская | 13 | 13 | 0 | 100,0 |
| Верхнядзвінская | 17 | 17 | 0 | 100,0 |
| Віцебская | 22 | 22 | 0 | 100,0 |
| Глыбоцкая | 24 | 24 | 0 | 100,0 |
| Гарадоцкая | 14 | 14 | 0 | 100,0 |
| Докшыцкая | 19 | 13 | 0 | 68,4 |
| Дубровенская | 17 | 17 | 1 | 100,0 |
| Лепельская | 16 | 16 | 0 | 100,0 |
| Лёзненская | 15 | 15 | 0 | 100,0 |
| Мёрская | 18 | 14 | 2 | 77,8 |
| Аршанская | 34 | 34 | 1 | 100,0 |
| Полацкая | 35 | 35 | 0 | 100,0 |
| Пастаўская | 19 | 19 | 0 | 100,0 |
| Расонская | 9 | 9 | 0 | 100,0 |
| Сенненская | 15 | 15 | 0 | 100,0 |
| Талачынская | 15 | 15 | 0 | 100,0 |
| Ушацкая | 9 | 9 | 0 | 100,0 |
| Чашніцкая | 16 | 16 | 0 | 100,0 |
| Шаркаўшчынская | 14 | 14 | 0 | 100,0 |
| Шумілінская | 14 | 14 | 0 | 100,0 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **368** | **358** | **4** | **97,3** |
| г.Віцебск | 16 | 16 | 0 | 100,0 |
| г.Наваполацк | 7 | 7 | 0 | 100,0 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **23** | **23** | **0** | **100,0** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **391** | **381** | **4** | **97,4** |
| Абласная б-ка | 1 | 1 | 0 | **100,0** |
| **УСЯГО** | **392** | **382** | **4** | **97,4** |
| 2021 год | 420 | 398 | 16 | 94,8 |

| | Объем бюджетного финансирования на комплектование библиотечных фондов и приобретение прав доступа к электронным информационным ресурсам, рублей | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | план | факт | % | в том числе: приобрет. (закупка) док. | приобрет. (закупка) СЗЛ | подписка | права доступа к электр. ресурсам |
| **1** | **6** | **7** | **8** | **9** | **9а** | **10** | **11** |
| **Областная библиотека** | **241309,21** | **241309,21** | **12,4** | **111560,52** | **10443,28** | **116206,02** | **13542,67** |
| ЦБС, в т. ч. | | | | | | | |
| Бешенковичская | 72207,00 | 72206,76 | **13,4** | 33924,93 | 7573,98 | 35114,49 | 3167,34 |
| Браславская | 54800,00 | 54522,06 | **13,0** | 27439,32 | 11667,26 | 23466,78 | 3615,96 |
| Верхнедвинская | 65694,78 | 65694,78 | **12,5** | 32498,60 | 7785,89 | 29663,02 | 3533,16 |
| Витебская | 85526,84 | 85526,84 | **13,2** | 35886,60 | 11538,49 | 49640,24 | 0,00 |
| Глубокская | 112550,10 | 112550,10 | **13,3** | 57052,02 | 8488,32 | 54688,37 | 809,71 |
| Городокская | 96502,00 | 94630,67 | **12,2** | 36185,11 | 10023,10 | 54999,09 | 3446,47 |
| Докшицкая | 93170,00 | 93161,53 | **12,8** | 26132,20 | 11263,21 | 64408,36 | 2620,97 |
| Дубровенская | 85007,29 | 82931,78 | **12,8** | 22315,26 | 8701,77 | 60184,54 | 431,98 |
| Лепельская | 89422,98 | 89422,98 | **12,2** | 41375,24 | 10809,08 | 43610,67 | 4437,07 |
| Лиозненская | 73970,00 | 72504,44 | **12,3** | 22940,15 | 12238,78 | 48253,80 | 1310,49 |
| Миорская | 92 257,41 | 88198,61 | **12,2** | 52463,88 | 12814,12 | 35734,73 | 0,00 |
| Оршанская | 269608,98 | 266328,21 | **13,2** | 123757,60 | 26279,58 | 140546,39 | 2024,22 |
| Полоцкая | 276400,00 | 276388,18 | **13,6** | 132931,47 | 26099,92 | 139975,21 | 3481,50 |
| Поставская | 79428,53 | 79428,53 | **12,7** | 34592,63 | 18348,30 | 44835,90 | 0,00 |
| Россонская | 41417,36 | 41417,36 | **12,3** | 10915,72 | 2613,22 | 30501,64 | 0,00 |
| Сенненская | 61417,19 | 61417,19 | **12,2** | 22963,70 | 11074,42 | 36245,25 | 2208,24 |
| Толочинская | 70232,00 | 70231,34 | **12,4** | 24559,02 | 4235,43 | 44625,95 | 1046,37 |
| Ушачская | 61700,00 | 58620,73 | **13,7** | 25237,27 | 10071,28 | 32573,86 | 809,60 |
| Чашникская | 103368,89 | 103368,89 | **12,2** | 60329,61 | 12605,48 | 42229,57 | 809,71 |
| Шарковщинская | 54420,98 | 54420,98 | **12,2** | 19253,37 | 6344,55 | 34357,90 | 809,71 |
| Шумилинская | 63670,32 | 63669,38 | **12,2** | 21914,37 | 611,63 | 40594,30 | 1160,71 |
| **Всего по РЦБС** | **2002772,65** | **1986641,34** | **12,8** | **864668,07** | **231187,81** | **1086250,06** | **35723,21** |
| г. Витебск | 252200,49 | 250136,02 | **12,2** | 139966,83 | 58328,58 | 107497,29 | 2671,90 |
| г. Новополоцк | 154820,00 | 154391,55 | **12,0** | 100359,11 | 12767,47 | 48599,94 | 5432,50 |
| **Всего по ГЦБС** | **407020,49** | **404527,57** | **12,1** | **240325,94** | **71096,05** | **156097,23** | **8104,40** |
| **ВСЕГО** | **2651102,35** | **2632478,12** | **12,7** | **1216554,53** | **312727,14** | **1358553,31** | **57370,28** |



Падзяка Віцебскай абласной грамадскай арганізацыі «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» вынесена **Ізаітка Марыне Валянцінаўне**, бібліятэкару аддзела бібліятэчнага маркетынгу цэнтральнай раённай бібліятэкі Глыбоцкай ЦБС.

Рашэннем Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта ад 21 красавіка 2022 года № 222 «Аб занясенні на дошку Гонару Віцебскай вобласці пераможцаў спаборніцтва 2021 года» сярод арганізацый, якія ажыццяўляюць дзейнасць у сферы культуры, арганізацыі адпачынку і забаў, дзяржаўная ўстанова **«Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна»** была занесена на дошку гонару Віцебскай вобласці. За вялікую культурна-асветніцкую работу сярод насельніцтва на раённыя дошкі гонару занесены калектыў цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК **«Дубровенская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»** і **Марковіч Ірына Генадзеўна** – бібліятэкар Плінскай бібліятэкі Ушацкай ЦБС.

Падзяку Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта ў абласным аглядзе-конкурсе на лепшую арганізацыю ідэалагічнай работы ў працоўных калектывах Віцебскай вобласці за 2021 год ў намінацыі «Культура» атрымала дзяржаўная ўстанова культуры **«Бешанковіцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**.

Напярэдадні Дня работнікаў культуры традыцыйна адбылося ўзнагароджанне лаўрэатаў абласной прэміі, якая ўручаецца Віцебскім аблвыканкамам за высокія творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва. Лепшым бібліятэчным работнікам прызнана загадчык аддзелам краязнаўства Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І.Леніна **Ларыса Іванаўна Рагачова.**

На пасяджэнні выніковай калегіі ўпраўлення культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта адбылося прысуджэнне штогадовай прэміі за высокія творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва па выніках 2022 года:

- у намінацыі «Лепшая раённая (гарадская) бібліятэка» адзначана **цэнтральная бібліятэка імя У. Маякоўскага ЦБС г. Наваполацка**;
- у намінацыі «Лепшая сельская бібліятэка» адзначана **Кавалёўская сельская бібліятэка Лёзненскай ЦБС**;
- у намінацыі «Лепшая дзіцячая бібліятэка» адзначана **раённая дзіцячая бібліятэка – філіял № 1 імя У. Дубоўкі Пастаўскай ЦБС**.

## Літаратурная прэмія імя Петруся Броўкі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта

Прэмія імя нашага знакамітага земляка, ураджэнца Ушаччыны, зацверджана Віцебскім аблвыканкамам у 2012 годзе. За гэты час лаўрэатамі сталі 22 пісьменнікі і паэты, якія годна працягваюць літаратурныя традыцыі Віцебшчыны. Тэматыка іх твораў кранае розныя бакі жыцця, але на чале стаіць любоў да роднага краю, яго гераічнага мінулага.

У намінацыі **«Проза»** атрымаў узнагароду **Канстанцін Нілаў** за аповесць **«Копыская навэла»**, якая распавядае пра подзвіг удзельнікаў

партыйна-камсамольскага падполля і партызанскага руху ў Копысі Аршанскага раёна. Кніга выйшла ў беларускім выдавецтве «Звязда». Як патлумачыў аўтар, гэты твор на 70% мае дакументальную аснову. Пісьменнік абапіраўся на дакументы, успаміны нашчадкаў падпольшчыкаў, матэрыялы з сямейных архіваў.

У намінацыі **«Літаратура для дзяцей»** адзначана кніга **Тамары Красновай-Гусачэнка «Край родны, любімы»**. Гэта выданне ўвайшло ў школьную праграму па пазакласным чытанні для дзяцей малодшага ўзросту. У кнізе можна знайсці адказы на розныя пытанні, даведацца шмат цікавага пра пары года, народныя і хрысціянскія святы, звяроў і птушак.

## Конкурсы

### *Вынікі ХХХ Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»*

13 чэрвеня 2022 года загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь № 123 зацверджаны вынікі ХХХ Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры». Па выніках конкурсу дыпломамі першай, другой і трэцяй ступені былі адзначаны 22 публічныя бібліятэкі, 5 бібліятэк прадстаўлены да заахвочвання. Сярод пераможцаў – 2 бібліятэкі Віцебскай вобласці.

У намінацыі «**За пошукавую і даследчую дзейнасць»**

**Дыпломы другой ступені** (40 базавых велічынь) атрымалі

- цэнтральная раённая бібліятэка ДУК «Дубровенская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (сярод гарадскіх бібліятэк) за работу па ўстанаўленні і ўвекавечванні імёнаў воінаў, якія загінулі, абараняючы Дубровенскі раён у гады Вялікай Айчыннай вайны, у рамках дзейнасці клуба «Поисковик», вядзенне суполак «Воінскія пахаванні Дубровенскага раёна» ў сацыяльных сетках, удзел у рабоце па ўсталяванні мемарыяльных комплексаў.
- філіял «Кавалёўская сельская бібліятэка-музей» ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (сярод сельскіх бібліятэк) за сабраны ў рамках праекта «Бабулін куфэрак» аб’ёмісты матэрыял па народных гульнях, кухні, звычаях, традыцыях і самабытнай культуры мясцовасці, які знайшоў адлюстраванне ў цыкле зборнікаў.

### *Вынікі VIII Рэспубліканскага конкурсу «Библиотека – центр духовного просвещения и воспитания»*

4 лістапада 2022 года распараджэннем па Беларускай Праваслаўнай Царкве зацверджаны вынікі VIII Рэспубліканскага конкурсу «Библиотека – центр духовного просвещения и воспитания». Рэспубліканскае журы разглядала конкурсныя работы ад публічных бібліятэк Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, бібліятэк устаноў





**ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЕМАХ БЮДЖЕТНОГО ФИНАНСИРОВАНИЯ, НАПРАВЛЯЕМОГО НА КОМПЛЕКТОВАНИЕ ФОНДОВ БИБЛИОТЕК В 2022 ГОДУ**

| | Общий объем бюджетного финансирования на содержание библиотек, рублей | | Объем бюджетного финасирования (без учета средств, затраченных по статьям 2.40.00.00 «Капитальные вложения в основные фонды» и 1.10.10.03 «Оплата текущего ремонта зданий и помещений», рублей | |
|---|---|---|---|---|
| | план | факт | план | факт |
| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** |
| **Областная библиотека** | **2121720,00** | **2120119,88** | **1950983,00** | **1949384,72** |
| ЦБС, в т. ч. | | | | |
| Бешенковичская | 558569,12 | 550630,66 | 547739,12 | 539924,57 |
| Браславская | 427720,00 | 424005,07 | 421958,00 | 418243,74 |
| Верхнедвинская | 541430,00 | 530949,19 | 537587,00 | 527294,33 |
| Витебская | 730378,00 | 654663,60 | 721224,00 | 646244,07 |
| Глубокская | 967012,94 | 967012,94 | 848657,74 | 848657,74 |
| Городокская | 780655,11 | 780233,29 | 773620,11 | 773199,36 |
| Докшицкая | 753426,00 | 732338,48 | 747110,00 | 729448,54 |
| Дубровенская | 654223,04 | 654200,54 | 646756,88 | 646734,38 |
| Лепельская | 735985,60 | 735985,60 | 731935,52 | 731935,52 |
| Лиозненская | 594463,31 | 594457,96 | 588449,79 | 588445,11 |
| Миорская | 732647,56 | 730646,39 | 727448,91 | 725447,78 |
| Оршанская | 2140704,10 | 2078476,44 | 2073692,01 | 2012136,41 |
| Полоцкая | 2038979,00 | 2038972,03 | 2027238,00 | 2027232,24 |
| Поставская | 656799,91 | 652665,39 | 630938,00 | 626805,62 |
| Россонская | 351018,00 | 344420,56 | 342711,00 | 336238,53 |
| Сенненская | 514293,00 | 509801,95 | 506712,00 | 502266,27 |
| Толочинская | 588451,69 | 572560,78 | 583326,69 | 567437,73 |
| Ушачская | 427521,00 | 426467,36 | 427394,00 | 426340,36 |
| Чашникская | 862471,31 | 849902,18 | 856267,95 | 844149,72 |
| Шарковщинская | 600066,66 | 597430,61 | 447211,22 | 444575,17 |
| Шумилинская | 538717,33 | 532520,98 | 530169,33 | 524001,98 |
| **Всего по РЦБС** | **16195532,68** | **15958342,00** | **15718147,27** | **15486759,17** |
| г. Витебск | 2130170,81 | 2072968,12 | 2102812,52 | 2045871,21 |
| г. Новополоцк | 1317520,00 | 1314990,87 | 1286827,00 | 1284435,94 |
| **Всего по ГЦБС** | **3447690,81** | **3387958,99** | **3389639,52** | **3330307,15** |
| **ВСЕГО** | **21764943,49** | **21466420,87** | **21058769,79** | **20766451,04** |

| ЦБС | Дакумента-выдача | Фонд | *Абарачаль-насць* | Паступіла | Выбыла |
|---|---|---|---|---|---|
| | 2022 | | | | |
| Бешанковіцкая | 66 907 | 99006 | 0,7 | 5696 | 3844 |
| Браслаўская | 86 066 | 77798 | 1,1 | 4232 | 3908 |
| Верхнядзвінская | 88 091 | 73233 | 1,2 | 3100 | 6315 |
| Віцебская | 193 985 | 192151 | 1,0 | 3614 | 16464 |
| Глыбоцкая | 141 857 | 155722 | 0,9 | 5728 | 9545 |
| Гарадоцкая | 83 405 | 82297 | 1,0 | 3272 | 13599 |
| Докшыцкая | 100 222 | 107831 | 0,9 | 4503 | 9050 |
| Дубровенская | 77 454 | 100561 | 0,8 | 4842 | 10115 |
| Лепельская | 134 059 | 102642 | 1,3 | 4770 | 10535 |
| Лёзненская | 58 382 | 55075 | 1,1 | 2379 | 2458 |
| Мёрская | 79 855 | 69820 | 1,1 | 2491 | 11999 |
| Аршанская | 219 356 | 239324 | 0,9 | 12512 | 9659 |
| Полацкая | 203 500 | 150610 | 1,4 | 8555 | 12218 |
| Пастаўская | 66 154 | 93748 | 0,7 | 3579 | 5722 |
| Расонская | 60 843 | 52592 | 1,2 | 2109 | 670 |
| Сенненская | 81 839 | 107240 | 0,8 | 3354 | 6264 |
| Талачынская | 48 111 | 75676 | 0,6 | 3446 | 14610 |
| Ушацкая | 49 467 | 52763 | 0,9 | 2658 | 39730 |
| Чашніцкая | 59 544 | 96724 | 0,6 | 2776 | 17409 |
| Шаркаўшчынская | 68 830 | 74521 | 0,9 | 3908 | 14504 |
| Шумілінская | 63 919 | 52518 | 1,2 | 2102 | 8494 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **2 031 846** | **2 111 852** | **1,0** | **89626** | **227112** |
| 2021 год | 2187516 | 2 261 819 | 1,0 | 95768 | 147951 |



адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, бібліятэк, падведамасных Беларускаму Экзархату. У конкурсе прымала ўдзел адна бібліятэка Віцебскай вобласці.

У намінацыі **«Духоўна-маральнае выхаванне дзяцей і моладзі»**

**Заахвочванне** сярод бібліятэк, размешчаных у гарадской мясцовасці, атрымала

- Гарадоцкая цэнтральная раённая бібліятэка ДУК «Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк».

## *Абласны конкурс кніжных кампазіцый «Праз кнігу ўбачыць краіну: BELARUS»*

На працягу летніх месяцаў сярод супрацоўнікаў публічных бібліятэк Віцебскай вобласці праходзіў конкурс «Праз кнігу ўбачыць краіну: BELARUS», ініцыяваны абласной бібліятэкай і Віцебскай абласной арганізацыяй Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму. Для ўдзелу ў конкурсе бібліятэкары прадстаўлялі фотаздымкі, цэнтральным элементам якіх былі кнігі, звязаныя з Беларуссю. Сюжэты фотакампазіцый прысвячаліся традыцыйнай народнай культуры, гісторыі роднага краю, у іх адбіліся любоў да чытання і літаратуры, арыгінальны творчы падыход і гумар.

У журы конкурсу пад кіраўніцтвам дырэктара ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна» Таццяны Адамян былі запрошаны Алена Сабірава, старшыня Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму; Святлана Дзядзінкіна, галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама; Дзмітрый Осіпаў, фотакарэспандэнт Рэдакцыі абласной газеты «Віцебскія весці»; Ганна Жукава, педагог аддзялення «Мастацтва і дызайн» філіяла «Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны каледж» УА «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт»; Наталля Тарабука, дацэнт кафедры «Дызайну і моды» факультэта дызайну УА «Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт», член Беларускага саюза дызайнераў. Звярнуўшы ўвагу на разнапланавасць конкурсных здымкаў, судзейская калегія вырашыла не проста вызначыць пераможцаў зводнай колькасцю балаў, але і заахвоціць асобныя працы асабістымі прызамі членаў журы.

На конкурс было даслана 100 работ амаль з усіх куткоў Віцебшчыны. Конкурсныя работы ўражвалі сваёй разнастайнасцю. Бібліятэкары натхняліся сучаснай мастацкай літаратурай Беларусі і класікамі, энцыклапедычнымі выданнямі і краязнаўчай літаратурай, ваеннай прозай і дзіцячымі казкамі.

Згодна з рашэннем журы ўзнагароды пераможцам конкурсу і грашовыя прэміі ад Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму прысуджаны:

ГРАН-ПРЫ: фотакампазіцыя «Сцяжынкамі роднага краю» (Я.Колас «Сымон-музыка»), аўтар – Раіса Лукашэвіч, бібліятэкар 1 катэгорыі Звяняцкай сельскай бібліятэкі-філіяла № 30 ДУК «Талачынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма».

I ПРЭМІЯ: фотакампазіцыя «Хлеб Беларусі» (фотаальбом «Хлеб Беларусі»), аўтар – Тамара Сцепулёнак, бібліятэкар 2 катэгорыі Узмёнскай сельскай бібліятэкі ДУК «Мёрская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма».

II ПРЭМІЯ: фотакампазіцыя «У партызанскай зямлянцы» (П.Лебедзеў «Мы – аляксееўцы: запіскі партызанскага разведчыка»), аўтар – Любоў Кісялёва, бібліятэкар Кавалёўскай сельскай бібліятэкі-музея ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма».

III ПРЭМІЯ: фотакампазіцыя «Крэпасць мужнасці і славы» (С.Бабранок «Ля сцен Брэсцкай крэпасці: запіскі ўдзельніка абароны»), аўтар – Іна Бандарэнка, загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі Пастаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Пастаўская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма».

Персанальныя спецыяльныя прызы «За шчырасць і гарманічнасць вобразаў і высокую тэхнічнасць выканання» ад Дзмітрыя Осіпава ўручаны Леакадзіі Аляксеенка, бібліятэкару Сяляўшчынскай сельскай бібліятэкі (філіяла № 18) ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Расонскага раёна», за кампазіцыю «Старонкі гісторыі ажываюць» і Раісе Лукашэвіч, бібліятэкару 1 катэгорыі Звяняцкай сельскай бібліятэкі-філіяла № 30 ДУК «Талачынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», за працу «Сцяжынкамі роднага краю».

Спецыяльны прыз «За крэатыўную атмасферу творчай работы» ад Наталлі Тарабука ўручаны Ганне Паўлючковай, бібліятэкару аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Лепельская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», за кампазіцыю «І зноў у сэрцы струны рвуцца».

Спецыяльны прыз «За выдатны кадр і гульню слоў у назве «ИзумЛён» ад Ганны Жукавай уручаны Наталлі Гусевай, бібліятэкару Усценскай сельскай бібліятэкі – філіяла № 35 ДУК «Аршанская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», за фотакампазіцыю «ИзумЛён».

## Міжнародныя праекты, акцыі. Бібліятэчнае супрацоўніцтва

Публічныя бібліятэкі Віцебскай вобласці прымалі ўдзел у наступных мерапрыемствах міжнароднага ўзроўню:

– *Міжнародная патрыятычная акцыя «Голас памяці»* (арганізавана Міжнародным бібліятэчным цэнтрам ДБУК «Пскоўская абласная ўніверсальная навуковая бібліятэка», «Пскоўскай абласной спецыяльнай бібліятэкай для невідушчых і са слабым зрокам» сумесна з ДУ «Віцебская абласная бібліятэка»). Акцыя прызвана праз чытанні вершаў на рускай і беларускай мовах, мовах народаў Расіі і краін СНД падкрэсліць разнастайнасць творчых і тэматычных падыходаў да раскрыцця паняццяў



*Дадатак № 9*
*Табліца 9*

**СЕЛЬСКІЯ БІБЛІЯТЭКІ**

| ЦБС | Сетка | | Сельскае насельніцтва* | | % ахопу | Чыта-чы | Навед-ванні | *Чыт.* | *Нав ед.* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2021 | 2022 | 2021 | 2022 | 2022 | | | | |
| Бешанковіцка | 10 | 10 | 7 296 | 7 004 | 45,9 | 3212 | 36530 | 20,8 | 11, |
| Браслаўская | 10 | 10 | 13 232 | 12 791 | 33,0 | 4217 | 38955 | 20,4 | 9,2 |
| Верхнядзвінск | 14 | 14 | 12 034 | 11 564 | 39,6 | 4583 | 40668 | 19,2 | 8,9 |
| Віцебская | 21 | 19 | 33 884 | 33 450 | 29,5 | 9855 | 87710 | 19,7 | 8,9 |
| Глыбоцкая | 20 | 20 | 15 150 | 14 647 | 52,7 | 7714 | 57125 | 18,4 | 7,4 |
| Гарадоцкая | 15 | 12 | 8 714 | 8 400 | 54,4 | 4572 | 43851 | 18,2 | 9,6 |
| Докшыцкая | 18 | 16 | 12 499 | 12 173 | 44,8 | 5455 | 49401 | 18,4 | 9,1 |
| Дубровенская | 16 | 15 | 7 112 | 6 873 | 50,7 | 3488 | 45948 | 22,2 | 13, |
| Лепельская | 15 | 14 | 14 154 | 13 840 | 42,0 | 5810 | 50511 | 23,1 | 8,7 |
| Лёзненская | 13 | 13 | 9 070 | 8 676 | 36,1 | 3130 | 29567 | 18,7 | 9,4 |
| Мёрская | 17 | 15 | 9 400 | 9 074 | 40,4 | 3664 | 35078 | 21,8 | 9,6 |
| Аршанская | 22 | 21 | 22 413 | 22 318 | 50,8 | 11337 | 79455 | 19,3 | 7,0 |
| Полацкая | 24 | 24 | 19 723 | 19 181 | 46,9 | 8989 | 91414 | 22,6 | 10, |
| Пастаўская | 16 | 14 | 11 008 | 10 541 | 31,5 | 3325 | 30588 | 19,9 | 9,2 |
| Расонская | 8 | 8 | 4 192 | 4 060 | 57,1 | 2319 | 21661 | 26,2 | 9,3 |
| Сенненская | 12 | 12 | 10 479 | 10 016 | 39,2 | 3927 | 46286 | 20,8 | 11, |
| Талачынская | 14 | 12 | 9 672 | 9 158 | 32,5 | 2976 | 19893 | 16,2 | 6,7 |
| Ушацкая | 14 | 8 | 6 556 | 6 179 | 53,7 | 3316 | 22547 | 14,9 | 6,8 |
| Чашніцкая | 13 | 12 | 7 824 | 7 473 | 43,2 | 3227 | 26881 | 18,5 | 8,3 |
| Шаркаўшчын | 14 | 12 | 7 950 | 7 602 | 48,0 | 3646 | 31815 | 18,9 | 8,7 |
| Шумілінская | 12 | 10 | 7 619 | 7 294 | 41,3 | 3014 | 39779 | 21,2 | 13, |
| **Усяго па** | **318** | **291** | **249** | **242 314** | **42,0** | **101 776** | **925663** | **20,0** | **9,1** |
| 2021 год | | | | | 44,0 | 109 919 | 973599 | 19,9 | 8,9 |

*Працяг табліцы 8*

| ЦБС | **ВЫБЫЛА** ў 2022 усяго | **ФОНД** на канец 2022 года | **% абнаўлення фонду** | **% выканання нарматыву на кампл.** |
|---|---|---|---|---|
| Бешанковіцкая | 7324 | 183303 | 4,5 | 13,4 |
| Браслаўская | 8935 | 172577 | 3,5 | 13,0 |
| Верхнядзвінская | 11858 | 120552 | 4,3 | 12,5 |
| Віцебская | 19441 | 264840 | 1,9 | 13,2 |
| Глыбоцкая | 13793 | 278930 | 3,8 | 13,3 |
| Гарадоцкая | 16636 | 164999 | 4,0 | 12,2 |
| Докшыцкая | 12118 | 194879 | 3,7 | 12,8 |
| Дубровенская | 13381 | 165001 | 4,1 | 12,8 |
| Лепельская | 13733 | 175265 | 4,6 | 12,2 |
| Лёзненская | 4563 | 113727 | 4,0 | 12,3 |
| Мёрская | 16123 | 137317 | 4,0 | 12,2 |
| Аршанская | 28033 | 719633 | 3,4 | 13,2 |
| Полацкая | 30709 | 507790 | 4,1 | 13,6 |
| Пастаўская | 8791 | 203508 | 3,8 | 12,7 |
| Расонская | 8321 | 88296 | 4,1 | 12,3 |
| Сенненская | 10841 | 190121 | 3,1 | 12,2 |
| Талачынская | 16762 | 142200 | 4,3 | 12,4 |
| Ушацкая | 55258 | 94203 | 4,3 | 13,7 |
| Чашніцкая | 26667 | 232003 | 3,3 | 12,2 |
| Шаркаўшчынская | 17541 | 130810 | 4,2 | 12,2 |
| Шумілінская | 10890 | 109333 | 4,1 | 12,2 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **351718** | **4389287** | **3,7** | |
| г.Віцебск | 11110 | 741084 | 2,4 | 12,2 |
| г.Наваполацк | 15628 | 394723 | 2,5 | 12,0 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **26738** | **1135807** | **2,5** | |
| **УСЯГО па ЦБС** | **378456** | **5525094** | **3,5** | |
| Абласная б-ка | 15159 | 674180 | 1,4 | 12,4 |
| **УСЯГО** | **393615** | **6199274** | **3,2** | **12,7** |



«вайна» і «перамога», узмацніць важнасць фарміравання і падтрымання калектыўнай памяці аб Перамозе над фашызмам у Вялікай Айчыннай вайне. Тэматыка твораў для прачытання – «Вайна», «Перамога», «Пераемнасць памяці пра подзвіг і гераізм».

— *Міжнародны конкурс «Была вайна...» (г. Казань, Рэспубліка Татарстан)* (у рамках рэалізацыі Міжнароднага інавацыйнага праекта «Мая Айчына»). Н.Дударава, загадчык аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці Дубровенскай ЦБС з праектам «Увекавечанне памяці салдат, якія загінулі на Дубровенскай зямлі» і С.Калеснікава, кіраўнік народнага аматарскага аб’яднання «Сучаснік» Верхнядзвінскай ЦРБ імя Т.Хадкевіча атрымалі дыпломы І і ІІ ступені адпаведна.

— *V Міжнародная акцыя «Читаем Григорьева вместе»* (арганізавана Бібліятэкай-цэнтрам зносін і інфармацыі імя І.Грыгор’ева УК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» г. Пскова). У акцыі прымалі ўдзел бібліятэчныя сістэмы Браслаўскага, Гарадоцкага раёнаў.

— *XI паэтычны фестываль «Руднянские зори» (Смаленская вобласць).* У мерапрыемстве прынялі ўдзел удзельнікі народнага аматарскага літаратурнага аб’яднання «Пад абажурам» Лёзненскай цэнтральнай раённай бібліятэкі.

— *Міжнародны праект «Адукацыйная калабарацыя бібліятэк Садружнасці-2022» (г. Масква і г. Ніжні Ноўгарад)* у рамках праграмы кароткатэрміновых азнаямленчых паездак у Расійскую Федэрацыю маладых прадстаўнікоў палітычных, грамадскіх, навуковых і дзелавых колаў замежных дзяржаў «Новае пакаленне». У праекце, рэалізаваным Расійскай дзяржаўнай бібліятэкай сумесна з Россупрацоўніцтвам, прынялі ўдзел спецыялісты Віцебскай абласной бібліятэкі і Полацкай РЦБС. Праект уключаў двухэтапнае завочна-вочнае навучанне маладых спецыялістаў. На завочным этапе праходзілі практычныя заняткі па тэмах «Лічбавае асяроддзе і бібліятэка», «Інавацыі ў бібліятэцы», «Камунікацыйны менеджмент: псіхалогія кіравання». У рамках вочнага этапу праекта супрацоўнікі прынялі ўдзел у XXVI Штогадовай канферэнцыі РБА ў Ніжнім Ноўгарадзе – «Бібліятэчнай сталіцы Расіі 2022 года» – прынялі ўдзел у паседжаннях Секцый РБА, наведалі Расійскую дзяржаўную бібліятэку для моладзі, Расійскую дзяржаўную дзіцячую бібліятэку і Расійскую дзяржаўную бібліятэку.

— *Міжнародны адукацыйны анлайн-праект «Сучасная бібліятэка».* Удзельнікам стала раённая дзіцячая бібліятэка імя У.Дубоўкі Пастаўскай ЦБС. для шырокай аўдыторыі была праведзена лекцыя «Культурна-дасугавая дзейнасць Пастаўскай раённай дзіцячай бібліятэкі імя Уладзіміра Дубоўкі».

1 красавіка паміж МУ «Цэнтральная бібліятэка МОГА «Ухта» (Рэспубліка Комі) і ДУК «Глыбоцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве.

22–23 чэрвеня дэлегацыя Наваполацкага гарвыканкама наведала з рабочым візітам горад-пабрацім Электрасталь (Расія). Яе удзельнікам была і дырэктар ЦБС Марыя Караваева. У рамках візіту дэлегацыя была запрошана на працоўную сустрэчу па абмене прафесійнымі навыкамі. Удзельнікі дэлегацыі пазнаёміліся з работай бібліятэчнай сістэмы г. Электрасталь па развіцці праекта «Сямейныя чытанні», з метадамі работы з сямейнай аўдыторыяй, а таксама з працэсам інтэграцыі бібліятэк у культурную прастору сучаснага горада.

4 верасня супрацоўнікі Віцебскай абласной і Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэк прынялі ўдзел у днях Віцебскай вобласці ў горадзе Пскове. Мэтай мерапрыемства было развіццё партнёрскіх і сяброўскіх адносін, якія дазваляюць рэалізоўваць сумесныя праекты. Супрацоўнікі абласной бібліятэкі прынялі ўдзел у выставе «Культурная спадчына Віцебскай вобласці» з кніжнай экспазіцыяй «Вытокі беларускай духоўнасці. Гонар і слава роднага краю». Гарадоцкая цэнтральная раённая бібліятэка арганізавала паэтычную пляцоўку «Гарадоцкі Парнас», на якой госці свята даведаліся пра знакамітага ўраджэнца Гарадоцкай зямлі Канстанціна Вераніцына і штогадовы брэндавы фестываль, што ладзіцца ў яго гонар.

## АРГАНІЗАЦЫЯ І ЗМЕСТ БІБЛІЯТЭЧНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ

Бібліятэкі Віцебшчыны ў 2022 годзе пазіцыянавалі сябе як цэнтры чытання, краязнаўства, захавання нацыянальнай спадчыны і культурных традыцый. Усяго ў бібліятэках Віцебскага рэгіёну праведзена 28,1 тыс. мерапрыемстваў, у т.л. 18,9 тыс. – для дзяцей і падлеткаў. Культурна-асветніцкія мерапрыемствы былі прысвечаны гістарычным, літаратурным, памятным і краязнаўчым датам: Году гістарычнай памяці, 140-годдзю класікаў беларускай літаратуры Я.Купалы і Я.Коласа, святочным і юбілейным датам беларускага календара, а таксама іншым знакавым падзеям.

### *Сацыякультурныя мерапрыемствы і праекты да Года гістарычнай памяці*

На працягу года тэма зберажэння гістарычнай памяці гучала ў бібліятэках вобласці падчас дыялогавых пляцовак, форумаў, круглых сталоў з удзелам кіраўнікоў дзяржаўных органаў, экспертаў, прадстаўнікоў грамадскіх аб’яднанняў.

12 сакавіка ў Палацы культуры ў Оршы прайшла цырымонія адкрыцця **рэспубліканскай акцыі «Орша – культурная сталіца Беларусі-2022»**, у рамках якой была арганізавана дыялогавая пляцоўка «Роля ўстаноў культуры ў Год гістарычнай памяці» пры ўдзеле Міністра культуры Рэспублікі Беларусь А. Маркевіча.



*Дадатак № 8*
*Табліца 8*

**СТАН БІБЛІЯТЭЧНЫХ ФОНДАЎ**

| ЦБС | **ФОНД** на канец 2021 года | **ПАСТУПІЛА Ў 2022** | | |
|---|---|---|---|---|
| | | усяго | СЗЛ | агучанай літ. |
| Бешанковіцкая | 182371 | 8256 | 500 | 6 |
| Браслаўская | 175439 | 6073 | 1253 | 19 |
| Верхнядзвінская | 127249 | 5161 | 649 | 22 |
| Віцебская | 279247 | 5034 | 870 | 0 |
| Глыбоцкая | 282106 | 10617 | 658 | 30 |
| Гарадоцкая | 175089 | 6546 | 824 | 20 |
| Докшыцкая | 199861 | 7136 | 1406 | 68 |
| Дубровенская | 171692 | 6690 | 754 | 0 |
| Лепельская | 180857 | 8141 | 853 | 6 |
| Лёзненская | 113742 | 4548 | 923 | 12 |
| Мёрская | 147995 | 5445 | 836 | 2 |
| Аршанская | 723486 | 24180 | 2190 | 91 |
| Полацкая | 517607 | 20892 | 2074 | 78 |
| Пастаўская | 204609 | 7690 | 1589 | 7 |
| Расонская | 93032 | 3585 | 195 | 10 |
| Сенненская | 195158 | 5804 | 898 | 9 |
| Талачынская | 152799 | 6163 | 359 | 22 |
| Ушацкая | 145428 | 4033 | 646 | 17 |
| Чашніцкая | 251022 | 7648 | 1022 | 20 |
| Шаркаўшчынская | 142823 | 5528 | 505 | 10 |
| Шумілінская | 115719 | 4504 | 1412 | 0 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **4577331** | **163674** | **20416** | **449** |
| г.Віцебск | 734098 | 18096 | **3908** | 181 |
| г.Наваполацк | 400398 | 9953 | 847 | 71 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **1134496** | **28049** | **4755** | **252** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **5711827** | **191723** | **25171** | **701** |
| Абласная б-ка | 679643 | 9696 | 576 | 160 |
| **УСЯГО** | **6391470** | **201419** | **25747** | **861** |

| ЦБС | ДАКУМЕНТАВЫДАЧА | | | |
|---|---|---|---|---|
| | пл./мін да 2021 | у сярэд. на б-ку | Абарачаль-насць 2022 | Кнігазабяспе-чанасць 2022 |
| Бешанковіцкая | 5 026 | 13007 | 0,9 | 21,3 |
| Браслаўская | -4 951 | 15098 | 1,1 | 18,6 |
| Верхнядзвінская | -2 234 | 10709 | 1,5 | 12,3 |
| Віцебская | -12 141 | 12283 | 1,0 | 19,3 |
| Глыбоцкая | -27 306 | 12747 | 1,1 | 17,3 |
| Гарадоцкая | -13 320 | 15833 | 1,3 | 13,6 |
| Докшыцкая | -19 359 | 11748 | 1,1 | 15,8 |
| Дубровенская | -8 326 | 9105 | 0,9 | 19,1 |
| Лепельская | 3 436 | 18776 | 1,7 | 12,7 |
| Лёзненская | 1 538 | 9293 | 1,2 | 14,7 |
| Мёрская | -5 487 | 9860 | 1,3 | 13,9 |
| Аршанская | 6 821 | 28408 | 1,3 | 15,3 |
| Полацкая | 19 563 | 23417 | 1,6 | 11,3 |
| Пастаўская | -6 276 | 10946 | 1,0 | 18,3 |
| Расонская | -6 063 | 13481 | 1,4 | 18,3 |
| Сенненская | -15 185 | 14113 | 1,1 | 18,2 |
| Талачынская | -6 686 | 11623 | 1,2 | 14,7 |
| Ушацкая | -25 793 | 12740 | 1,2 | 12,4 |
| Чашніцкая | -67 876 | 17209 | 1,2 | 15,9 |
| Шаркаўшчынская | -6 969 | 10149 | 1,1 | 15,6 |
| Шумілінская | -33 033 | 12678 | 1,6 | 11,8 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **-224 621** | **15084** | **1,3** | **15,1** |
| г.Віцебск | 42 409 | 59110 | 1,3 | 11,8 |
| г.Наваполацк | -98 491 | 63103 | 1,1 | 13,5 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **-56 082** | **60325** | **1,2** | **12,3** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **-280 703** | **17745** | **1,3** | **14,5** |
| Абласная б-ка | -20 504 | **667512** | 1,0 | 20,5 |
| **УСЯГО** | **-301 207** | **19403** | **1,2** | **14,9** |
| 2021 год | | 18827 | 1,2 | 14,9 |



**Дыялогавыя пляцоўкі** пры ўдзеле старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў У.Цярэнцева адбыліся на базе Кіраўскай бібліятэкі Віцебскай РЦБС і ў Сенненскай цэнтральнай раённай бібліятэцы. Значэнне гісторыка-культурнай спадчыны рэгіёнаў, выхаванне патрыятызму ў моладзі абмяркоўваліся падчас **круглых сталоў** «Гісторыя нас аб’ядноўвае» (Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк), «Моладзь і патрыятызм: грані ўзаемадзеяння» (Чашніцкая РЦБС), «Мы будзем вечна памятаць подзвіг герояў-землякоў» (Верхнядзвінская ЦБС) і інш.

Тэматыцы Года гістарычнай памяці прысвячаліся **выставы архіўных дакументаў, кніжныя і мастацкія выставы**. У цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя М.Горкага ЦБС г. Віцебска створана інтэрактыўная выстава аб помніках воінам-абаронцам часоў Вялікай Айчыннай вайны «Віцебск. Старонкі гісторыі». Ва ўстановах культуры Браслаўскага раёна на працягу года працаваў перасоўны выставачны праект «2022 – Год гістарычнай памяці», арганізаваны Браслаўскім раённым аб’яднаннем музеяў і ЦБС Браслаўскага раёна. У Кіраўскай сельскай бібліятэцы Віцебскай РЦБС да Дня Перамогі была прэзентавана мастацкая выстава «Вялікая Айчынная вайна ў творах віцебскіх мастакоў». У цэнтральнай раённай бібліятэцы Верхнядзвінскай ЦБС была прадстаўлена ўнікальная фотавыстава «Захоўваем памяць. Ганарымся Перамогай», на якой экспанаваліся сучасныя фотаздымкі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і фотаздымкі іх маладосці і ваенных часоў. ЦБС г.Наваполацка сумесна з гарадскім музеем і рэдакцыяй газеты «Наваполацк сёння» арганізавалі да Дня горада перасоўную выставу архіўных дакументаў, фотадакументаў і выданняў па гісторыі горада «Горад мары». 10 верасня 2022 года ў дзень горада Чашнікі цэнтральнай бібліятэкай арганізавана выстава «Генацыд у Беларусі. Памяць не памірае», Выстава стала вынікам раённага конкурсу-выставы творчых работ «Памяць і боль беларускай зямлі», у якім прынялі ўдзел творчыя калектывы і аматарскія аб’яднанні, работнікі ўстаноў культуры, адукацыі і прадпрыемстваў горада і раёна. Конкурс праводзіўся па наступных намінацыях: «Дэкаратыўнае пано», «Сюжэтная кампазіцыя», «Кніга Памяці і Смутку».

Правядзенне мерапрыемстваў, прысвечаных **датам населеных пунктаў** садзейнічала захаванню памяці аб іх стварэнні і развіцці.

Супрацоўнікамі Полацкай РЦБС да *1160-годдзя Полацка* была арганізавана бібліятэчная пляцоўка, на якой выступалі паэты і творчыя калектывы рэгіёна. У насычанай і разнастайнай праграме былі кніжныя і ілюстраваныя выстаўкі, творчая лабараторыя «Малюем сімвалы Радзімы», акцыя «100 прычын, чаму я люблю Полацк», майстар-класы па каліграфіі і маляванні на тканіне, музычныя, паэтычныя нумары.

Цэнтральная раённая бібліятэка да *575-годдзя* з першага ўпамінання ў гістарычных крыніцах г.п. Бешанковічы рэалізавала праект «Маёй сілы крыніца – родны край – Бешанковічы», у рамках якога праведзена 11 мерапрыемстваў, падрыхтавана 4 выданні (буклет «Партрэт героя» да 100-годдзя з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза М.Ткачонка,

зборнік артыкулаў «Листая прошлого страницы», набор паштовак «Путешествие по Бешенковичам», бюлетэнь «У назве кожнай вуліцы свая гісторыя»). На гарадскім свяце, прысвечаным гэтай даце, цэнтральная раённая бібліятэка прыняла актыўны ўдзел з акцыяй «Маё мястэчка. Мая вуліца. Мой дом». На афармленым бібліятэкай стэндзе была размешчана карта з вуліцамі і дамамі, а таксама кароткая інфармацыя аб людзях, у гонар якіх названы вуліцы. Падчас рэалізацыі праекта адбылася прэзентацыя навукова-папулярнай кнігі «Нарысы Бешанковіцкага краю», якая выйшла ў выдавецтве «Беларусь». Над яе стварэннем працавала вялікая колькасць неабыякавых людзей. Дапамогу аўтарам – Анатолю Крачкоўскаму, Максіму Чарняўскаму, Станіславу Леаненку, Аляксандру Вашанаву, Міхаілу Чарняўскаму і Марыне Біруковай – аказалі супрацоўнікі раённага выканаўчага камітэта, раённага Савета дэпутатаў, устаноў і арганізацый горада. На прэзентацыі перад прысутнымі выступілі прадстаўнікі ўлады раёна, аўтары тэкстаў, фатографы.

Супрацоўнікі Сенненскай ЦБС прынялі ўдзел у раённым свяце, *прысвечаным 580-годдзю* роднага горада. Ля цэнтральнай бібліятэкі разгарнулася фотагалерэя «У аб’ектыве – горад з гісторыяй», арганізавана выстава карцін В.Бандарэвіча, прайшоў святочны канцэрт.

21 мая ў філіяле «Чкалаўская гарпасялковая бібліятэка» Лёзненскай ЦБС адбылося ўрачыстае **адкрыццё мемарыяльнай дошкі,** а таксама **гістарычнага пакою**, прысвечанага працоўнай дзейнасці **прадпрыемства «Сельгастэхніка»**.

Бібліятэкі раскрывалі сваю дзейнасць па патрыятычным выхаванні і грамадзянскім станаўленні асобы ў доўгатэрміновых **праграмах і праектах**. Вялася праца над праектамі ЦБС г. Віцебска «Віцебск: старонкі гісторыі», «Лёсы Перамогі», «Час Мужнасці». Грамадзянска-патрыятычны праект «Жыву ў Беларусі і тым ганарусся» ладзіла ЦБС Браслаўскага раёна сумесна з установамі адукацыі г. Браслава. У сакавіку Аршанскай ЦБС створана камбінаваная **краязнаўчая база даных «Гонар Аршанскай зямлі – пісьменнікі Галіна і Сяргей Трафімавы»**. У рамках праекта «Адкрывай свой родны край», прысвечанага пісьменніку Я.Сіпакову, створаны альбом «Жыццёвы шлях у фотаздымках», праведзены конкурс малюнкаў, а таксама конкурс сачыненняў і эсэ па кнігах пісьменніка. Працягвае рэалізацыю праект па стварэнні базы даных «Кнігі з бібліятэкі Я.Сіпакова з аўтографамі вядомых беларускіх пісьменнікаў», які генерыруецца цэнтральнай бібліятэкай імя А.С.Пушкіна, Зубрэвіцкай сельскай бібліятэкай імя Я.Сіпакова і Зубрэвіцкай сярэдняй школай Аршанскага раёна.

Віцебская РЦБС падрыхтавала да друку **бібліяграфічны паказальнік «Віцебскія Хатыні»**, прысвечаны спаленым вёскам. У Віцебскім раёне гітлераўцы правялі 8 буйных карных экспедыцый, у ходзе якіх было поўнасцю знішчана 160 вёсак, расстраляна, спалена жывымі і закатавана 8 408 жыхароў. Паказальнік знаёміць чытача з літаратурай, якая адлюстроўвае падзеі Вялікай Айчыннай вайны ў рэгіёне.



*Дадатак № 7*
*Табліца 7*

**ДАКУМЕНТАВЫДАЧА**

| ЦБС | Фонд 2022 | +/- да 2021 | ДАКУМЕНТАВЫДАЧА | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Выканана 2021 | План 2022 | Выканана / Факт | % выкан. |
| Бешанковіцкая | 183 303 | 932 | 164 068 | 147 500 | 169 094 | 114,6 |
| Браслаўская | 172 577 | -2862 | 201 223 | 193 000 | 196 272 | 101,7 |
| Верхнядзвінская | 120 552 | -6697 | 184 288 | 176 470 | 182 054 | 103,2 |
| Віцебская | 264 840 | -14407 | 282 377 | 268 080 | 270 236 | 100,8 |
| Глыбоцкая | 278 930 | -3176 | 333 225 | 302 080 | 305 919 | 101,3 |
| Гарадоцкая | 164 999 | -10090 | 234 983 | 217 000 | 221 663 | 102,1 |
| Докшыцкая | 194 879 | -4982 | 242 567 | 224 000 | 223 208 | 99,6 |
| Дубровенская | 165 001 | -6691 | 163 117 | 136 400 | 154 791 | 113,5 |
| Лепельская | 175 265 | -5592 | 296 982 | 286 500 | 300 418 | 104,9 |
| Лёзненская | 113 727 | -15 | 137 859 | 139 350 | 139 397 | 100,0 |
| Мёрская | 137 317 | -10678 | 182 970 | 170 215 | 177 483 | 104,3 |
| Аршанская | 719 633 | -3853 | 959 064 | 940 000 | 965 885 | 102,8 |
| Полацкая | 507 790 | -9817 | 800 046 | 800 000 | 819 609 | 102,5 |
| Пастаўская | 203 508 | -1101 | 214 258 | 199 300 | 207 982 | 104,4 |
| Расонская | 88 296 | -4736 | 127 395 | 123 200 | 121 332 | 98,5 |
| Сенненская | 190 121 | -5037 | 226 885 | 210 700 | 211 700 | 100,5 |
| Талачынская | 142 200 | -10599 | 181 036 | 176 120 | 174 350 | 99,0 |
| Ушацкая | 94 203 | -51225 | 140 454 | 116 300 | 114 661 | 98,6 |
| Чашніцкая | 232 003 | -19019 | 343 216 | 272 100 | 275 340 | 101,2 |
| Шаркаўшчынская | 130 810 | -12013 | 149 052 | 131 420 | 142 083 | 108,1 |
| Шумілінская | 109 333 | -6386 | 210 525 | 165 000 | 177 492 | 107,6 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **4389287** | **-188044** | **577590** | **5394735** | **5550969** | **102,9** |
| г.Віцебск | 741 084 | 6986 | 903 354 | 945 750 | 945 763 | 100,0 |
| г.Наваполацк | 394 723 | -5675 | 540 213 | 441 000 | 441 722 | 100,2 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **1135807** | **1311** | **1443567** | **1386750** | **1387485** | **100,1** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **5525094** | **-186733** | **7219157** | **6781485** | **6938454** | **102,3** |
| Абласная б-ка | 674 180 | **-5463** | 688 016 | 700 000 | 667 512 | 95,4 |
| **УСЯГО** | **6199274** | **-192196** | **7907173** | **7481485** | **7605966** | **101,7** |
| 2021 год | | | | | | 99,4 |

*Працяг табліцы 6*

| ЦБС | Насельніцтва | Заданне (Культура Беларусі) | Факт | НАВЕДВАННІ | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | пл./ мін. да 2021 | у сярэд. на б-ку | Наведвальнасць 2022 |
| Бешанковіцкая | 13913 | 6014 | 6422 | 22 | 6421 | 9,7 |
| Браслаўская | 23735 | 3582 | 3592 | -1 792 | 6366 | 8,9 |
| Верхнядзвінская | 19518 | 3665 | 4237 | 2 089 | 4456 | 7,8 |
| Віцебская | 34821 | 3368 | 3455 | -1 439 | 5241 | 8,4 |
| Глыбоцкая | 34094 | 3527 | 3965 | -1 900 | 5057 | 7,5 |
| Гарадоцкая | 21117 | 4826 | 5242 | -1 503 | 6969 | 8,1 |
| Докшыцкая | 21424 | 5574 | 5806 | -4 785 | 5673 | 8,7 |
| Дубровенская | 13730 | 5932 | 6423 | -4 909 | 5144 | 10,1 |
| Лепельская | 31059 | 3688 | 3858 | -614 | 7292 | 8,4 |
| Лёзненская | 15354 | 4473 | 6518 | 3 894 | 4871 | 9,5 |
| Мёрская | 18358 | 4265 | 4376 | 676 | 4262 | 7,8 |
| Аршанская | 143725 | 2313 | 2519 | 897 | 9257 | 6,7 |
| Полацкая | 100848 | 3369 | 3748 | -2 932 | 10076 | 7,8 |
| Пастаўская | 33010 | 3536 | 3886 | 6 599 | 4920 | 8,4 |
| Расонская | 8730 | 4954 | 5257 | -2 513 | 4628 | 8,7 |
| Сенненская | 19694 | 5413 | 5749 | 1 736 | 7108 | 10,2 |
| Талачынская | 22745 | 3153 | 3548 | -738 | 4486 | 6,9 |
| Ушацкая | 12056 | 4354 | 4558 | -4 051 | 5637 | 6,7 |
| Чашніцкая | 27635 | 5904 | 6103 | -27 425 | 7438 | 8,2 |
| Шаркаўшчынская | 13847 | 5117 | 5577 | -3 615 | 4899 | 8,2 |
| Шумілінская | 16819 | 6127 | 6520 | -2 207 | 6920 | 10,5 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **646232** | | | **-44 510** | **6385** | **8,1** |
| г.Віцебск | 360419 | 1426 | 1458 | 16 720 | 28174 | 7,2 |
| г.Наваполацк | 97182 | 2305 | 2410 | 11 521 | 26885 | 6,5 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **457601** | | | **28 241** | **27782** | **6,9** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **1103833** | | | **-16 269** | **7643** | **7,8** |
| Абласная б-ка | 360419 | 1655 | 2103 | 358 092 | 146872 | 4,5 |
| **УСЯГО** | **1103833** | **4553** | **5197** | **341 823** | **7999** | **7,6** |
| 2021 год | 1120364 | 4292 | 4815 | | 7514 | 7,4 |



## *Дзяржаўныя святы і памятныя даты*

У бібліятэках вобласці да *Дня Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь* афармляліся пастаянна дзеючыя выставы, адбываліся гутаркі аб сімвалах, тэматычныя вечары з удзелам падрастаючага пакалення: «Сімвалы адзінства і славы», «У сімвалах – гісторыя краіны», «Сваю сімволіку ведай і беражы» і інш.

Для розных катэгорый карыстальнікаў да *Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь* былі праведзены прававыя гадзіны, гутаркі, віктарыны. У бібліятэцы імя У.Караткевіча ЦБС г.Наваполацка на працягу тыдня праходзіла **серыя дзелавых гульняў** «Закон пра мяне, мне пра закон» і турнір юных праваахоўнікаў «З маленства ведай свае правы».

Да *Дня Перамогі* ў Вялікай Айчыннай вайне ў бібліятэках вобласці было арганізавана больш за 50 патрыятычных акцый, 345 кніжных выстаў, праведзена больш за 450 тэматычных мерапрыемстваў (канцэрты, літаратурна-музычныя і тэатралізаваныя кампазіцыі, урокі мужнасці, квэсты, віктарыны).

У бібліятэках ЦБС г. Віцебска сумесна з установамі адукацыі традыцыйна прайшла акцыя памяці ўсіх загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны «Дзень белых жураўлёў». Для вучняў сярэдніх школ горада праведзены марафон памяці «Я раскажу вам аб вайне» (бібліятэка імя С.Маршака), літаратурна-музычная кампазіцыя «Праздник со слезами на глазах» (бібліятэка імя Л.Талстога). У цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя М.Горкага адбылася **прэзентацыя кнігі члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Андрэя Герашчанкі «Бельчонок»**. Трэба адзначыць, што прэзентацыі кнігі для дзяцей праведзены таксама ў Віцебскай абласной бібліятэцы пры ўдзеле аўтара і ў ЦБС г.Наваполацка, дзе была арганізавана сустрэча з выдаўцамі і мастаком-ілюстратарам выдання.

7 мая ў рамках паэтычнага open-air «Стихи над городом» на пляцоўцы ля памятнага знака «Полацк – геаграфічны цэнтр Еўропы» прайшла **літаратурна-музычная кампазіцыя «Перамога. Адна на ўсіх»** з удзелам пісьменнікаў і калектываў мастацкай самадзейнасці. У гарадскім **конкурсе чытальнікаў паэзіі «Войны победная строка»**, арганізаваным ЦБС г.Наваполацка сумесна з грамадскім аб'яднаннем «Белая Русь», прынялі ўдзел прадстаўнікі ўсіх навучальных устаноў горада.

Цэнтральныя бібліятэкі вобласці прымалі ўдзел у раённых святах, прысвечаных Дню Перамогі. Супрацоўнікі Аршанскай ЦБС арганізавалі ў гарадскім парку **бібліялакацыю «Подзвігу доблесці слава і гонар!»**, дзе былі прадстаўлены кніжныя выставы, праводзіліся акцыі, гульні, конкурсы, арганізаваны фотазона і арт-студыя.

*Дню ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа* быў прысвечаны **аўтапрабег «Памятныя мясціны Заронаўскага сельскага Савета»**, які здзейснілі бібліятэка з актывам чытачоў сумесна з музеем «Гісторыя Заронаўскага краю». Удзельнікі вандроўкі наведалі 9 воінскіх пахаванняў у розных вёсках Віцебскага раёна, ушанавалі памяць загінуўшых, усклалі кветкі. Экскурсаводам

аўтапрабега з’явілася Людміла Нікіціна, кіраўнік музея, якая расказала пра гісторыю ўзнікнення кожнага воінскага пахавання і вызвалення вёскі Заронава.

Да *Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь* дзеці са спартыўна-аздараўленчага лагера ТАК «Лосвіда» разам з бібліятэкарам Прудніцкай сельскай бібліятэкі Гарадоцкага раёна адправіліся ў **пешы паход «Подвиг ценою в жизнь»**. Першым пунктам прызначэння стаў абеліск, устаноўлены ў вёсцы Пруднікі ў гонар аб 300 земляках, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Працягнуўся шлях удзельнікаў пахода да Алеі Герояў у Гарадку і абноўленага мемарыяльнага комплексу «Пантэон памяці» ва ўрочышчы Вараб’ёвы горы.

Да *Дня народнага адзінства* ў Цэнтральнай бібліятэцы імя У.Маякоўскага ЦБС г.Наваполацка адкрылася **інтэрактыўная выстава «Подвиги и судьбы партизан в документах»**, заснаваная на дакументах і матэрыялах сумеснага маштабнага інтэрнэт-праекта выдавецкага дома «Беларусь сегодня» і Нацыянальнага архіва Беларусі «Партизаны Беларуси», дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў. На выставе былі прадстаўлены гістарычныя фатаграфіі часоў Вялікай Айчыннай вайны, узнагародныя лісты і баявыя характарыстыкі партызан і падпольшчыкаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны. Праз інтэрактыўны стэнд можна было знайсці інфармацыю аб сваіх гераічных продках з ліку партызан і падпольшчыкаў. З 22 па 29 верасня супрацоўнікамі бібліятэкі праведзена 23 экскурсіі для навучэнцаў 6–11-х класаў адукацыйных устаноў г. Наваполацка, членаў ваенна-патрыятычнага клуба «Сокал», маладых спецыялістаў ААТ «Нафтан», завода «Палімір».

Бібліятэкі Шаркаўшчынскага раёна арганізавалі і правялі літаратурна-патрыятычны марафон «Мы адзін народ – у нас адна краіна» (цэнтральная раённая бібліятэка), літаратурна-гістарычную гульню «Беларусь і беларусы» (Германавіцкая сельская бібліятэка), тэматычны ўрок «Адзінствам моцныя! (Більдзюгская сельская бібліятэка), гутарку-дыялог «У адзінстве – сіла» (Радзюкоўская сельская бібліятэка).

## *Мерапрыемствы да 140-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа*

2 ліпеня 2022 года Аршаншчына сустракала шаноўных сяброў і ганаровых гасцей на **свяце паэзіі ў Ляўках «Купала заўсёды ў сэрцы маім»**, прысвечанага 140-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы. Гасцей было шмат – гэта вядомыя пісьменнікі, паэты, публіцысты з Мінска, Віцебска, Магілёва, Оршы, Горак і Смаленска. На свята паэзіі завіталі старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Тамара Краснова-Гусачэнка, а таксама Іна Фралова, Ірына Карнавухава, Святлана Бахнова, Хрысціна Зайцава, пісьменнікі-землякі Сяргей і Галіна Трафімавы, паэты з Магілёва Жана Міус (Жана Усцінава), Алена Любчанка. Прывітальнымі спевамі і духмяным караваем сустракалі ганаровых гасцей удзельнікі народнага



*Дадатак № 6*
*Табліца 6*

**НАВЕДВАННІ**

| ЦБС | НАВЕДВАННІ | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Выканана 2021 | План 2022 | Выканана / Факт | Рэальныя | у т.л. вірт. | % выкан. |
| Бешанковіцкая | 89 328 | 87 815 | 89 350 | 83 470 | 5 880 | 101,7 |
| Браслаўская | 87 057 | 88 110 | 85 265 | 82 756 | 2 509 | 96,8 |
| Верхнядзвінская | 80 617 | 74 765 | 82 706 | 75 750 | 6 956 | 110,6 |
| Віцебская | 121 755 | 120 240 | 120 316 | 115 292 | 5 024 | 100,1 |
| Глыбоцкая | 137 095 | 131 100 | 135 195 | 121 379 | 13 816 | 103,1 |
| Гарадоцкая | 112 198 | 104 450 | 110 695 | 97 568 | 13 127 | 106,0 |
| Докшыцкая | 129 175 | 122 000 | 124 390 | 107 786 | 16 604 | 102,0 |
| Дубровенская | 93 102 | 83 440 | 88 193 | 87 444 | 749 | 105,7 |
| Лепельская | 120 455 | 117 110 | 119 841 | 116 675 | 3 166 | 102,3 |
| Лёзненская | 96 188 | 91 225 | 100 082 | 73 070 | 27 012 | 109,7 |
| Мёрская | 79 662 | 81 590 | 80 338 | 76 721 | 3 617 | 98,5 |
| Аршанская | 361 163 | 341 900 | 362 060 | 314 745 | 47 315 | 105,9 |
| Полацкая | 380 955 | 348 000 | 378 023 | 352 668 | 25 355 | 108,6 |
| Пастаўская | 121 680 | 122 000 | 128 279 | 93 489 | 34 790 | 105,1 |
| Расонская | 48 410 | 45 750 | 45 897 | 41 648 | 4 249 | 100,3 |
| Сенненская | 111 476 | 113 130 | 113 212 | 106 614 | 6 598 | 100,1 |
| Талачынская | 81 446 | 75 680 | 80 708 | 67 289 | 13 419 | 106,6 |
| Ушацкая | 59 001 | 55 300 | 54 950 | 50 736 | 4 214 | 99,4 |
| Чашніцкая | 196 080 | 167 450 | 168 655 | 119 006 | 49 649 | 100,7 |
| Шаркаўшчынская | 80 833 | 74 710 | 77 218 | 68 592 | 8 626 | 103,4 |
| Шумілінская | 111 860 | 107 000 | 109 653 | 96 874 | 12 779 | 102,5 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **2699536** | **2552765** | **2655026** | **2349572** | **305454** | **104,0** |
| г.Віцебск | 508 933 | 517 565 | 525 653 | 450 787 | 74 866 | 101,6 |
| г.Наваполацк | 222 694 | 227 700 | 234 215 | 188 193 | 46 022 | 102,9 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **731627** | **745265** | **759868** | **638980** | **120888** | **102,0** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **3431163** | **3298030** | **3414894** | **2988552** | **426342** | **103,5** |
| Абласная б-ка | 1963809 | 1876000 | 2321901 | 146872 | 2175029 | 123,8 |
| **УСЯГО** | **5394972** | **5174030** | **5736795** | **3135424** | **2601371** | **110,9** |
| 2021 год | | | 5394972 | 3155781 | 2239191 | 109,8 |

*Працяг табліцы 5*

| ЦБС | КАРЫСТАЛЬНІКІ | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | % выкан. | пл./ мін. да 2021 | у сярэд. на б-ку | чыталь-насць 2022 | % ахопу насельн. |
| Бешанковіцкая | 99,1 | -61 | 662 | 19,7 | 61,8 |
| Браслаўская | 89,7 | -1 357 | 713 | 21,2 | 39,0 |
| Верхнядзвінская | 100,4 | -352 | 575 | 18,6 | 50,0 |
| Віцебская | 98,3 | -598 | 623 | 19,7 | 39,4 |
| Глыбоцкая | 99,3 | -1 616 | 670 | 19,0 | 47,2 |
| Гарадоцкая | 103,8 | -227 | 864 | 18,3 | 57,3 |
| Докшыцкая | 98,6 | -843 | 650 | 18,1 | 57,6 |
| Дубровенская | 115,2 | 223 | 507 | 18,0 | 62,8 |
| Лепельская | 100,5 | -173 | 866 | 21,7 | 44,6 |
| Лёзненская | 96,2 | -305 | 514 | 18,1 | 50,2 |
| Мёрская | 102,1 | -601 | 549 | 18,0 | 53,8 |
| Аршанская | 100,5 | 213 | 1380 | 20,6 | 32,6 |
| Полацкая | 100,6 | -1 575 | 1289 | 18,2 | 44,8 |
| Пастаўская | 101,2 | -199 | 584 | 18,7 | 33,6 |
| Расонская | 90,1 | -397 | 535 | 25,2 | 55,1 |
| Сенненская | 100,5 | -567 | 697 | 20,3 | 53,1 |
| Талачынская | 98,2 | -316 | 646 | 18,0 | 42,6 |
| Ушацкая | 96,8 | -970 | 844 | 15,1 | 63,0 |
| Чашніцкая | 100,7 | -3 633 | 912 | 18,9 | 52,8 |
| Шаркаўшчынская | 102,1 | -360 | 600 | 16,9 | 60,7 |
| Шумілінская | 98,1 | -943 | 660 | 19,2 | 54,9 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **99,9** | **-14 657** | **788** | **19,2** | **44,9** |
| г.Віцебск | 99,6 | -222 | 3926 | 15,1 | 17,4 |
| г.Наваполацк | 100,0 | 456 | 4166 | 15,1 | 30,0 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **99,7** | **234** | **3999** | **15,1** | **20,1** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **99,9** | **-14 423** | **977** | **18,2** | **34,6** |
| Абласная б-ка | 95,6 | -44 | 32871 | 20,3 | 9,1 |
| **УСЯГО** | **99,5** | **-14 467** | **1058** | **18,3** | **37,6** |
| 2021 год | | | 1018 | 18,5 | 38,2 |



калектыву народнай музыкі і песні «Выцінанка» на тэрыторыі Купалаўскага мемарыяльнага запаведніка «Ляўкі» Аршанскага раёна. Нацыянальнымі стравамі і прысмакамі гасцей мерапрыемства частавалі народныя аматарскія аб’яднанні – «Надзея» Андрэеўшчынскай сельскай бібліятэкі-клуба, «Пралеска» Дачнінскай сельскай бібліятэкі, «Жаночыя сакрэты» Вусценскай сельскай бібліятэкі і народнае аматарскае аб’яднанне «Гаспадынька» ДУК «Аршанскі раённы Цэнтр культуры». Падчас мерапрыемства госці ў чарговы раз прайшліся сцежкамі-дарожкамі Купалы, дакрануліся да залацінак і россыпаў яго твораў, адчулі асалоду роднага слова. Нечаканасцю для гасцей стаў выхад на сцэну дзвух сціплых жанчын, унучкі Якуба Коласа *Веры Данілаўны Міцкевіч* – літаратуразнаўцы, малодшага навуковага супрацоўніка НАН Беларусі і праўнучкі *Якуба Коласа Васіліны Валер’еўны Міцкевіч* – галоўнага захавальніка фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. Жанчыны падзяліліся ўспамінамі аб тым, што на лецішчы Купалы часта адпачываў іх продак – Якуб Колас. На галоўнай сцэне адбыўся святочны канцэрт дзяржаўнага вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры», народнага калектыву народнай музыкі і песні «Гагарынскія музыкі» і народнага хора ДУК «Аршанскі гарадскі Палац культуры «Орша». Бібліятэкамі Аршанскага раёна да юбілею Янкі Купалы і Якуба Коласа праведзены **сеткавая акцыя «Мой Купала»,** літаратурна-музычныя вечарыны «Купала і Колас – народа душа і голас», «Паклон ад нас прыміце, песняры» і інш.

Бібліятэка імя Я. Коласа ЦБС г. Наваполацка арганізавала **літаратурны брэнд-фестываль «Якуб Колас FEST»**, які аб’яднаў шэраг мерапрыемстваў. 23 чэрвеня праведзены гарадскі творчы конкурс юных чытальнікаў «Коласаўскімі сцежкамі». У мерапрыемстве прынялі ўдзел 29 юных навапалачан з 15 устаноў дашкольнай адукацыі. Хлопчыкі і дзяўчынкі ва ўзросце ад 4 да 7 гадоў чыталі творы Якуба Коласа. У сценах бібліятэкі гучала прыгожая беларуская мова. Кожны юны чытальнік атрымаў асабісты сертыфікат за ўдзел у конкурсе, салодкі падарунак і дзіцячую кнігу. На працягу года ў бібліятэцы адбыўся бібліяквэст «КолАссальная игра». Праходзячы жыццёвымі і творчымі шляхамі Якуба Коласа, удзельнікі гульні спазнавалі свет беларускай культуры, традыцый і нацыянальных асаблівасцей. У гонар песняроў-юбіляраў была арганізавана вулічная акцыя «Горад чытае Коласа і Купалу». Навапалачане дэкламавалі ўрыўкі з твораў класікаў, знаходзілі адказы на пытанні эрудыт-віктарыны, адкрывалі для сябе новыя творы і гістарычныя факты, звязаныя з жыццёвым і творчым шляхам пісьменнікаў. Дзіцячая бібліятэка імя А. Пушкіна абвясціла **анлайн-марафон «Дзеці чытаюць Купалу і Коласа»**, у якім прынялі ўдзел юныя чытачы бібліятэкі з відэаролікамі, што былі размешчаны на старонцы бібліятэкі ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте».

### ***Літаратурныя фестывалі, акцыі, конкурсы, вечарыны, творчыя сустрэчы з пісьменнікамі***

У маі адбыўся **ІІ фестываль Васіля Цяпінскага ў Чашніцкім раёне**. Культурны форум тут праходзіць другі год і набывае ўсё большыя маштабы, сур'ёзна прэтэндуючы на тое, каб стаць брэндам раёна. Сёлета на адзін дзень горад ператварыўся ў вялікую святочную пляцоўку з гістарычнай складаючай. Варта адзначыць, што фестываль двухдзённы: яго першую частку арганізуюць на радзіме друкара і гуманіста – у вёсцы Цяпіна. Уласна, тут і бярэ пачатак ініцыятыва, якая перарасла ў вялікае свята. Штогод вяскоўцы робяць крокі насустрач сваёй мары: зрабіць малую радзіму Васіля Цяпінскага месцам прыцягнення літаратараў, гісторыкаў, турыстаў. Асноўныя мерапрыемствы разгарнуліся менавіта ў гістарычным цэнтры Чашнікаў. Тут арганізавалі конкурс-дэфіле касцюмаў, прэзентацыю ручнікоў, карнавальных масак і веераў, тэатралізацыю, канцэрт творчых калектываў і шмат іншага.

У рамках святочных мерапрыемстваў праведзены раённы патрыятычны конкурс «Наша будучыня ў нашым мінулым», на якім выконваліся вершы і ўрыўкі з паэтычных твораў, прысвечаныя гераічным старонкам гісторыі Беларусі. На фестывалі працавала тэматычная пляцоўка «Бібліятэчны сквер», падрыхтаваная супрацоўнікамі цэнтральнай раённай і дзіцячай бібліятэк. Яна ўключала тэматычныя зоны «Лаўка краязнаўцы», «Фотаатэльe», «Літаратурная паляна», «Бібліятэчная крама сувеніраў».

У «Лаўцы краязнаўца» жадаючым прапаноўвалася прыняць удзел у інтэрактыўнай віктарыне «Знайдзі на карце раёна…» і гульні-галаваломцы «Брэнд Чашніччыны». Зрабіць фота і сэлфі можна было ў салоне «Фотаатэлье». Актыўна ўдзельнічалі жыхары горада ў разгадванні крыжаванкі «Яго імя ў гісторыі краю». У «Бібліятэчнай краме сувеніраў» былі выстаўленыя цацкі, выраблeныя рукамі бібліятэкараў, якія можна было набыць. Для дзяцей на свяце працавала «Літаратурная паляна» з краязнаўчай настольнай інтэрактыўнай гульнёй, віктарынамі і конкурсамі. Выстаўка малюнкаў чытачоў бібліятэкі «Чытаем актыўна – творым крэатыўна» ўключала работы казачных герояў.

У чэрвені Полацк аб'яднаў пісьменнікаў і паэтаў з 14 краін свету. Прэзентацыі кніг і зборнікаў, творчыя пляцоўкі, адкрыты мікрафон, экскурсіі, круглыя стол, майстар-класы, выставы-продажы выдавецкай прадукцыі – такім запомніўся яго ўдзельнікам **V літаратурны форум «Цэнтр Еўропы»** з міжнародным удзелам, вочны этап якога прайшоў у рамках святкавання 1160-годдзя Полацка. Удзел у ім узялі больш за 80 літаратараў з Беларусі і Расіі. На працягу двух дзён удзельнікі форуму з раніцы да позняга вечара абменьваліся вопытам, натхняліся творчасцю, спаборнічалі па пяці намінацыях на прыз сімпатый гледачоў, чыталі свае творы ў рамках правядзення паэтычнага open-air «Вершы над горадам» на адкрытай пляцоўцы каля памятнага знака «Полацк – геаграфічны цэнтр Еўропы». Падарункам для ўдзельнікаў і гасцей сталі сустрэчы з Тамарай Красновай-Гусачэнка і Віктарам Нікіціным.





**КАРЫСТАЛЬНІКІ**

| ЦБС | 2022 | Кольк. жыхароў (тыс.) | Выканана 2021 | КАРЫСТАЛЬНІКІ | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | План 2022 | Выканана / Факт | Рэальныя | у т.л. вірт. |
| Бешанковіцкая | 13 | 13913 | 8 806 | 8 825 | 8 745 | 8600 | 145 |
| Браслаўская | 13 | 23735 | 10 620 | 10 330 | 9 263 | 9263 | 0 |
| Верхнядзвінская | 17 | 19518 | 10 955 | 10 560 | 10 603 | 9767 | 836 |
| Віцебская | 22 | 34821 | 14 305 | 13 940 | 13 707 | 13707 | 0 |
| Глыбоцкая | 24 | 34094 | 17 932 | 16 435 | 16 316 | 16085 | 231 |
| Гарадоцкая | 14 | 21117 | 12 799 | 12 110 | 12 572 | 12101 | 471 |
| Докшыцкая | 19 | 21424 | 13 469 | 12 800 | 12 626 | 12342 | 284 |
| Дубровенская | 17 | 13730 | 8 714 | 7 755 | 8 937 | 8622 | 315 |
| Лепельская | 16 | 31059 | 14 247 | 14 000 | 14 074 | 13848 | 226 |
| Лёзненская | 15 | 15354 | 8 075 | 8 075 | 7 770 | 7712 | 58 |
| Мёрская | 18 | 18358 | 10 746 | 9 940 | 10 145 | 9875 | 270 |
| Аршанская | 34 | 143725 | 46 900 | 46 900 | 47 113 | 46913 | 200 |
| Полацкая | 35 | 100848 | 47 349 | 45 500 | 45 774 | 45131 | 643 |
| Пастаўская | 19 | 33010 | 11 432 | 11 095 | 11 233 | 11103 | 130 |
| Расонская | 9 | 8730 | 5 698 | 5 885 | 5 301 | 4812 | 489 |
| Сенненская | 15 | 19694 | 11 182 | 10 565 | 10 615 | 10450 | 165 |
| Талачынская | 15 | 22745 | 10 204 | 10 070 | 9 888 | 9697 | 191 |
| Ушацкая | 9 | 12056 | 8 769 | 8 060 | 7 799 | 7598 | 201 |
| Чашніцкая | 16 | 27635 | 18 276 | 14 540 | 14 643 | 14592 | 51 |
| Шаркаўшчынская | 14 | 13847 | 8 853 | 8 315 | 8 493 | 8401 | 92 |
| Шумілінская | 14 | 16819 | 11 293 | 10 555 | 10 350 | 9236 | 1 114 |
| ***Усяго па РЦБС*** | ***368*** | ***646232*** | ***310624*** | ***296255*** | ***295967*** | ***289855*** | ***6112*** |
| г.Віцебск | 16 | 360419 | 63 774 | 63 780 | 63 552 | 62811 | 741 |
| г.Наваполацк | 7 | 97182 | 30 782 | 31 250 | 31 238 | 29160 | 2 078 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | ***23*** | ***457601*** | ***94 556*** | ***95 030*** | ***94 790*** | ***91971*** | ***2 819*** |
| **УСЯГО па ЦБС** | ***391*** | **1103833** | **405180** | **391285** | **390757** | **381826** | **8931** |
| Абласная б-ка | 1 | 360419 | 34 449 | 36 000 | 34 405 | 32871 | 1 534 |
| **УСЯГО** | **392** | **1103833** | **439629** | **427285** | **425162** | **414697** | **10465** |
| 2021 год | 420 | 1120364 | | | 439629 | 427586 | 12043 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Шумілінскі** 1/0/3 | Каўлякоўская | | Мішкаўскі, Полькавіцкі, Сіроцінскі |
| **УСЯГО на 01.01.2022** | **48** | **7** | **38** |
| **на 01.01.2023** | **42** | **7** | **41** |



4 чэрвеня ў гонар паэта-земляка Канстанціна Вераніцына ва ўрочышчы Вараб'ёвы горы ў Гарадку ў 13-ты раз адбыўся **брэндавы фестываль «Гарадоцкі Парнас»**. У рамках свята Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкай была арганізавана паэтычная пляцоўка аматараў паэзіі «Адкрый у сабе паэта…», на якой мясцовыя аўтары маглі падзяліцца сваёй творчасцю. «Тарасава сядзіба» гасцінна прапаноўвала паспрабаваць «стравы ад Тараса» з духмянай гарбатай. Гучалі прыгожыя, меладычныя песні ў выкананні таленавітых землякоў. Свае вершы прачытаў і госць фестывалю – пскоўскі паэт і чытальнік Уладзімір Іваноў. На свята была запрошана таксама загадчыца бібліятэкі-Цэнтра зносін і інфармацыі імя І.М. Грыгор'ева г. Пскова Наталля Капаніцкая.

Сельскія бібліятэкі Браслаўскага раёна прынялі актыўны ўдзел у **раённай акцыі «Браслаўскія аграгарадкі чытаюць паэтычныя радкі»**. Бібліятэкары выйшлі па-за сцены сваіх устаноў, каб ахапіць паэтычнай «хваляй» як мага больш сваіх землякоў. Паэзію беларускіх і мясцовых аўтараў чыталі ўслых як самі бібліятэкары, так і іх аднавяскоўцы: у крамах, школах, лясніцтвах, медыцынскіх установах, канторах сельгаспрадпрыемстваў, аддзяленнях сувязі, на вуліцы.

У Верхнядзвінскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Тараса Хадкевіча адбыўся **раённы конкурс чытальнікаў «Жыццёвы спраўдзіў запавет»** на лепшае выкананне твораў мясцовага аўтара Эдуарда Зубрыцкага.

У цэнтральнай бібліятэцы імя У. Маякоўскага 26 красавіка адбыўся **канцэрт літаратурна-музычнага аб'яднання «Крылы»** «Крылья нам даны, чтоб взлететь и постараться суметь в этом полёте дерзком песню свою пропеть!», прысвечаны *20-годдзю з дня яго стварэння*. Канцэрт стаў своеасаблівай справаздачай перад навапалачанамі аб праведзенай за гэты перыяд рабоце. У маі на базе бібліятэкі прайшоў **гарадскі конкурс чытальнікаў паэзіі «Войны победная строка»**, які сабраў 58 удзельнікаў – прадстаўнікоў усіх школ горада, навучэнцаў сярэдніх спецыяльных устаноў Наваполацка і Полацка, студэнтаў ПДУ. Арганізатарамі конкурсу выступілі Наваполацкі гарадскі выканаўчы камітэт, Наваполацкая арганізацыя рэспубліканскага аб'яднання «Белая Русь», ЦБС г.Наваполацка і рэдакцыя газеты «Новополоцк сегодня». Канкурсанты чыталі творы са зборніка вершаў пра трагічныя дні Вялікай Айчыннай вайны «В памяти народной, в сердцах поэтов», які быў падрыхтаваны сіламі супрацоўнікаў ЦБС на аснове матэрыялаў, што былі надрукаваны на старонках газет «Знамя новостройки», «Химик», «Новая газета», «Новополоцк сегодня», «Вестник Нафтана». Кожны ўдзельнік конкурсу атрымаў сертыфікат, кнігу А. Герашчанкі «Бельчонок», а пераможцы конкурсу – дыпломы і каштоўныя прызы.

**Народнае літаратурна-музычнае аб'яднанне «Світанак»**, што дзейнічае пры Шаркаўшчынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы, адзначыла *30-годдзе заснавання* музычнай гасцёўняй «Літаратурнымі сцяжынкамі роднага краю». На мерапрыемства завіталі сябры калектыву, калегі, прыхільнікі творчасці. Наведаў свята і вядомы пісьменнік Віктар

Праўдзін. Віншавальную паштоўку даслала абласное аддзяленне «Саюза пісьменнікаў Беларусі». На працягу мерапрыемства «світанкаўцы» чыталі свае вершы і дзяліліся новымі творчымі задумкамі.

## *Навацыйныя бібліятэчныя мерапрыемствы, праекты*

Бібліятэкі вобласці выкарыстоўваюць у рабоце з чытачамі сучасныя інавацыйныя формы і ідэі.

Новы праект Віцебскай абласной бібліятэкі – **квэстбук «Витебск глазами Наполеона»** прапануе ўдзельнікам паглядзець на сучасны Віцебск праз прызму часу вачыма Напалеона,ператварыўшы звычайны шпацыр па цэнтры горада ў квэст-падарожжа. Для ўдзелу ў квэсце патрабуецца тэлефон з падключаным інтэрнэтам, алоўкі ці фламастары.

У 2022 годзе ва Ушацкай цэнтральнай раённай бібліятэцы створана ўнікальная **кніга-квэст «Ушацкі край»**, якая разлічана на дзяцей сярэдняга, старэйшага школьнага ўзросту і моладзь, і складаецца з дзвюх частак: «Кніга-знаёмства» і «Кніга-квэст». Карыстальнікам прапануецца азнаёміцца са звесткамі па гісторыі, прыродзе, культуры і славутасцям Ушаччыны, карыстаючыся першай кнігай, і паспрабаваць выканаць заданні квэста, якія размешчаны ў другой частцы. Квэсты, праведзеныя з дапамогай кніг, ужо паспелі заваяваць папулярнасць сярод карыстальнікаў бібліятэкі.

Не першы год выкарыстоўваюць фармат квэстў у сваёй дзейнасці і бібліятэкі ЦБС г.Наваполацка, дзе праводзіўся **краязнаўчы гаджэт-квэст «По улицам родного города».** Асноўнае дзеянне гульні праходзіла на вуліцах Наваполацка, а заданні і адказы на іх перасылаліся пасродкам месанджара Viber. Атрады, якія справіліся з творчымі заданнямі і прайшлі ўсе пункты маршруту, атрымалі салодкія прызы і заслужаныя дыпломы. Падвядзенне вынікаў квэсту адбылося ў дзіцячай бібліятэцы імя А.С.Пушкіна.

Гульнявыя інтэрактыўныя праграмы дазваляюць зацікавіць юных карыстальнікаў, тым самым прыцягнуць ўвагу маладога пакалення да гісторыі роднага краю, сфарміраваць пазітыўны вобраз бібліятэкі. Такога ж эфекту прызваны дасягнуць і віртуальныя праекты на сайтах бібліятэк і ў іх сацыяльных сетках, накіраваныя на шырокую мэтавую аудыторыю.

Новы **віртуальны праект «Бібліятаксі»** створаны ў Сенненскай ЦБС. Ён уключае відэаролікі, якія знаёмяць з гістарычнымі месцамі раёна. Падрыхтаваны відэафільмы «Чертов камень», «Капличка», «Костел Святой Троицы», «Дворцово-парковый комплекс Свяцких». Праект спрыяе выхаванню патрыятызму і любові да малой радзімы.

**Краязнаўчая гульня-пазл «Места родные»** падрыхтавана супрацоўнікамі Бешанковіцкай ЦБС з мэтай даць магчымасць карыстальнікам цікава, карысна правесці вольны час і, сабраўшы пазлы, згадаць гісторыю роднага пасёлка.



| | | | |
|---|---|---|---|
| **Лепельскі** 1/3/2 | Велеўшчанская | Баброўская бібліятэка-музей Я. Мароза, Чарэйшчынская бібліятэка-музей вёскі, Каменская бібліятэка-музей Т. Кляшторнага | Забароўскі, Юркоўшчынскі |
| **Лёзненскі** 0/2/2 | | Кавалёўская сельская бібліятэка-музей, Бабінавіцкая сельская бібліятэка-музей | Высачанскі, Емельяноўскі |
| **Мёрскі** 3/0/2 | Дварнасельская, Забалоццеўская, Перабродская | | Лявонпальскі цэнтр культуры і вольнага часу Папшулёўскі |
| **Полацкі** 3/1/0 | Дрэтунская, Жарнасецкая, Маласітнянская | Сільніцкая бібліятэка-музей этнаграфіі | |
| **Пастаўскі** 0/0/0 | | | |
| **Расонскі** 1/0/2 | Кавалёўская | | Галоўчыцкі, Янкавіцкі |
| **Сенненскі** 1/0/2 | Сінягорская | | Канстантоўскі, Першамайскі |
| **Талачынскі** 1/0/1 | Дзімітраўская | | Жукнеўскі |
| **Ушацкі** 1/0/4 | Жарская | | Дубраўскі, Матырынскі, Селішчанскі, Сарочынскі |
| **Чашніцкі** 4/0/1 | Вядрэнская, Дварэцкая, Замацкая, Чырвонараніцкая, | | Праземлянскі |
| **Шаркаўшчынскі** 2/0/0 | Буеўшчынская, Зоркаўская | | |

*Дадатак № 4*
*Табліца 4*

**СПІС БІБЛІЯТЭК ЗМЯШАНАГА ТЫПУ Ў ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ**

| Рэгіён | Бібліятэкі-клубы | Бібліятэкі-музеі | Клубы-бібліятэкі* (клубная сістэма) |
|---|---|---|---|
| **Аршанскі** 5/0/4 | Андрэеўшчынская, Белеўская, Пугляеўская, Смалянская, Якаўлевіцкая | | Міцькаўшчынскі, Стайкаўскі, Старскі, Юркаўскі |
| **Бешанковіцкі** 0/0/0 | | | |
| **Браслаўскі** 0/0/4 | | | Далёкаўскі, Друйскі, Мількаўскі, Казянскі |
| **Верхня-дзвінскі** 3/0/7 | Марозаўская, Стралкоўская, Чыстапольская | | Бялькоўшчынскі, Відокскі, Дзёрнавіцкі, Росіцкі, Прудзінкаўскі, Сакалоўшчынскі, Сенькаўскі |
| **Віцебскі** 1/0/0 | Пестуніцкая | | |
| **Гарадоцкі** 2/0/2 | Мяжанская, Руднянская | | Вярэцкі, Марачанскі |
| **Глыбоцкі** 3/1/1 | Абрубская, Бабічоўская, Карабоўская | Азярэцкая бібліятэка-музей этнаграфіі | Гатаўшчынскі |
| **Докшыцкі** 5/0/4 | Бярозаўская, Гарадзішчанская, Замастоцкая, Літоўская, Тумілавіцкая | | Бярозаўскі, Бярэзінскі, Крыпульскі, Таргуноўскі |
| **Дубровенскі** 5/0/0 | Арловіцкая, Баброўская, Рэдзькаўская, Сіпішчаўская, Чырынская | | |



На сайце Пастаўскай ЦБС дзейнічалі наступныя віртуальныя праекты: «Книжный гороскоп», «Книги-юбиляры», «Книги, ожившие на экране», «Виртуальные викторины».

Падчас **чэленджа «Сэлфі з любімай кнігай у бібліятэцы»,** арганізаванага ў бібліятэках ЦБС г.Наваполацка, чытачам прапаноўвалася зрабіць сэлфі з любімай кнігай у інтэр'еры бібліятэкі і апублікаваць іх з хэштэгам #НовополоцкСелфиВбиблиотеке ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте». Інавацыйным у 2022 годзе для публічных бібліятэк гэтай сістэмы стаў і анлайн-праект #60ФАКТОВОГЛАВНОЙБИБЛИОТЕКЕГОРОДА, што таксама праводзіўся ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте», і быў прысвечаны 60-годдзю цэнтральнай бібліятэкі імя У.Маякоўскага.

На сайце Лёзненскай ЦБС было размешчана 25 відэаролікаў **бібліяперадачы «Литературный воскресник»**, папаўняліся раздзелы **анлайн-праекта «Кніга ў нефармаце»**. Народным літаратурным аматарскім аб'яднаннем «Пад абажурам» падрыхтаваны **цыкл відэаэкскурсій «Прогулки по Лиозно»** з удзелам мясцовых паэтаў. На працягу года падрыхтавана 12 выпускаў.

## *Праграмна-праектная дзейнасць*

На працягу бягучага года бібліятэкі вобласці ажыццяўлялі праграмна-праектную дзейнасць. З мэтай развіцця культурных традыцый і вывучэння гісторыі краю ў бібліятэчных сістэмах ажыццяўляліся праекты краязнаўчага напрамку.

З красавіка па верасень на Браслаўшчыне працаваў выставачны праект **«2022 – Год исторической памяти»,** арганізаваны Навукова-даследчай установай культуры «Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў» і ЦБС Браслаўскага раёна. Мэта праекта – пазнаёміць жыхароў аграгарадкоў з гераічнымі старонкамі Вялікай Айчыннай вайны на Браслаўшчыне, багатай творчай і культурнай спадчынай рэгіёна, жыццём і дзейнасцю знакамітых ураджэнцаў краю і людзей, якія ўнеслі значны ўклад у яго развіццё.

Актыўнай даследчай дзейнасцю на працягу апошніх гадоў паспяхова займаецца Сасноўская бібліятэка Віцебскай РЦБС. У гэтым годзе бібліятэкай рэалізаваны праект **«Памяці жыць!...Старонкі гераічнага мінулага сасноўскага краю».** Падрыхтаваны гісторыка-публіцыстычны нарыс пра партызанскі і падпольны рух на тэрыторыі краю ў 1941–1944 гг., у аснову якога ляглі ўспаміны старажылаў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, былых вязняў, жыхароў вёсак, публікацыі з газет і часопісаў аб баявых дзеяннях на тэрыторыі краю, архіўныя матэрыялы.

На працягу года ў бібліятэках Сенненскага раёна здзяйснялася рэалізацыя гісторыка-патрыятычнага праекта **«Помним. Чтим. Гордимся»**. Вёўся збор звестак, фотаздымкаў землякоў, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё раёна. Вынікам праведзенай пошукавай працы стала стварэнне відэафільма «Память и гордость в сердцах поколений» і

краязнаўчага зборніка пра Герояў Сацыялістычнай Працы «Славное имя в истории Сенненского района». Бібліятэка імя У.Караткевіча ЦБС г.Віцебска сумесна з Першамайскай раённай арганізацыяй г.Віцебска «Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў» з мэтай ажыццяўлення пераемнай сувязі паміж ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, вайны ў Афганістане і падрастаючым пакаленнем пачала рэалізоўваць праект **«Радзіма мая дарагая, красуйся і ў шчасці жывi!»**. Ушацкая цэнтральная раённая бібліятэка працавала па праекце **«Помним. Храним. Дорожим»**. Праект ўключае акцыі і мерапрыемствы ваенна-патрыятычнага характару, ініцыяваныя бібліятэкай і рэалізаваныя ў творчай садружнасці з культурнымі і адукацыйнымі ўстановамі, грамадскімі арганізацыямі раёна.

Цэнтральнай раённай бібліятэкай імя Т.Хадкевіча Верхнядзвінскай ЦБС працягнута работа ў рамках праекта **«Маршрут этнотура по Верхнедвинскому краю»**, мэтай якога з'яўляецца вывучэнне культурнай і гістарычнай спадчыны Верхнядзвінскага краю. Рэалізацыя праекта пачалася са збору экспанатаў для этнаграфічнага пакою «Кола гісторыі» на базе раённай бібліятэкі. Зараз тут налічваецца каля 300 экспанатаў сялянскага і савецкага побыту. У 2022 годзе набыты шырокафарматны тэлевізар для візуальнага суправаджэння мерапрыемстваў і экскурсій, якія праводзяцца ў музейным пакоі.

На працягу года Лёзненская цэнтральная бібліятэка ажыццяўляла рэалізацыю гісторыка-краязнаўчага праекта **«Лёзненскі эксклюзіў, або У пошуках цудаў Лёзненшчыны».** На працягу года бібліятэкары і чытачы збіралі цікавыя факты аб Лёзненскай зямлі: яе гісторыі, знакамітых людзях. У выніку быў выдадзены зборнік «Лиозненщина известная и неизвестная».

Бібліятэчны краязнаўчы праект **«7 цудаў Аршаншчыны»** праводзіўся ў рамках рэспубліканскай акцыі «Орша – культурная сталіца 2022» і быў прысвечаны 955-годдзю горада Оршы. Прэзентацыя праекта адбылася ў Дзень Перамогі на бібліятэчнай пляцоўцы ў гарадскім парку.

Глыбоцкая ЦБС прыступіла да рэалізацыі арт-праекта **«Душы і сэрца натхненне»** (перыяд дзеяння 2022–2023 гг.), мэтай якога з'яўляецца прыцягненне ўвагі наведвальнікаў бібліятэкі да дзейнасці сучасных майстроў народнай творчасці, выяўленчага і фотамастацтва. У бягучым годзе арганізавана 6 мастацкіх выставак.

Докшыцкая зямля багата знакамітымі, таленавітымі, цікавымі людзьмі, якія пакідаюць значны след у гісторыі раёна, горада. Докшыцкай ЦБС пачалася рэалізацыя віртуальнага праекта **«Докшиччина в лицах»**. Мэта праекта – захаванне памяці аб гэтых людзях, выхаванне ў падрастаючага пакалення павагі да іх і гонару за іх.

З 2022 года Талачынская раённая бібліятэка пачала працаваць над праектам **«Літаратурныя партрэты Талачынскага краю»** па папулярызацыі творчай дзейнасці пісьменнікаў-землякоў.

15 верасня ў Цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Ф. Скарыны Полацкай РЦБС бібліятэкары адзначылі свае прафесійнае свята праектам **«Ноч. Кіно. Бібліятэка».** Чатыры гадзіны захапляльных гульняў, займальных квэстаў, віктарын і майстар-класаў прывялі ў захапленне



*Дадатак № 3*
*Табліца 3*

**ІНТЭГРАВАНЫЯ БІБЛІЯТЭКІ**
**(АБ'ЯДНАНЫЯ ПУБЛІЧНЫЯ І ШКОЛЬНЫЯ)**

На 01.01.2022 г. у Віцебскай вобласці функцыянавала 19 інтэграваных устаноў.
Па стане на 01.01.2023 г. дзейнічаюць 18 інтэграваных бібліятэк.

**Спіс інтэграваных (аб'яднаных) бібліятэк**

| | Рэгіён | Назва населенага пункта | Назва аб'яднанай бібліятэкі |
|---|---|---|---|
| *Бібліятэкі сеткі Міністэрства культуры* | | | |
| 1 | **Браслаўскі** | в. Дрысвяты | Дрысвяцкая бібліятэка-філіял № 52 |
| 2 | Браслаўскі | в. Плюсы | Плюская бібліятэка-філіял № 21 |
| 3 | **Верхнядзвінскі** | аг. Каханавічы | Каханавіцкая бібліятэка-філіял № 29 |
| 4 | **Лепельскі** | в. Вялікі Полсвіж | Полсвіжская сельская бібліятэка-філіял № 27 |
| 5 | **Аршанскі** | аг. Барздоўка | Барздоўская сельская бібліятэка-філіял № 23 |
| 6 | **Полацкі** | в. Бабынічы | Бабыніцкая бібліятэка-клуб |
| 7 | Полацкі | в. Варонічы | Вароніцкая бібліятэка-філіял № 17 |
| 8 | Полацкі | аг. Мацюшы | Мацюшэўская бібліятэка-філіял № 7 |
| 9 | Полацкі | в. Шпакоўшчына | Шпакоўшчынская бібліятэка-клуб |
| 10 | Полацкі | аг. Гараны | Гаранская бібліятэка-філіял № 26 |
| 11 | Полацкі | аг. Завозер'е | Завзерская бібліятэка-філіял № 31 |
| 12 | Полацкі | аг. Зялёнка | Зялёнкаўская бібліятэка-філіял № 33 |
| 13 | Полацкі | аг. Кушлікі | Кушлікоўская бібліятэка-філіял № 5 |
| 14 | Полацкі | аг. Палата | Палатоўская бібліятэка-філіял № 61 |
| 15 | Полацкі | г. Полацк | Бібліятэка-філіял № 5 |
| 16 | **Расонскі** | в. Забор'е | Заборская сельская бібліятэка-філіял № 10 |
| 17 | **Сенненскі** | аг. Ходцы | Ходцаўская сельская бібліятэка-філіял № 50 |
| *Бібліятэкі сеткі Міністэрства адукацыі* | | | |
| 18 | **г. Віцебск** | п. Вярхоўе | Бібліятэка ДУА «Сярэдняя школа № 9 г.Віцебска» |

| АДКРЫТА | | |
|---|---|---|
| Аршанскі (+1) | ***Рэарганізаваны:*** Якаўлевіцкі сельскі клуб-бібліятэка рэарганізаваны ў **Якаўлевіцкую** сельскую **бібліятэку-клуб - філіял № 62** 03.01.2022 | Рашэнне Аршанскага РВК № 1217 ад 17.11.2021 |
| **УСЯГО** | адкрыта – **1**; закрыта – **29** | |



шматлікіх гасцей Бібліяночы. Асаблівую атмасферу святу надавалі яркія фотазоны і стылістычнае афармленне лакацый. У бібліятэцы імя Я. Купалы – філіяле № 3 Полацкай РЦБС быў распрацаваны новы праект **«Завуся я толькі Янка Купала…»**, у межах якога былі арганізаваны мерапрыемствы ў гонар народнага паэта.

Сярод новых праектаў бібліятэк вобласці варта адзначыць праект творчага развіцця і эстэтычнага выхавання «Аленький цветочек» бібліятэкі імя М.Лынькова ЦБС г.Віцебска; праект «Радасць» раённай дзіцячай бібліятэцы імя У.Дубоўкі Пастаўскай ЦБС, які накіраваны на падтрымку пазітыўнага ладу жыцця; праект «Расцём з беларускай кнігай» для дзяцей дашкольнага ўзросту ў дзіцячай бібліятэцы імя С.Маршака ЦБС г.Наваполацка; праект «Пад сямейным парасонам» Гарадоцкай ЦБС, накіраваны на папулярызацыю сямейных каштоўнасцей. Падчас летніх канікул у бібліятэках вобласці рэалізаваліся праграмы летніх чытанняў: «Чароўны ключ у краіне ведаў», «Лето книжное, будь со мной», «Путешествие в Динозаврию», «Гісторыі аднаго лета», «Бібліялета», «Па кніжным моры пад ветразем лета» і іншыя.

### *Духоўная асвета*

На базе публічных бібліятэк працуюць клубы і аматарскія аб’яднанні духоўнага накірунку: «Благовест», «Благодать» (Чашніцкая РЦБС), «Духоўны прыстанак», «Лучынка» (Глыбоцкая ЦБС), «Вытокі» (Гарадоцкая ЦБС) і інш. У дзіцячай бібліятэцы Докшыцкай ЦБС дзейнічае духоўна-культурны цэнтр «Добрае слова», на базе бібліятэкі займаецца нядзельная школа прыхода храма Пакрова Прасвятой Багародзіцы.

12 студзеня адбылося адкрыццё духоўна-асветніцкага цэнтру ў Віцебскай абласной бібліятэцы. Працягвалі працу кафедры праваслаўнай літаратуры пры цэнтральнай бібліятэцы імя А.С.Пушкіна Аршанскай ЦБС, Лёзненскай, Гарадоцкай і Лепельскай цэнтральных раённых бібліятэках. Духоўнае выхаванне з’яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў у рабоце бібліятэк гэтых сістэм.

27 красавіка ў чытальнай зале Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі ў рамках працы Кафедры праваслаўнай літаратуры адбыліся **першыя раённыя адукацыйныя велікодныя чытанні «Чудо выше всех чудес»** сярод навучэнцаў агульнаадукацыйных школ Гарадоцкага раёна. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі ДУК «Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк» і аддзел адукацыі Гарадоцкага райвыканкама. З прывітальным словам да ўдзельнікаў і гасцей звярнуўся святар храма Святой Жываначальнай Тройцы айцец Вячаслаў. Удзельнікам мерапрыемства былі прадстаўлены вынікі навукова-даследчай дзейнасці навучэнцаў, якая ажыццяўлялася пад кіраўніцтвам выкладчыкаў устаноў адукацыі. Прысутныя заслухалі выступленні школьнікаў пра святыні беларускай зямлі, храмы Гарадоччыны, існуючыя і страчаныя. Даклады суправаджаліся электроннымі прэзентацыямі і нагляднымі матэрыяламі.

Разам з тым, трэба адзначыць, што па ініцыятыве духавенства і жыхароў Гарадка ў цэнтральнай бібліятэцы быў арганізаваны **Клуб аматараў гісторыі праваслаўя «Светач»**. Клуб аб’яднаў людзей, якія цікавяцца не толькі краязнаўствам, але і духоўнай гісторыяй Гарадоцкага краю. Адна з галоўных мэт, якую ставяць перад сабой члены клуба – гэта прыцягненне ўвагі падрастаючага пакалення да праваслаўнага краязнаўства і захавання гісторыі рэгіёну. Першая сустрэча адбылася 29 верасня і прайшла ў фармаце дыялогу. З ідэямі па развіцці клуба выступіла начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гарадоцкага раённага выканаўчага камітэта Святлана Мазжарава. Благачынны Гарадоцкага раёна Уладзімір Дагодзька правёў анлайн-падарожжа па раздзелах сайта Храма Святой Жываначальнай Тройцы. Айцец Уладзімір расказаў аб рабоце па выпуску духоўна-асветніцкага выдання клуба аматараў духоўнай гісторыі і праваслаўя на Гарадошчыне «Троіцкі веснік».

У рамках супрацоўніцтва з праваслаўнай царквой з 14 па 19 сакавіка ў бібліятэках Аршанскай ЦБС праведзены восьмы **Фестываль праваслаўнай кнігі «Дарогамі праваслаўя»**. 14 сакавіка ў Цэнтральнай бібліятэцы імя А.С.Пушкіна адбылося адкрыццё фестывалю. У гэтым годзе яно прайшло пад эгідай важных знамянальных дат – 1030-годдзе праваслаўя на беларускіх землях і 600-годдзе здабыцця сумленных мошчаў Прападобнага Сергія Раданежскага. Гэтае мерапрыемства, арганізаванае сумесна з Аршанскай благачыннай акругай, па традыцыі пачалося з усеагульнай малітвы. У адкрыцці фестывалю прынялі ўдзел: заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь, актрыса тэатра і кіно Ірына Нарбекава, музыказнаўца, выкладчык, рэгент, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Піменава і акцёр, рэжысёр, выкладчык Яўген Піменаў.

Лепельскай ЦБС сумесна з благачынным Лепельскага благачыння Сергіем Ляшкевічам рэалізаваны **праект «Духоўная спадчына»**, у рамках якога навучэнцы школ горада прымалі ўдзел у экскурсіях па храмах Лепельшчыны, пазнаёміліся з гісторыяй храма св. вялікамучаніцы Параскевы Пятніцкай (г. Лепель), храма Раства Хрыстова (г. Лепель), храма св. Космы і Даміяна (агр. Слабада), касцёла св. велікамучаніка Георгія Перамаганосца (г. Лепель), храма ў гонар абраза Божай Маці «Неупиваемая чаша» (в. Бароўка) і храма св. велікамучаніцы Варвары (в. Чарэйшчына).

Традыцыйна карыстальнікі бібліятэк запрашаліся на мерапрыемствы, прысвечаныя святкаванню Дня праваслаўнай кнігі, датам праваслаўнага календара: былі праведзены бяседа «І свет душы - і свет неба» (Глыбоцкая ЦБС), гадзіна духоўнасці «Разам з кнігай па дарозе да Храма» (Верхнядзвінская ЦБС), дзень праваслаўнай кнігі «Праз кнігу – да дабра і святла» (Чашніцкая дзіцячая бібліятэка). Літаратурна-музычны вечар «Святло Раства» адбыўся ў бібліятэцы імя Е.Полацкай ЦБС г.Віцебска пры ўдзеле Міжнароднай садружнасці праваслаўных аўтараў і выканаўцаў «Благодар». 13 студзеня ў дзіцячай бібліятэцы імя Л.М.Талстога-філіяле № 1 Полацкай РЦБС прайшла сустрэча вучняў



| | | |
|---|---|---|
| Ушацкі<br>(-6) | **Мосарская** сельская бібліятэка закрыта 01.04.2022<br>**Слабадская** бібліятэка закрыта 01.11.2022<br>***<u>Рэарганізаваны:</u>***<br>Дубраўская бібліятэка рэарганізавана ў **Дубраўскі клуб-бібліятэку** 01.07.2022<br>Матырынская бібліятэка рэарганізавана ў **Матырынскі клуб-бібліятэку** 01.07.2022<br>Селішчанская бібліятэка рэарганізавана ў **Селішчанскі клуб-бібліятэку** 01.07.2022<br>Сорочынская бібліятэка рэарганізавана ў **Сарочынскі клуб-бібліятэку** 01.07.2022 | Рашэнне Ушацкага РВК № 304 ад 18.03.2022<br>Рашэнне Ушацкага РВК № 1277 ад 28.10.2022<br><br>Рашэнне Ушацкага РВК № 690 ад 01.06.2022 |
| Чашніцкі<br>(-1) | ***<u>Рэарганізаваны:</u>***<br>Вядрэнская сельская бібліятэка-філіял № 6 рэарганізавана ў **Вядрэнскую** сельскую **бібліятэку-клуб** № 6 01.03.2022<br>Праземлянская сельская бібліятэка-філіял № 20 рэарганізавана ў **Праземлянскі** сельскі **клуб-бібліятэку** 01.03.2022 *(аграгарадок)* | Загад аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Чашніцкага РВК № 3 ад 12.01.2022 |
| Шаркаўшчынскі<br>(-2) | **Навасёлкаўская** сельская бібліятэка закрыта 01.02.2022 *(аграгарадок)*<br>**Пялікаўская** сельская бібліятэка закрыта 01.03.2022 (*аграгарадок)*<br>***<u>Рэарганізаваны:</u>***<br>Зоркаўская сельская бібліятэка рэарганізавана ў **Зоркаўскую** сельскую **бібліятэку-клуб** 01.10.2022 | Рашэнне Шаркаўшчынскага РВК № 1271 ад 21.12.2021<br><br>Рашэнне Шаркаўшчынскага РВК № 1368 ад 31.12.2021<br><br>Рашэнне Шаркаўшчынскага РВК № 878 ад 31.08.2022 |
| Шумілінскі<br>(-2) | **Добрынская** сельская бібліятэка закрыта 01.11.2022<br>***<u>Рэарганізаваны:</u>***<br>Мішкаўская сельская бібліятэка рэарганізавана ў **Мішкаўскі** сельскі **клуб-бібліятэку** 01.10.2022<br>Каўлякоўская сельская бібліятэка рэарганізавана ў **Каўлякоўскую** сельскую **бібліятэку-клуб** 01.10.2022 | Рашэнне Шумілінскага РВК № 682 ад 14.10.2022<br><br>Рашэнне Шумілінскага РВК № 496 ад 26.07.2022 |

| | | |
|---|---|---|
| Дубровенскі (-1) | **Расасенская** сельская бібліятэка закрыта 20.07.2022 | Рашэнне Дубровенскага РВК № 317 ад 13.05.2022 |
| Лепельскі (-1) | **Валосавіцкая** сельская **бібліятэка-клуб** – філіял № 9 закрыта 01.12.2022<br>***<u>Рэарганізаваны</u>***<br>***Інтэграваная*** Матырынская сельская бібліятэка-філіял № 24 у сувязі з ліквідацыяй ДУА ”Матырынскі дзіцячы сад-сярэдняя школа Лепельскага раёна“ з 01.01.2022 рэарганізавана ў **Матырынскую сельскую бібліятэку-філіял № 24** | Рашэнне Лепельскага РВК № 1036 ад 16.09.2022<br><br>Рашэнне Лепельскага РВК № 1306 ад 17.12.21 |
| Мёрскі (-2) | **Даўгінаўская** сельская **бібліятэка-клуб** закрыта 01.06.2022<br>**Волкаўшчынская** сельская **бібліятэка-клуб** закрыта 15.12.2022 | Рашэнне Мёрскага РВК № 87р ад 25.03.2022<br><br>Загад аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі № 63 ад 14.10.2022 |
| Пастаўскі (-2) | **Старадворская** сельская бібліятэка-філіял № 20 закрыта 30.11.2022<br>**Хацілаўская** сельская бібліятэка-філіял № 57 закрыта 30.11.2022 *(аграгарадок)* | Рашэнне Пастаўскага РВК № 1424 ад 25.11.2022 |
| Полацкі | ***<u>Рэарганізаваны:</u>***<br>Бабыніцкая бібліятэка-клуб рэарганізавана ў **Бабыніцкую бібліятэку-філіял № 13** 01.06.2022<br>Шпакоўшчынская бібліятэка-клуб рэарганізавана ў **Шпакоўшчынскую бібліятэку-філіял № 53** 01.06.2022 | Рашэнне Полацкага РВК № 759 ад 08.04.2022 |
| Расонскі (-1) | **Раённая дзіцячая бібліятэка** (філіял № 1) закрыта 01.08.2022 | Рашэнне Расонскага РВК № 394 ад 29.07.2022 |
| Талачынскі (-2) | **Навасельская бібліятэка-клуб** закрыта 31.03.2022<br>***<u>Рэарганізаваны:</u>***<br>**Жукнеўская** сельская бібліятэка-філіял № 39 рэарганізавана ў Жукнеўскі сельскі клуб-бібліятэку з 01.06.2022 | Рашэнне Талачынскага РВК № 48 ад 28.01.2022<br><br>Рашэнне Талачынскага РВК № 168 ад 25.03.2022 |



пачатковых класаў з дыяканам Свята-Пакроўскай царквы Георгіем «Льются звуки жизни, счастья и добра, озаряя мысли светом Рождества».

У рамках святкавання 1030-годдзя праваслаўя на беларускіх землях адбылася сустрэча-дыялог «Да сваёй душы знайдзі дарогу» (ЦРБ Лепельскай ЦБС), былі арганізаваны тэматычныя выстаўкі «Па святых мясцінах Полацкай епархіі», «Зямля Беларусі – святая зямля», «З Полацка пачыналася дарога» (Глыбоцкая ЦБС) і іншыя мерапрыемствы.

### *Сямейнае выхаванне*

У бібліятэках вобласці праходзілі тэматычныя мерапрыемствы, якія садзейнічаюць згуртаванню сям'і, фарміраванню беражлівых адносін да сямейных каштоўнасцей, паважліваму стаўленню паміж дзецьмі і бацькамі.

Напярэдадні Міжнароднага дня сям'і ў Цэнтральнай бібліятэцы імя А.С.Пушкіна Аршанскай ЦБС адбылося ўзнагароджанне шматдзетных маці. Тамару Міхайлаўну Сінькевіч і Наталлю Васільеўну Шаранда ўзнагародзілі Ордэнам Маці. Публічны цэнтр прававой інфармацыі Віцебскай абласной бібліятэкі сумесна з галоўным упраўленнем юстыцыі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта арганізавалі выставу конкурсных работ дзіцячага малюнка «Я і мая сям'я», на якой былі прадстаўлены малюнкі дзяцей, якія перамаглі ў абласным дзіцячым конкурсе, праведзеным галоўным упраўленнем, а таксама творы іншых удзельнікаў.

У Беларусі ў 2022 годзе прайшоў **Рэспубліканскі Тыдзень бацькоўскай любві**. Пачаўся ён з Дня маці (14 кастрычніка), і завяршыўся Днём бацькі (21 кастрычніка), які беларусы адзначалі сёлета ўпершыню. У рамках тыдня бібліятэкі выступалі арганізатарамі святочных праграм, акцый і іншых мерапрыемстваў.

На працягу года ў бібліятэках праведзены сямейная гульнятэка «Шчаслівыя разам» (ЦБС г.Віцебска), акцыя «Слова добрае – сям'я!» (ЦБС Расонскага раёна), бенефіс чытаючай сям'і «Сябруем з кнігай усёй сям'ёй» (бібліятэкі ЦБС г.Віцебска), сустрэчы «Сям'я і сямейныя каштоўнасці» (Верхнядзвінская ЦБС). Арганізаваны пасяджэнні клубаў і аматарскіх аб'яднанняў: вечар-дыялог «Чытаючыя бабулі – унукам» (пасяджэнне клуба «Гаспадыня» Ульскай сельскай бібліятэцы Бешанковіцкай ЦБС), «Я і мой радавод» (пасяджэнне народнага клуба «Надзея» ў Андрэеўшчынскай сельская бібліятэцы-клубе Аршанскай ЦБС), «Гэта я і мая сям'я» (занятак гуртка «Чароўная лямпа» ў бібліятэцы імя Я.Лось ЦБС г.Віцебска). На сайце Сенненскай ЦБС у рубрыцы «Вяселлі двух стагоддзяў» была размешчана фотавыстава вясельных фотаздымкаў XIX–XX ст. У зале мастацтваў ЦБ імя У.Маякоўскага ладзіўся канцэрт літаратурна-музычнага аб'яднання «Крылы», які адкрываў малады гітарыст Грыгорый Бердашкевіч інструментальнымі кампазіцыямі. У выкананні Галіны Сташкевіч прагучалі аўтарскія творы, прысвечаныя бацькам, а таксама «Балада пра маці» Юрася Касцюка. Аляксандр Ігонін выканаў эстрадныя

песні пад акампанемент Валянціны Пакрапіўнай, якая парадавала слухачоў і сваімі музычнымі п’есамі. Да любых сэрцу бацькоў праз цудоўныя лірычныя творы звярталіся Фенія Грынёва, Ірына Вашчанка, Вера Урбан. У дзіцячай бібліятэцы імя У.С.Караткевіча ў рамках акцыі «Дзень чытаючай сям’і» праведзена забаўляльная праграма «Шчасце быць разам» для дзяцей з прыёмных сем’яў і дзіцячых дамоў сямейнага тыпу.

## *Дзейнасць клубаў і аматарскіх аб’яднанняў*

Творчыя аматарскія аб’яднанні чытачоў: клубы, гурткі, студыі – трывала ўвайшлі ў практыку бібліятэчнай дзейнасці. У 2022 годзе ў бібліятэках Віцебшчыны працавала 404 аматарскія аб’яднанні, што на 12 адзінак менш, чым у мінулым годзе. Агульная колькасць удзельнікаў фарміраванняў перавышае 5 тыс. чалавек. Для дзяцей і моладзі дзейнічала 205 клубаў з агульнай колькасцю ўдзельнікаў 2,4 тыс. чалавек. У 10 бібліятэчных сістэмах дзейнічала 14 клубаў і аматарскіх аб’яднанняў са званнем «народны».

Паспяхова вядуць сваю работу клубы рознай накіраванасці. Клубаў краязнаўчага напрамку налічваецца ў вобласці каля дваццаці пяці. У рамках іх дзейнасці праходзілі мерапрыемствы, накіраваныя на захаванне гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі, папулярызацыю краязнаўчых ведаў: урок-партрэт да 100-годдзя з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза М.М.Ткачэнкі «Мужнасці вечны агонь», гадзіна літаратурнага краязнаўства да 85-годдзя з дня нараджэння пісьменніка-земляка Б.П.Беляжэнкі «Літаратурная краіна Барыса Беляжэнкі» (клуб «Прыдзвінне» Бешанковіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі), краязнаўчае падарожжа ў санаторый «Лясныя азёры» «Прыпынак па патрабаванню: “Лясныя азёры”», фотаэкспазіцыя «Мастера Ушаччыны» (клуб цікавых сустрэч «Ушачане» Ушацкай раённай бібліятэкі). Калектыў народнага аматарскага аб’яднання «Кругагляд» (Відзаўская гарпасялковая бібліятэка ЦБС Браслаўскага раёна) прыняў ўдзел у V Міжнароднай акцыі «Читаем Григорьева вместе» Муніцыпальнай аўтаномнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» г.Пскова, 55-ым юбілейным міжнародным свяце традыцыйнай культуры «Браслаўскія зарніцы», дзе імі была прэзентавана тэатралізаваная праграма «Легенда пра Відзы».

Клубаў літаратурна-мастацкага і эстэтычнага накірункаў у бібліятэках вобласці налічваецца больш за 90, яны аб’ядноўваюць аматараў тэатра, жывапісу, музыкі, паэзіі і прозы. Работа такіх аб’яднанняў накіравана на інтэлектуальны і культурны рост удзельнікаў, дзякуючы ім імёны мясцовых талентаў становяцца вядомымі шырокай публіцы.

У 2022 годзе калектыў літаратурна-музычнага салону «Крылы» цэнтральнай бібліятэкі імя У.Маякоўскага ЦБС г.Наваполацка адзначыў 20-годдзе аб’яднання. Для наваполачан быў падрыхтаваны юбілейны канцэрт «Крылья нам даны, чтоб взлететь и постараться суметь в этом полете дерзком песню свою пропеть!». Удзельнікі аб’яднання адзначаны дыпломамі лаўрэата першай ступені (Ю.Піліпёнак) і трэцяй ступені



*Дадатак № 2*
*Табліца 2*

### РЭАРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 2022 ГОДЗЕ

Па стане на 31.12.2022 – **392** публічныя бібліятэк (разам з абласной).

| Рэгіён | Назва ўстановы | Нумары і даты рашэнняў |
|---|---|---|
| **ЗАКРЫТА** | | |
| Аршанскі<br>(-2) | **Антонаўская** сельская бібліятэка-філіял № 53 закрыта 04.05.2022<br>**Засеклянская** сельская бібліятэка-філіял № 20 закрыта 04.05.2022<br>***<u>Рэарганізаваны:</u>***<br>Бабініцкая сельская бібліятэка-клуб рэарганізавана ў **Бабініцкую** сельскую **бібліятэку-філіял** № 54 04.05.2022 | Рашэнне Аршанскага РВК № 589 ад 11.04.2022<br><br>Рашэнне Аршанскага РВК № 589 ад 11.04.2022 |
| Віцебскі<br>(-2) | **Астраўская** сельская бібліятэка-клуб закрыта 01.10.2022<br>**Скрыдлеўская** сельская бібліятэка-клуб закрыта 01.10.2022 | Рашэнне Віцебскага РВК № 1397 ад 09.09.2022 |
| Гарадоцкі<br>(-3) | **Халамерская** сельская бібліятэка закрыта 01.02.2022<br>**Гуркінская** сельская бібліятэка закрыта 01.12.2022<br>**Вайханская бібліятэка-клуб** закрыта 01.12.2022<br>***<u>Рэарганізаваны:</u>***<br>Межанская сельская бібліятэка рэарганізавана ў **Межанскую бібліятэку-клуб** з 01.11.2022 | Рашэнне Гарадоцкага РВК № 1097 ад 30.12.2021<br>Рашэнне Гарадоцкага РВК № 390 ад 17.05.2022<br>Рашэнне Гарадоцкага РВК № 390 ад 17.05.2022<br><br>Рашэнне Гарадоцкага РВК № 714 ад 26.08.2022 |
| Докшыцкі<br>(-2) | **Несцераўшчынская** сельская **бібліятэка-клуб,** філіял № 24, закрыта 31.12.2022<br>***<u>Рэарганізаваны:</u>***<br>Крыпульская сельская бібліятэка філіял № 14 рэарганізавана ў **Крыпульскі клуб-бібліятэку** 31.12.2023<br>Глінская сельская бібліятэка філіял № 56 рэарганізавана ў **Глінскую сельскую бібліятэку-клуб** з 01.01.2023 | Рашэнне Докшыцкага РВК № 1222 ад 23.12.2022 |

*Працяг табліцы 1*

| ЦБС | б-кі на 0,75 стаўкі | б-кі на 0,5 стаўкі | б-кі на 0,25 стаўкі | % ахопу бібл. абсл. | ЗМЯШАНАГА ТЫПУ (усяго) | | | Інтэграваныя | Бібліёбус | Бібл. пункты |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | Б-кі-клубы | Б-кі-музеі | Клубы-б-кі | | | |
| Бешанковіцкая | 3 | 1 | 0 | 61,8 | 0 | 0 | 0 | 0 | 1 | 0 |
| Браслаўская | 4 | 0 | 0 | 39,0 | 0 | 0 | 4 | 2 | 1 | 4 |
| Верхнядзвінская | 1 | 2 | 0 | 50,0 | 3 | 0 | 7 | 1 | 1 | 1 |
| Віцебская | 3 | 0 | 0 | 39,4 | 1 | 0 | 0 | 0 | 1 | 0 |
| Глыбоцкая | 3 | 3 | 0 | 47,2 | 3 | 1 | 1 | 0 | 1 | 21 |
| Гарадоцкая | 3 | 1 | 0 | 57,3 | 2 | 0 | 2 | 0 | 1 | 2 |
| Докшыцкая | 0 | 1 | 0 | 57,6 | 5 | 0 | 4 | 0 | 1 | 0 |
| Дубровенская | 3 | 1 | 0 | 62,8 | 5 | 0 | 0 | 0 | 1 | 2 |
| Лепельская | 0 | 1 | 0 | 44,6 | 1 | 3 | 2 | 1 | 1 | 5 |
| Лёзненская | 6 | 1 | 0 | 50,2 | 0 | 2 | 2 | 0 | 1 | 5 |
| Мёрская | 0 | 0 | 0 | 53,8 | 3 | 0 | 2 | 0 | 0 | 5 |
| Аршанская | 1 | 1 | 0 | 32,6 | 5 | 0 | 4 | 1 | 1 | 0 |
| Полацкая | 0 | 0 | 0 | 44,8 | 3 | 1 | 0 | 10 | 1 | 2 |
| Пастаўская | 3 | 2 | 0 | 33,6 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 2 |
| Расонская | 1 | 0 | 0 | 55,1 | 1 | 0 | 2 | 1 | 1 | 0 |
| Сенненская | 1 | 0 | 0 | 53,1 | 1 | 0 | 2 | 1 | 1 | 0 |
| Талачынская | 4 | 1 | 0 | 42,6 | 1 | 0 | 1 | 0 | 1 | 0 |
| Ушацкая | 0 | 0 | 0 | 63,0 | 1 | 0 | 4 | 0 | 0 | 0 |
| Чашніцкая | 0 | 2 | 0 | 52,8 | 4 | 0 | 1 | 0 | 1 | 2 |
| Шаркаўшчынская | 3 | 0 | 0 | 60,7 | 2 | 0 | 0 | 0 | 1 | 1 |
| Шумілінская | 2 | 0 | 0 | 54,9 | 1 | 0 | 3 | 0 | 1 | 1 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **41** | **17** | **0** | **44,9** | **42** | **7** | **41** | **17** | **18** | **53** |
| г.Віцебск | 0 | 0 | 0 | 17,4 | 0 | 0 | 0 | 1 | 0 | 19 |
| г.Наваполацк | 0 | 0 | 0 | 30,0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **0** | **0** | **0** | **20,1** | **0** | **0** | **0** | **1** | **18** | **19** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **41** | **17** | **0** | **34,6** | **42** | **7** | **41** | **18** | **18** | **72** |
| Абласная б-ка | 0 | 0 | 0 | 9,1 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| **УСЯГО** | **41** | **17** | **0** | **37,6** | **42** | **7** | **41** | **18** | **18** | **72** |
| 2021 год | 50 | 16 | 0 | 38,2 | 48 | 7 | 38 | 19 | 18 | 84 |



(М.Змітровіч) на міжнародным конкурсе «Славянскі калейдаскоп», а аўтарскія творы Маргарыты Змітровіч і Іны Мароз былі надрукаваны ў часопісе «Маладосць».

Дзейнасць народнага аматарскага літаратурнага аб’яднання «Пад абажурам» Лёзненскай цэнтральнай раённай бібліятэкі атрымлівае ўсе большае распаўсюджванне ў рэжыме анлайн. На сайце ЦБС, на старонках сацыяльных сетак «ВКонтакте» і «Одноклассники», на канале «YouTube» за 2022 год размешчана 25 выпускаў бібліяперадачы «Литературный воскресник», прысвечаных творчасці мясцовых самадзейных аўтараў, прэзентацыям іх зборнікаў, знамянальным і памятным датам, з удзелам мясцовых паэтаў падрыхтаваны кліп-экскурсіі «Прогулки по Лиозно». Падрыхтаваны і выдадзены зборнік любоўнай лірыкі мясцовых паэтаў «Дыши со мной» і зборнікі вершаў удзельніц клуба В.С.Шлемянковай «Струны души», В.П.Мураўёвай «К звёздам», С.У.Саладковай «У сердца есть свои слова...».

На пасяджэннях клуба «Знаўцы роднай мовы», што дзейнічае ў Германавіцкай сельскай бібліятэцы Шаркаўшчынскай ЦБС, навучэнцы старэйшых класаў спрабуюць паглыбіцца ў вывучанне беларускай мовы пасродкам інтэлектуальных гульняў, турніраў, круглых сталоў, а таксама вывучыць лексіку і гаворкі жыхароў Шаркаўшчынскага краю.

Сярод новых клубаў эстэтычнага накірунку – аматарскае аб’яднанне «Акварэль» Карбоўскай бібліятэкі-клуба Глыбоцкай ЦБС, створанае з мэтай выхавання ў дзяцей музычнага густу. Пры актыўным удзеле членаў клуба за год было праведзена 10 мерапрыемстваў: літаратурнае знаёмства «Я люблю цябе – паэзія», конкурсная праграма «Мисс и Мистер Осень», тэатралізаваны ранішнік «Елка в гости к нам пришла» і інш.

Колькасць лялечных тэатраў і тэатраў кнігі ў бібліятэках вобласці на канец 2022 года налічвалася 13, што на 4 менш, чым у мінулым годзе. Сярод іх народны лялечны тэатр кнігі «Пятрушка» Сенненскай дзіцячай бібліятэкі, якім было паказана ў справаздачным годзе 24 прадстаўленні, з іх 8 дабрачынных. Асабліва плённа тэатр працаваў падчас летніх канікул. Да 140-годдзя народнага пісьменніка Беларусі Якуба Коласа была падрыхтавана пастаноўка «А пачнём мы казку так...». Працягвае сваю дзейнасць «Тэатр кнігі Васі Вясёлкіна» Вярхоўскай сельскай бібліятэкі Бешанковіцкай ЦБС. За 2022 год імі падрыхтавана і паказана 8 тэатралізаваных прадстаўленняў.

У бібліятэках вобласці налічваецца больш 50 клубаў экалагічнага накірунку, у большасці сваёй гэта клубы для дзяцей і моладзі: гурток «Экоша» Верхнядзвінскай дзіцячай бібліятэкі, клуб «Пралеска» Мікалаеўскай сельскай бібліятэкі Шумілінскай ЦБС, клуб «Экоша» дзіцячай бібліятэкі імя Л.М.Талстога – філіяла № 1 Полацкай РЦБС і інш. Бібліятэкар Башнеўскай сельскай бібліятэкі Шумілінскай ЦБС разам з удзельнікамі клуба «Экапульс», што працуе пры бібліятэцы, ладзілі экскурсіі па мясцовым наваколлі і экалагічныя паходы за лекавымі травамі і ягадамі, падчас якіх знаёміліся з флорай роднага краю. Удзельнікі клуба «Пралеска» Асінторфскай сельскай бібліятэкі-цэнтра экалагічнай асветы

Дубровенскай ЦБС правялі інфаманію пры ўдзеле мясцовых пчаляроў, якія адзначылі выдатную работу клуба ў папулярызацыі экалагічнага пчалярства і ўзнагародзілі ўдзельнікаў дыпломам і сертыфікатам ад Саюза грамадскіх аб'яднанняў беларускіх пчаляроў.

Народны аматарскі клуб «Белыя вароны» Верхнядзвінскай ЦБС у 2022 годзе пацвердзіў званне «народны». Кіраўнік клуба Пётр Квяцінскі праводзіць інфармацыйную работу, аздараўленчыя трэнінгі па сістэме Парфірыя Іванова. Юныя ўдзельнікі клуба займаюцца таксама рэстаўрацыяй парка беларускага фалькларыста Ігната Храпавіцкага, доглядам брацкіх магіл у вёсках Выдрыцкія, Гараваткі, Крыжборак, Задзежжа, Стралкі, Зябкі, Зашчырына і інш.

Адзначыў сваё 35-годдзе і ў чарговы раз пацвердзіў званне «народны» клуб кветкаводаў і садаводаў-аматараў «Флора» Лёзненскай цэнтральнай раённай бібліятэкі. Члены клуба – пастаянныя ўдзельнікі і прызёры рэспубліканскіх, абласных, раённых конкурсаў і фестываляў. Клуб штогод прымае ўдзел у Міжнародным фестывалі «Славянскі базар у Віцебску». У гэтым годзе для ўдзелу ў фестывалі была падрыхтавана летняя бібліятэчная пляцоўка «Лето пахнет земляникой».

27 год існуе пры Курынскай бібліятэцы Віцебскай РЦБС аматарскае аб'яднанне «Уцеха», заснавальнікам і кіраўніком якога з'яўляецца Вольга Уладзіміраўна Рыбакова, былы бібліятэкар Курынскай бібліятэкі, майстар салома- і берастапляцення. Удзельнікі аматарскага аб'яднання асвойваюць народныя рамёствы: саломапляценне, берастапляценне, лозапляценне.

У 2022 годзе на базе бібліятэк створана 15 новых аматарскіх аб'яднанняў. Сярод іх можна адзначыць дасугавы клуб для паклоннікаў усходнеазіяцкай культуры «Hikari club» для дзяцей і падлеткаў Дубровенскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, створаны з мэтай папулярызацыі бібліятэкі сярод падлеткаў як месца нефармальных зносін. Сустрэчы праходзяць актыўна: удзельнікі клуба захоплена абмяркоўваюць цікавыя для іх тэмы, дзеляцца сваёй творчасцю, запрашаюць на пасяджэнні сяброў. У справаздачным годзе на базе народнага клуба кветкаводаў і садаводаў-аматараў «Флора» Лёзненскай цэнтральнай раённай бібліятэкі створаны клуб-спадарожнік – дзіцячы экалагічны клуб «Флорята». Удзельнікамі клуба з'яўляюцца дзеці малодшага школьнага ўзросту. Для іх былі падрыхтаваны мерапрыемствы: экалагічная мазаіка «Почему мы с лесом дружим, для чего он людям нужен», творчая лабараторыя «От семечки до цветка», экалагічнае знаёмства з лекавымі травамі «Кладовая здоровья».

### *Нестацыянарнае абслугоўванне*

Абслугоўванне сельскіх населеных пунктаў, якія не маюць бібліятэк, забяспечваецца пасродкам бібліёбусаў у 18 раёнах вобласці. Мабільныя бібліятэкі адсутнічаюць у Мёрскім, Пастаўскім, Ушацкім раёнах. У параўнанні з мінулым годам колькасць населеных пунктаў, узятых на абслугоўванне бібліёбусамі, павялічылася на 33 адзінкі, такім



# ДАДАТКІ

*Дадатак 1*
*Таблiца 1*

**СЕТКА ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ**

| ЦБС | 2021 | 2022 | у аграгарадках | цэнтральных | гарадскіх | гарпасялковых | дзіцячых | сельскіх | штатныя адзінкі 2021 | штатныя адзінкі 2022 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Бешанковіцкая | 13 | 13 | 9 | 1 | 0 | 1 | 1 | 10 | 44,25 | 44,25 |
| Браслаўская | 13 | 13 | 10 | 1 | 0 | 1 | 1 | 10 | 44,00 | 44,00 |
| Верхнядзвінская | 17 | 17 | 8 | 1 | 0 | 1 | 1 | 14 | 44,50 | 43,25 |
| Віцебская | 24 | 22 | 14 | 1 | 0 | 2 | 0 | 19 | 56,75 | 50,00 |
| Глыбоцкая | 24 | 24 | 15 | 1 | 0 | 1 | 2 | 20 | 70,80 | 70,75 |
| Гарадоцкая | 17 | 14 | 8 | 1 | 0 | 1 | 0 | 12 | 59,25 | 57,50 |
| Докшыцкая | 21 | 19 | 10 | 1 | 0 | 1 | 1 | 16 | 64,80 | 63,25 |
| Дубровенская | 18 | 17 | 15 | 1 | 1 | 0 | 0 | 15 | 62,13 | 60,53 |
| Лепельская | 17 | 16 | 8 | 1 | 0 | 0 | 1 | 14 | 53,50 | 52,00 |
| Лёзненская | 15 | 15 | 12 | 1 | 0 | 1 | 0 | 13 | 48,25 | 50,00 |
| Мёрская | 20 | 18 | 9 | 1 | 1 | 0 | 1 | 15 | 52,75 | 47,75 |
| Аршанская | 35 | 34 | 13 | 1 | 8 | 2 | 2 | 21 | 155,00 | 153,25 |
| Полацкая | 35 | 35 | 14 | 1 | 6 | 2 | 2 | 24 | 147,50 | 144,50 |
| Пастаўская | 21 | 19 | 7 | 1 | 1 | 2 | 1 | 14 | 55,00 | 52,22 |
| Расонская | 10 | 9 | 6 | 1 | 0 | 0 | 0 | 8 | 29,50 | 27,25 |
| Сенненская | 15 | 15 | 11 | 1 | 0 | 1 | 1 | 12 | 43,50 | 43,50 |
| Талачынская | 17 | 15 | 11 | 1 | 0 | 1 | 1 | 12 | 51,00 | 47,75 |
| Ушацкая | 15 | 9 | 6 | 1 | 0 | 0 | 0 | 8 | 35,60 | 28,85 |
| Чашніцкая | 17 | 16 | 7 | 1 | 1 | 0 | 2 | 12 | 56,50 | 50,50 |
| Шаркаўшчынская | 16 | 14 | 10 | 1 | 0 | 0 | 1 | 12 | 41,12 | 39,88 |
| Шумілінская | 16 | 14 | 8 | 1 | 0 | 2 | 1 | 10 | 44,50 | 42,25 |
| ***Усяго па РЦБС*** | **396** | **368** | **211** | **21** | **18** | **19** | **19** | **291** | **1260,20** | **1213,23** |
| г.Віцебск | 16 | 16 | 0 | 1 | 10 | 0 | 5 | 0 | 148,50 | 148,50 |
| г.Наваполацк | 7 | 7 | 0 | 1 | 4 | 0 | 2 | 0 | 91,50 | 91,50 |
| ***Усяго па ГЦБС*** | **23** | **23** | **0** | **2** | **14** | **0** | **7** | **0** | **240,00** | **240,00** |
| **УСЯГО па ЦБС** | **419** | **391** | **211** | **23** | **32** | **19** | **26** | **291** | **1500,20** | **1453,23** |
| Абласная б-ка | 1 | 1 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 146,00 | 141,50 |
| **УСЯГО** | **420** | **392** | **211** | **23** | **32** | **19** | **26** | **291** | **1646,20** | **1594,73** |
| 2021 год | | -28 | | 23 | 32 | 19 | 27 | 318 | | -51,47 |






**ДУК «Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Бібліяноч-2022



чынам на 01.01.2023 г. нестацыянарным абслугоўваннем ахоплена 723 населеныя пункты. За 2022 год па 200 маршрутах (+5 да мінулага года) было здзейснена 1 522 (+72) выезды.

Колькасныя паказчыкі дзейнасці бібліёбусаў таксама ўзраслі ў параўнанні з мінулым годам. Усяго па вобласці абслужана 6 119 чытачоў (102,4% да 2021 года), колькасць наведванняў дасягнула 32 468 адзінак (105,3%), выдадзена 177 429 дакументаў (107,5%).

Сярод раёнаў, што вылучаюцца высокімі паказчыкамі дзейнасці бібліёбуса, можна адзначыць Бешанковіцкі, Браслаўскі, Гарадоцкі, Дубровенскі, Лепельскі, Аршанскі, Полацкі, Сенненскі, Талачынскі.

Срок эксплуатацыі пераважнай большасці аўтамабіляў перавышае за 10 год (72,2%), што адмоўным чынам адбіваецца на іх тэхнічным стане.

У 2022 годзе бібліятэкі Віцебшчыны прымалі ўдзел у рэалізацыі абласнога праекта па арганізацыі форм работы нестацыянарнага абслугоўвання сельскага насельніцтва ўстаноў культуры клубнага тыпу і бібліятэк «Бібліяаўтаклубны дэсант», прысвечаным Году гістарычнай памяці і Дню народнага адзінства. У рамках праекта супрацоўнікі бібліёбусаў выязжалі па маршрутах разам з клубнымі работнікамі, праводзячы сумесныя мерапрыемствы.

Напярэдадні майскіх святаў супрацоўнікі бібліёбуса Чашніцкай РЦБС сумесна з аўтаклубам правялі ў населеных пунктах Жучкі і Стараселле літаратурна-паэтычную кампазіцыю «Мой квітнеючы май». Канцэртная праграма суправаджалася выставай плакатаў «Свята вясны і працы». 11 мая ў вёсках Новыя Лаўкі, Стражавічы і Багатыр арганізавалі акцыю «Каб не забылася тая вайна». 2 чэрвеня пры абслугоўванні жыхароў вёсак Асавец і Застарынне была арганізавана літаратурна-музычная кампазіцыя «Салют і слава гадавіне навекі памятнага дня», падчас якой дзейнічала выстава «Музей у чамадане». 11 мая ў рамках абласнога праекта супрацоўнікі Лёзненскай цэнтральнай раённай бібліятэкі і сектара нестацыянарнага абслугоўвання насельніцтва Лёзненскага раённага цэнтра культуры для літаратурных меламанаў вёсак Чарнаручча, Баравая і Дуброўка правялі флэшмоб «Чытай у імя міру!» і павіншавалі ўсіх з Днём Перамогі. А 10 мая правялі акцыю «Перамога ў імя тых, хто жыве» для жыхароў аддаленых вёсак Пнёва і Палёнаўка. На працягу года бібліёбусам Сенненскай ЦБС былі праведзены мерапрыемствы сумесна з аўтаклубам Сенненскага РЦКіНТ: канцэртная праграма «Мелодии уходящего лета» (в.Песачанка), канцэртныя праграмы для жыхароў вёсак Пустынкі, Бярозкі, Александрова, Латыгаль, Някрашэва, Пурплева, В. Азярэцк. У рамках праекта ў Браслаўскім раёне праводзіліся выязныя акцыі «Хвілінкі-весялінкі» для жыхароў Мяжанскага і Відзаўскага сельскіх Саветаў. Работа бібліёбуса Лепельскай ЦБС таксама вялася сумесна з супрацоўнікамі аўтаклуба Лепельскага раённага дома культуры. На працягу года прайшлі акцыя «Разам пад мірным небам», канцэртная праграма да Дня Перамогі, адкрыты мікрафон «Чытай у імя міру». Да Дня Перамогі выязныя канцэртныя праграмы ў рамках праекта былі праведзены для жыхароў в. Пугляі, аг. Смальяны Аршанскага раёна.

Адным з этапаў праекта было стварэнне «Франтовога фотаальбома». Работнікі Верхнядзвінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі на працягу доўгага перыяду займаліся зборам і сканіраваннем фотаздымкаў, зробленых у 1940–1946 гадах и маючых дачыненне да Верхнядзвінскага раёна. Дапамагалі ў пошуку і зборы матэрыялу бібліятэкары сельскіх бібліятэк і жыхары раёна. Альбом уключае ў сябе каля 80 унікальных фотаздымкаў, ён размешчаны на сайце бібліятэкі ў раздзеле «Краязнаўства».

Цікавасць у жыхароў глыбінкі выклікаюць выставы, інфармацыйныя старонкі, тэматычныя агляды літаратуры, гадзіны цікавых паведамленняў, гутаркі і іншыя мерапрыемствы. Для карыстальнікаў бібліёбусаў вобласці ў 2022 годзе праводзіліся гутарка «Каб здароўе зберагчы» (Верхнядзвінская ЦБС), гадзіна цікавых парад «Як навучыцца без лекаў лячыца», гадзіна часопісаў «Огородное царство – овощное государство» (Глыбоцкая ЦБС), тэматычная праграма «Памяць жыве» (Докшыцкая ЦБС), літаратурны агляд «Коляда, коляда, отворяй ворота», кніжная дэгустацыя «Жаночыя клопаты» (Полацкая РЦБС) літаратурна-яблычная дэгустацыя «Яблычка простае, смачнае і наліўное» (Шаркаўшчынская ЦБС), гадзіны краязнаўства «Суражанін з сусветным імем – народны лекар № 1», «Дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай» (Віцебская РЦБС) і інш.

Сумеснымі намаганнямі супрацоўнікаў аўтаклубаў і бібліёбусаў праводзіліся святы вёсак (свята вёскі Пруднікі Гарадоцкага раёна «Мой край любімы», вёскі Канапельчыцы Талачынскага раёна «Зямлі маёй мінулы лёс» і інш.).

Нестацыянарнае абслугоўванне ажыццяўлялася ў бібліятэчных пунктах, якія арганізаваны па месцах працы, вучобы, адпачынку чытачоў, у медыцынскіх установах. Іх агульная колькасць зменшылася ў параўнанні з мінулым годам на 12 адзінак і склала 72 пункты. Акрамя таго, супрацоўнікі бібліятэк абслугоўваюць на даму чытачоў пажылога ўзросту і людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

### *Бібліятэчнае абслугоўванне людзей з абмежаванымі магчымасцямі*

Па стане на 01.01.2023 г. сукупны фонд выданняў для інвалідаў з парушэннямі зроку па Віцебскай вобласці склаў 19 031 экз., у т.л. 18 704 экз. агучанай літаратуры. У фонды публічных бібліятэк у 2022 годзе паступіла 927 экз. спецыяльных выданняў, у тым ліку 861 экз. агучанай літаратуры на суму 18 459,81 рублёў. Па падпраграме «Безбар'ернае асяроддзе» ў справаздачным перыядзе набыта 160 экз. агучанай літаратуры на суму 2598,68 рублёў.

У 2022 годзе ў бібліятэках вобласці рэалізаваны шэраг мерапрыемстваў па стварэнню безбар'ернага асяроддзя. Для цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя М.Горкага ЦБС г.Віцебска набыты пад'ёмнік лесвічны гусенічны «Барс УПГ-130». У Докшыцкую цэнтральную раённую






**ДУК «Дубровенская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Бенефіс чытача ў цэнтральнай бібліятэцы




**ДУК «Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Дзіцячая бібліятэка імя Л.Талстога. Цэнтр «Бібліяпазл»



**ДУК «Глыбоцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Адкрыццё выставы Алены Кабылінскай
у рамках арт-праекта «Души и сердца вдохновенье»



**ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска»**
Адкрыццё персанальнай выставы члена Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Аксаны Зорынай «Ажурные фантазии: вытинанка»



бібліятэку набыты маўленчы інфарматар «VERTICAL-3/0,5/IR». Кнопкі выкліку персанала ўстаноўлены ў цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя М.Горкага ЦБС г.Віцебска, гарадской бібліятэцы Дубровенскай ЦБС, Чашніцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы. Шыльды з дубліраваннем візуальнай інфармацыі рэльефна-кропкавым шрыфтам Брайля набыты для цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя М.Горкага ЦБС г.Віцебска, Докшыцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі. У Мёрскую цэнтральную раённую бібліятэку набыты інтэрактыўная панэль Ritter 55, панэль для трансляцыі бягучага радка і лічбавы партатыўны павелічальнік ПЦУ-мыш.

Кантрасная маркіроўка дзвярэй і лесвічных маршаў праведзена ў бібліятэках Дубровенскай ЦБС і ЦБС г.Наваполацка. Каля галоўнага ўваходу ў цэнтральную гарадскую бібліятэку імя М.Горкага паніжаны ўзровень бардзюрнага каменя для арганізацыі беспершкоднага доступу ва ўстанову людзей з інваліднасцю. Налепкі «Жоўты круг» абноўлены ў Аршанскай ЦБС, ЦБС г.Наваполацка і ЦБС г.Віцебска. Сайты ўсіх бібліятэчных сістэм вобласці маюць версіі, адаптаваныя для карыстальнікаў са слабым зрокам.

Дзейнасць бібліятэк вобласці па абслугоўванні неабароненых пластоў насельніцтва ажыццяўляецца ў рамках праграм і праектаў:«Міласэрнасць» (Сенненская ЦБС), «Чалавек сярод людзей» (Пастаўская ЦБС), «Дарога дабра» (ЦБС г. Наваполацка), «Бібліятэка без межаў» (Браслаўская цэнтральная раённая бібліятэка) і інш. У бібліятэцы-філіяле № 21 замежнай літаратуры ЦБС г.Віцебска рэалізуецца сацыяльна арыентаваны праект для людзей з інваліднасцю «Распраў крылы» / «Spread the Wings». Лёзненская раённая бібліятэка сумесна з раённай арганізацыяй рэспубліканскага грамадскага аб’яднання «Беларускае таварыства інвалідаў» працуе па праекце «Бібліятэка без бар’ераў».

У бібліятэках Віцебскай вобласці дзейнічае больш за 40 клубаў і аматарскіх аб’яднанняў, якія забяспечваюць вольны час пажылых людзей і людзей з абмежаванымі магчымасцямі: «Добрыя сустрэчы» (Лепельская цэнтральная раённая бібліятэка), «Аранжавы настрой» (бібліятэка імя К.Сіманава ЦБС г.Наваполацка), «Парус» (Бешанковіцкая цэнтральная раённая бібліятэка) і інш.

У рабоце па арганізацыі абслугоўвання сацыяльна неабароненых катэгорый карыстальнікаў бібліятэкі ў справаздачным перыядзе ўзаемадзейнічалі з установамі сацыяльнай абароны насельніцтва, карэкцыйнымі адукацыйнымі ўстановамі, медыцынскімі ўстановамі, грамадскімі арганізацыямі. У рамках абласнога спартыўна-культурнага фестывалю «Летнія гульні моцных духам» Кіраўская бібліятэка Віцебскай РЦБС падрыхтавала кніжна-інфармацыйную выставу «Паралімпіяды», сумесна з БРСМ правяла акцыю «Добрае сэрца» і экскурсію па выставе «Прыгажосць роднага краю» Л.М.Мяржвінскага.

У ліпені супрацоўнікі Лёзненскай цэнтральнай раённай бібліятэкі сумесна з ДУ «ТЦСАН Лёзненскага раёна» правялі творчую сустрэчу з выканаўцам рамансаў Уладам Якубавым, інвалідам дзяцінства. Наведвальнікі аддзяленняў дзённага знаходжання ТЦСАН г.Віцебска

рэгулярна запрашаюцца на мерапрыемствы, якія праводзяцца бібліятэкамі ЦБС г.Віцебска. У верасні бібліятэкары Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі сумесна з супрацоўнікамі ДУА «ТЦСАН Гарадоцкага раёна» і ДУК «Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна» правялі літаратурна-музычную сустрэчу «Адзіным духам мы моцныя» ў спецыяльным доме для пражывання ветэранаў, састарэлых.

Асобая ўвага надаецца працы з дзецьмі. Сенненская дзіцячая раённая бібліятэка ў рамках праграмы «Міласэрнасць» запрашала дзяцей-інвалідаў Цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі на лялечныя спектаклі народнага тэатра кнігі «Пятрушка» «Чысцюля Калабок», «Прырода – гэта мы» і інш. У бібліятэцы імя К.Сіманава ЦБС г.Наваполацка маладыя людзі з асаблівасцямі развіцця-члены бібліятэрапеўтычнага клуба «Аранжавы настрой» прынялі ўдзел у конкурсе мастацкага чытання «Лета – гэта маленькае жыццё» і комплекснага мерапрыемства «Шкодныя звычкі і як з імі змагацца».

У бібліятэцы-філіяле № 12 Аршанскай ЦБС, для абслугоўвання карыстальнікаў-інвалідаў па зроку выкарыстоўваецца радыёвузел Аршанскага філіяла УП «Элект», на базе якога яна размешчана. За 2022 год па радыёвузле прадпрыемства было агучана больш за 30 кніг, праходзілі радыёперадачы, радыёлекцыі «ВІЧ/ СНІД – што трэба ведаць ці крыху неабходнай гісторыі», «Як правільна прымаць лекавыя прэпараты» і інш.

У 2022 годзе працягнулася дзейнасць бібліятэк па абслугоўванні пажылых людзей і інвалідаў па месцы пражывання. Гарадоцкая цэнтральная раённая бібліятэка дзейнічала па праграме «Кнігу ў кожную вёску» у рамках работы бібліёбуса. Штомесяц праходзяць акцыі па абмене кнігамі і перыядычнымі выданнямі надомна ў Лёзненскай ЦБС: «Кнігі ідуць у госці» (Чкалаўская гарпасялковая бібліятэка), «Кніга ў кожны дом» (Бабінавіцкая сельская бібліятэка-музей).





**ДУК «Лепельская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Экскурсія ў храм св. мучаніка Георгія Пабеданосца (Лепель)



**ДУК «Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Духоўная сустэча ў бібліятэцы імя Я.Купалы «Под сенью духовности»



**ДУК «Сенненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Паэтычны марафон «Пульсирует память в стихах о войне»




**ДУК «Сенненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Дзень памяці і смутку ў мемарыяльным комплексе «Купавац»



# САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ. ФОТАФАКТ




**ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна»**
Цырымонія афіцыйнага гашэння, прысвечаная выпуску ў абарачэнне паштовага праекта «1030-годдзе Праваслаўя на беларускіх землях»




**ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна»**
Удзельнікі абласнога Форуму маладых работнікаў культуры «Сучасная культура: новыя выклікі – новыя вяршыні»




**ДУК «Сенненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Тэматычная бібліятэчная пляцоўка да 580-годдзя г.Сянно




**ДУК «Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр**
**і сетка публічных бібліятэк»**
Дні Віцебскай вобласці ў Пскове.
Прэзентацыя пляцоўкі «Гарадоцкі Парнас»






**ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Гадзіна мужнасці і славы «Мы вспомним всех вас поименно»




**ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
Творчая сустрэча з пісьменнікамі Галінай і Сяргеем Трафімавымі